МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

# БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі

Мінск, 6 красавіка 2018 г.

Выпуск 17

Мінск МДЛУ
2019

УДК 947.6
ББК 63.3(4 Беи) + 63.3(4 Гем)
Б43

Р э к а м е н д а в а н ы Рэдакцыйным саветам Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Пратакол № 03 ад 25.06.2018 г.

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я : А. А. Каваленя (*адказны рэдактар*), С. Я. Новікаў (*намеснік адказнага рэдактара*), Э. Р. Іофе, У. К. Коршук, А. М. Літвін, А. В. Шаркоў

Р э ц э н з е н т ы : доктар гістарычных навук, прафесар *В. М. Фамін* (БДПУ імя М. Танка); кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар* (Беларускі НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы)

Канферэнцыя праведзена ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя), а таксама Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя).

Падпраграма № 1 «Гісторыя і культура».

Б43 **Беларусь** і Германія : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2018 г. Вып. 17 / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2019. – 272 с.

ISBN 978-985-460-903-4.

У выданні змешчаны матэрыялы выступленняў, у якіх аўтары на аснове дакументальных і гістарыяграфічных крыніц асвятляюць асобныя старонкі гістарычнага мінулага і сучаснасці Беларусі і Германіі.

Адрасаваны навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларуска-германскіх адносін.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4 Беи) + 63.3(4 Гем)**

**ISBN 978-985-460-903-4**

© УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», 2019

# ПРИВЕТСТВЕННОЕ СЛОВО ПРОРЕКТОРА МГЛУ ПО НАУЧНОЙ РАБОТЕ ПРОФЕССОРА Л. А. ТАРАСЕВИЧ

Уважаемые гости и участники конференции, дорогие коллеги и друзья!

Разрешите от имени главы оргкомитета конференции – ректора университета Н. П. Барановой – приветствовать Вас на 17-й научной конференции «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», посвященной 70-летию нашего университета, которое мы отмечаем в этом году. На протяжении вот уже 17 лет ученые из разных стран встречаются и обсуждают на первый взгляд узкую проблему: отношения двух стран, однако насколько глубоки, разнообразны и животрепещущи рассматриваемые вопросы.

Много непростых задач оставила нам история, и в первую очередь связанных с величайшей трагедией XX века – Второй мировой войной, в центре которой не по своей воле оказалась и Беларусь. Ваша сегодняшняя дискуссия посвящена событиям той войны, которые раскрываются сквозь призму судеб отдельных людей, в том числе детей, и это наполняет ее особым смыслом.

Война исковеркала, изуродовала жизни людей не только в нашей стране. Как можно говорить об истории отношений Беларуси и Германии, не приглашая к этому серьезному научному разговору наших соседей – Россию, Польшу, страны Балтии. Представители этих государств, как и наши уважаемые немецкие коллеги, присутствуют сегодня здесь с очень интересными и острыми докладами о совместном прошлом и, что очень важно, о совместном будущем наших стран.

О высоком научном статусе данной конференции свидетельствует то, что она проводится в соответствии с Государственной комплексной программой научных исследований на 2016–2020 гг. «История, культура, общество и государство».

Беларусь, народ которой понес чудовищные потери во время Второй мировой войны, умеет ценить мир и прилагает все возможные усилия для мирного разрешения споров. Совсем не случайно эта конференция проходит на базе Центра белорусского языка и культуры, созданного в МГЛУ. Замечательный американский лингвист Бенджамин Ли Уорф сказал, что если где-то люди приходят к согласию, то это происходит при помощи языка либо не происходит вообще. Результаты этой конференции востребованы теми, кто использует для решения проблем коммуникацию, а значит, всеми мыслящими людьми. Ее роль нельзя переоценить в деле образования и воспитания молодежи, а также подготовки специалистов в области иностранных языков.

Дорогие друзья! Разрешите объявить 17-ю Международную научную конференцию «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» открытой.

# ЛЮДЗІ – ПАДЗЕІ – ФАКТЫ: НОВЫЯ ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ І ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ПАДЫХОДЫ

**С. Я. Новікаў**

## ЗА КАРОТКІМ РАДКОМ ВАЕННАЙ БІЯГРАФІІ МІНСКІХ ІНЯЗАЎЦАЎ
(да 70-годдзя Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта)

Назва нашага даследавання не даніна модзе, а даніна памяці тым, хто праслаўляў Alma Mater у мірны час, але да таго моманту са зброяй у руках змагаўся на франтах вайны, здабываў перамогу ў ліку партызан і падпольшчыкаў на акупаванай Беларусі і далёка па-за яе межамі. Казаць сёння ў такім ракурсе пра мінскіх інязаўцаў – вялікі гонар, адказная задача і пачэсная справа для іх нашчадкаў. Асабіста мне пашчасціла не толькі чуць імёны, але і ведаць, прычым быць знаёмым і разам працаваць з некаторымі з іх – сціплымі Педагогамі, Настаўнікамі, Інтэлігентамі і ў той жа час – смелымі, рашучымі і самаадданымі абаронцамі Радзімы.

Крыніц для грунтоўнага гістарычнага даследавання гэтай тэмы не так шмат. П е р ш а я з іх – асабісты лісток па ўліку кадраў былых інязаўцаў. Аднак у ім пра баявое мінулае часам згадана толькі ў адным кароткім радку, змест якога не ўтрымлівае падрабязных звестак аб месцы правядзення баявых аперацый, іх маштабах і выніках. Д р у г о й важнай крыніцай з’яўляюцца дакументы, выяўленыя ў архіўных установах, у тым ліку сярод фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У якасці т р э ц я й групы выкарыстаны Інтэрнэт-рэсурсы. Дзякуючы нават гэтым нешматлікім крыніцам у аўтара гэтых радкоў з’явілася хоць нейкая магчымасць звярнуцца да вельмі значнай старонкі гісторыі Мінскага іняза, паспрабаваць уявіць партрэты тых студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, хто назаўсёды ўпісаў у свае жыццёвыя біяграфіі Вялікую Айчынную вайну.

Дакументы сведчаць, што першыя студэнцкія наборы фарміраваліся галоўным чынам з ліку былых удзельнікаў вайны, хто быў прызваны непасрэдна ў шэрагі Чырвонай арміі ці ўліўся ў сілы мясцовага супраціву ворагу, а таксама тых, хто быў вымушаны застацца на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Так, праз 6 гадоў пасля заканчэння вайны (па стане на 1 студзеня 1951 г., г.зн. у сярэдзіне 1950/51 навучальнага года) на трох факультэтах інстытута навучаліся 514 студэнтаў. 29 з іх служылі ў Савецкай арміі і ўдзельнічалі ў партызанскай барацьбе, 261 чалавек застаўся на акупаванай тэрыторыі, тады як толькі 224 студэнты знаходзіліся ў савецкім тыле ці былі эвакуіраваны на ўсход летам 1941 г. Гэта значыць, што лёсы большасці першых студэнтаў Мінскага іняза былі апаленыя полымем Вялікай Айчыннай вайны [1, арк. 24].

Як вынікае з гэтага ж дакумента, баявымі ўзнагародамі былі адзначаны 45 студэнтаў (крыху менш чым кожны дзясяты), у тым ліку 4 з іх мелі

ордэны і 41 – медалі. Адразу ж узнікаюць пытанні: ці адлюстраваны гэтыя старонкі гісторыі на факультэтах, ці існуе летапіс баявой славы мінскіх інязаўцаў, ці ганарацца імі нашы сучаснікі? Інакш кажучы, ці добра ведаем мы пакаленне тых, хто выжыў у жахлівых умовах вайны і здолеў падараваць нашчадкам жыццё.

Па аб’ектыўных прычынах у фокус прапанаванага даследчага пошуку трапілі толькі некаторыя з удзельнікаў ваенных падзей, каго жыццёвы шлях, вучоба ці праца прывялі ў Мінскі іняз – цяперашні МДЛУ.

Адразу ж заўважым, што выяўляецца агульны партрэт удзельніка вайны, хто паказваў прыклады мужнасці, гераізму і самаадданасці, прайшоў дарогамі вайны на Бранскім, Заходнім, Ленінградскім, Сталінградскім, Цэнтральным, Паўночна-Заходнім, 1-м, 2-м, 3-м Беларускіх, 2-м Прыбалтыйскім, 4-м Украінскім франтах, камандаваў баявымі падраздзяленнямі, са зброяй у руках штурмаваў умацаванні ворага, абараняў Маскву, Ленінград і Сталінград, вызваляў Віцебск, Вільнюс і Каўнас, браў Варшаву і Берлін, а таксама змагаўся са зброяй у руках на акупаванай тэрыторыі і г.д.

Сярод фактычных абаронцаў Айчыны – будучыя студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі Мінскага іняза. У ліку першых, хто ў чэрвені 1941 г. стаў на абарону Радзімы, былі франтавікі – Сямён Васільевіч **Буракоўскі**, Якаў Мендзелевіч **Воўшын**, Аляксандр Дзмітрыевіч **Калеснікаў**, Леў Глебавіч **Кандзялінскі**, Павел Ільіч **Копанеў**, Павел Яфімавіч **Мурашка**, Людміла Аляксандраўна **Сухарава**, Мікалай Мікалаевіч **Сяржанін**, Расціслаў Цімафеевіч **Шлопак**, а таксама беларускія партызаны і падпольшчыкі – Марыя Вікенцьеўна **Данейка**, Віктар Казіміравіч **Дашкевіч,** Мікалай Данілавіч **Лапцёнак**, Уладзімір Іванавіч **Казлоўскі**, Анатоль Іванавіч **Кісялеўскі,** Ірына Сцяпанаўна **Маркоўская**, Рыгор Рыгоравіч **Навіцкі**, Адам Вікенцьевіч **Шыдлоўскі** і Маісей Саламонавіч **Штэйнгольц.**

Па-рознаму складваўся баявы лёс кожнага з іх, аднак усе яны ўнеслі канкрэтны ўклад у агульную перамогу над ворагам – германскімі акупантамі, якія летам 1941 г. абрынуліся вайной на заходні рубеж Краіны Саветаў.

Былыя партызаны – М. В. Данейка, І. С. Маркоўская, А. В. Шыдлоўскі, а таксама байцы Чырвонай арміі Я. М. Воўшын і Л. Г. Кандзялінскі з 1 верасня 1948 г. з’яўляліся студэнтамі першага набору новай самастойнай вышэйшай моўнай установы – Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (МДПІЗМ). Нагадаем, што паводле правілаў прыёму, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны залічваліся без уступных экзаменаў па меры падачы заяў.

Д а н е й к а М. В. (народжаная ў 1925 г. у сям’і сялян у в. Крыніцы Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці) пачала баявы шлях у партызанскім атрадзе «Камунар», створаным у маі 1942 г. у Смалявіцкім раёне з былых савецкіх ваеннаслужачых, якія ў ходзе вядзення баёў Чырвонай арміяй летам 1941 г. не выйшлі з акружэння, і мясцовых вясковых жыхароў. Да канца жніўня ён дзейнічаў самастойна, потым увайшоў асобным атрадам у склад брыгады «Дзядзькі Колі» Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Адзначым, што да пачатку вайны Марыя скончыла сямігодку ў Смалявічах і паступіла

ў педагагічнае вучылішча імя Крупскай у Мінску, якую паспела закончыць якраз напярэдадні вайны. Аднак спачатку працавала разам з бацькам у сельскай гаспадарцы у в. Крынка. Як сведчаць дакументы, калі пачаў фарміравацца атрад «Камунар», Марыя атрымлівала даручэнні ад партызан і па май 1943 г. з’яўлялася партызанскай сувязной. Апроч таго, вяла агентурную работу (па заданні асобнага аддзела пераносіла зброю, міны, патроны, распаўсюджвала лістоўкі, назірала за рухам нямецкіх войскаў па чыгунцы і шашы, падтрымлівала сувязь з паліцэйскімі і немцамі, якія працавалі па заданні асобнага аддзела. У цэнтры агітацыйнай работы стаяла задача па вярбоўцы служачых славацкіх падраздзяленняў, якія служылі на баку германскіх акупантаў, з мэтай далейшага супрацоўніцтва і нават іх пераходу на савецкі бок. Паводле дакументаў, летам 1943 г. у партызанскую брыгаду «Дзядзькі Колі» перайшоў цэлы ўзвод славацкіх салдат (33 чалавекі) разам з камандзірам, узбраеннем і веласіпедамі [2, арк. 19]. Гэта пацвярджаюць спісы асабовага складу 2-га і 4-га атрадаў брыгады, паводле якіх у жніўні 1943 г. яе шэрагі папоўніліся славакамі [3, арк. 66, 111–112]. Вялікая заслуга ў паспяховым правядзенні гэтай аперацыі належыць якраз сувязной-разведчыцы Марыі Данейка.

Аднак у снежні 1943 г. у выніку здрады дзейнасць сувязной была раскрытая. Ёй пагражаў арышт, якога ўдалося пазбегчы. 24 чэрвеня 1944 г. у час аднаго з баёў з адыходзячымі нямецкімі падраздзяленнямі ў раёне возера Палік атрымала кулявое раненне ў каленны сустаў і правае плячо. Узнагароджана медалямі «Партызану Айчыннай вайны I ступені», «За адвагу» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [2, арк. 20].

Пасля лячэння ў шпіталях у Арле, Іркуцку і Барысаве з 1 верасня 1945 г. працавала настаўніцай Мала-Залужскай пачатковай школы Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці, у 1946 г. паступіла на факультэт замежных моў МДПІ імя Горкага, а ў 1948 г. стала студэнткай 3 курса факультэта англійскай мовы Мінскага іняза, які паспяхова скончыла ў 1950 г. Пасля гэтага працавала на гэтым жа факультэце ў якасці выкладчыка лексікі і граматыкі англійскай мовы [2, арк. 5–7].

У ліку студэнтаў, хто ў 1948 г. разам з былой сувязной-разведчыцай Марыяй Данейка паспяхова паступіў на англійскі факультэт, таксама былі былыя беларускія партызаны Ірына Маркоўская і Адам Шыдлоўскі.

М а р к о ў с к а я І. С. нарадзілася ў 1924 г. у сям’і служачых у Мінску. За часам вайны разам з бацькам знаходзілася ў вёсцы Слабада Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці [4, арк. 2]. Да пачатку вайны скончыла 9 класаў і мастацкую студыю ў Пухавічах, дзе пачала працаваць настаўніцай малявання ў пачатковых класах [5, арк. 4]. Сфарміраваны ў красавіку 1942 г. у Чэрвеньскім раёне з мясцовых камуністаў і камсамольцаў партызанскі атрад імя газеты «Праўда» спачатку дзейнічаў самастойна, а з кастрычніка 1942 па лістапад 1943 г. – у складзе 1-й Мінскай брыгады на чале з камандзірам атрада П. І. Іваненка. Практычна з моманту яго фарміравання па лістапад 1942 г. Маркоўская была сувязной атрада, які на той час дзейнічаў на тэрыторыі Пухавіцкага раёна.

З 12 снежня 1942 па 1 лютага 1943 г. з’яўлялася радавой атрада імя Ф. Ф. Юрчанкі, які да верасня 1942 г. быў перадыслакаваны з Барысаўска-Бягомльскай зоны ў Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці. Да канца вайны заставалася радавой 1-й Мінскай брыгады. Паводле баявой характарыстыкі, усе загады выконвала ў карткі тэрмін, не лічылася з цяжкімі ўмовамі і складанай абстаноўкай. Дастаўляла партызанам медыкаменты, зброю, распаўсюджвала лістоўкі, зводкі Савінфармбюро, а таксама забяспечвала сувязь партызан з мясцовай моладдзю. Дапамагала вывесці да партызан з мястэчка Пухавічы 15 чалавек моладзі. Неаднаразова ўдзельнічала ў баявых аперацыях брыгады. Была ўзнагароджана медалямі «Партызану Айчыннай вайны I ступені» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».

Да паступлення ў Мінскі іняз працавала мастаком у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь». Адначасова займалася ў БДУ імя Леніна на факультэце журналістыкі, у 1947–1948 гг. навучалася ў Мінскім мастацкім вучылішчы [4, арк. 3–5].

Ш ы д л о ў с к і А. В. нарадзіўся ў 1925 г. у в. Дашкі Заслаўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям’і. На момант пачатку вайны працаваў з бацькамі ў сельскай гаспадарцы. Афіцыйна быў залічаны ў брыгаду імя Фрунзе 22 лістапада 1943 г. у якасці радавога партызанскага атрада «Чырвонае Знамя», створанага ў сакавіку 1942 г. Як сведчаць дакументы, будучы сувязным, атрымліваў заданні ад партызан яшчэ задоўга да ўступлення ў атрад. У баявой характарыстыцы адзначаецца, што, працуючы пры падпольным Радашковіцкім РК ЛКСМБ, ён займаўся распаўсюджваннем палітычнай літаратуры і лістовак сярод мясцовага насельніцтва і ў нямецкіх гарнізонах раёна, паказаў сябе смелым і дысцыплінаваным [6, арк. 299].

У ліку першых студэнтаў інстытута таксама значыліся былыя чырвонаармейцы Я. М. Воўшын і Л. Г. Кандзялінскі

В о ў ш ы н Я. М. нарадзіўся ў 1924 г. у сям’і служачых (г. Орша Віцебскай вобласці) [7]. У жніўні 1942 г. быў прызваны ў рады Чырвонай арміі і залічаны курсантам у 2-е Маскоўскае пяхотнае вучылішча, якое не скончыў па прычыне адпраўкі на Заходні фронт [7, арк. 9]. Са студзеня па верасень 1943 г. служыў наводчыкам станковага кулямёта ў 101-й асобнай стралковай брыгадзе, якая разам з іншымі вайсковымі часцямі Чырвонай арміі павінна была забяспечыць выкананне важнай аператыўна-стратэгічнай задачы, пастаўленай Стаўкай Вярхоўнага Камандавання ў сувязі з падрыхтоўкай баявых аперацый на Аршанска-Віцебскім напрамку. У верасні 1943 г. у час аднаго з лакальных з баёў пад г. Сураж атрымаў цяжкае раненне ў правае плячо, пасля чаго па сакавік 1944 г. праходзіў лячэнне. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [7, 3 адв.].

З верасня 1946 па верасень 1948 г. – студэнт Ленінградскага інстытута кінаінжынераў, з верасня 1948 па жнівень 1952 г. – студэнт МДПІЗМ. Пасля яго заканчэння працаваў больш за 50 гадоў у гэтай установе вышэйшай адукацыі на розных выкладчыцкіх пасадах.

25-гадовым юнаком паступіў у Мінскі іняз у 1948 г. К а н д з я л і н с к і Л. Г. (нарадзіўся ў сям'і служачых у Смаленску) [8, арк. 3]. Яго студэнцкая біяграфія пачалася ў 1941 г. пасля паступлення на факультэт будаўніцтва мастоў і танэляў Новасібірскага інстытута ваенных інжынераў чыгуначнага транспарту. У чэрвені 1942 г. добраахвотна ўступае ў Чырвоную армію і адразу трапляе на Сталінградскі фронт, дзе па студзень 1943 г. служыў у 992-м стралковым палку 212-й стралковай дывізіі, удзельнічае ў абароне горада на Волзе. Быў паранены 25 кастрычніка 1942 г. Пасля лячэння з сакавіка па чэрвень 1943 г. у якасці выкладчыка працуе ў г. Новая Ліля Свярдлоўскай вобласці. З чэрвеня 1943 – на Ленінградскім фронце, дзе па чэрвень 1944 г. праходзіў службу ў 108-м пагранічным палку. Закончыў службу ў чэрвені 1945 г. у 88-м пагранічным атрадзе ва Украіне [8, арк. 3 адв.]. Узнагароджаны медалямі «За абарону Ленінграда», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».

Пасля заканчэння факультэта англійскай мовы Л. Г. Кандзялінскі навучаўся на матэматычным факультэце БДУ імя Леніна ў Мінску. З снежня 1961 г. працаваў выкладчыкам кафедры граматыкі і гісторыі англійскай мовы [8, арк. 11].

Сярод першых выкладчыкаў Мінскага іняза, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў дарогамі цяжкіх выпрабаванняў, можна назваць як воінаў Чырвонай арміі, так і былых партызанаў і падпольшчыкаў. У першым выпадку – С. В. Буракоўскага, А. Дз. Калеснікава, П. І. Копанева, П. Я. Мурашка, Л. А. Сухараву, М. М. Сяржаніна, Р. Ц. Шлопака; у другім – В. К. Дашкевіча, М. Д. Лапцёнка, У. І. Казлоўскага, Р. Р. Навіцкага.

Б у р а к о ў с к і С. В. нарадзіўся ў сям'і сялян у 1904 г. у Клічаўскім раёне Бабруйскай акругі. У кастрычніку 1926 г. у якасці чырвонаармейца быў прызваны на службу ў 27-ы артылерыйскі полк 27-й стралковай дывізіі ў г. Віцебск. Пасля службы – студэнт Бабруйскага рабфака, дырэктар Бабруйскага педагагічнага тэхнікума. З 1934 па 1938 г. навучаўся на гістарычным факультэце педінстытута імя М. Горкага, потым на працягу года выкладаў у Барысаўскім педагагічным тэхнікуме. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР – інструктар палітаддзела 36-й кавалерыйскай дывізіі ў г. Ваўкавыск. У апошні перадваенны год працаваў у якасці старшага выкладчыка гісторыі УКП(б) у Барысаўскім танкавым вучылішчы, якое на рацэ Бярэзіна ў раёне г. Барысава арганізавала абарону пад кіраўніцтвам начальніка вучылішча карпуснога камісара І. З. Сусайкава. Сярод абаронцаў гэтага рубяжа знаходзіўся і палітрук С.В. Буракоўскі [9, арк. 3 адв.].

Пасля адступлення быў адпраўлены ў г. Саратаў. Там працаваў начальнікам сацыяльна-эканамічнага цыклу, потым выконваў абавязкі ваенкама 458-га артылерыйскага палка Паўночна-Заходняга фронту. З лістапада 1942 па ліпень 1943 г. – намеснік начальніка палітаддзела і сакратар парткамісіі 74-й артылерыйскай брыгады, 27-й артылерыйскай дывізіі 2-га Прыбалтыйскага фронту. Скончыў вайну ў званні маёра. Узнагароджаны за баявыя заслугі ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны І ступені, а таксама медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [9, арк. 3 адв.].

Пасля заканчэння вайны працаваў дырэктарам Бабруйскага настаўніцкага інстытута, загадваў кафедрай марксізму-ленінізму. З верасня 1954 г. у сувязі з яго ліквідацыяй пераведзены на пасаду старшага выкладчыка кафедры марсксізму-ленінізму Мінскага іняза [9, арк. 2 адв.]. У лютым 1955 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Барацьба Камуністычнай партыні Савецкага Саюза за ўмацаванне саюза рабочага класа і сялянства ў перыяд пераходу на мірную работу (1921–пачатак 1922 гг.)» [9, арк. 16].

К а л е с н і к а ў А. Дз. нарадзіўся ў 1922 г. у г. Курск. У верасні 1939 г. паступіў на гістарычны факультэт Курскага педінстытута, дзе навучаўся да прызыву ў Чырвоную армію. З верасня 1941 г. праходзіў службу ў г. Свярдлоўск, дзе якраз адбывалася фарміраванне новага складу 88-й стралковай дывізіі, якая з лістапада 1941 г. адразу ж была адпраўлена на фронт для ўдзелу ў абароне Масквы [10, арк. 4]. Там яна вяла ўпартыя баі з вайсковымі часцямі групы армій «Цэнтр» у ходзе яе восеньскай наступальнай аперацыі «Тайфун». У далейшым служыў у дзеючай арміі на Заходнім фронце, з лістапада 1942 г. па чэрвень 1945 г. – камсорг батальёна 88-га стралковага палка на 1-м Беларускім, 4-м Украінскім франтах [10, арк. 2 адв.]. Завяршыў вайну ў Румыніі ў званні маёра. Узнагароджаны медалямі «За абарону Масквы», «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [10, арк. 3 адв.]. З 1 верасня 1967 г. працаваў выкладчыкам гісторыі КПСС на факультэтах французскай і іспанскай моў МДПІЗМ [10, арк. 9].

К о п а н е ў П. І. нарадзіўся ў 1922 г. у г. Слабадскі Кіраўскай вобласці [11, арк. 1]. З верасня 1939 па ліпень 1942 г. навучаўся на факультэце замежных моў Кіраўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, адкуль быў прызваны на службу ў Чырвоную армію. Са жніўня па лістапад 1942 г. служыў радавым, быў залічаны ў разведку 211-й асобнай мотаразведроты Сталінградскага фронту. Потым да канца лета 1943 г. з'яўляўся ваенным перакладчыкам палка на Сталінградскім і Бранскім франтах. Са жніўня 1943 г. па верасень 1945 г. – ваенны перакладчык дывізіі на 1-м Беларускім фронце. Быў ўзнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі (1944, 1945) і 4 медалямі, у тым ліку «За абарону Сталінграда 1942–1943 гг.», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» і падзякамі [11, арк. 3 адв.].

З верасня 1945 па ліпень 1949 г. – студэнт філалагічнага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе атрымаў кваліфікацыю літаратара-германіста. Пасля яго заканчэння да жніўня 1955 г. працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам і загадчыкам кафедры нямецкай мовы Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, выкладаў нямецкую мову і зарубежную літаратуру. З верасня 1955 па ліпень 1959 г. – старшы выкладчык і загадчык кафедры нямецкай мовы Варонежскага дзяржпедінстытута. З 3 ліпеня 1961 г. пачаў працу ў МДПІЗМ адразу на пасадзе старшага выкладчыка, а потым загадчыка кафедры граматыкі і гісторыі нямецкай мовы [11, арк. 2, 2 адв.].

М у р а ш к а П. Я. нарадзіўся ў 1920 г. у вёсцы Гродна Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. З верасня 1936 па чэрвень 1939 г. навучаўся ў педагагічным вучылішчы ў Барысаве. Пасля яго заканчэння да прызыву ў Чырвоную армію ў лістападзе 1939 г. працаваў настаўнікам пачатковых класаў у Бранісла́ўскай пачатковай школе ў Жыткавіцкім раёне Палескай вобласці. Па чэрвень 1941 г. – курсант палкавой школы, камандзір аддзялення і памочнік камандзіра ўзвода 747-га стралковага палка 172-й стралковай дывізіі*, якая дыслацыравалася ў г. Сталінагорск (цяпер – Новамаскоўск). З ліпеня 1941 г. па верасень 1941 г. – старшына роты, старшы пісар 935-га стралковага батальёна ў г. Яфрэмаў. На працягу месяца быў курсантам пяхотнага вучылішча ў г. Яраслаўль. Пасля яго заканчэння па жнівень 1942 г. камандаваў узводам 1111-га стралковага палка 330-й стралковай дывізіі, якая вяла баявыя дзеянні на Заходнім фронце. Са жніўня 1942 па май 1944 г. – старшы ад'ютант штаба гэтага ж батальёна, прымаў удзел у баях на Заходнім і 2-м Беларускім франтах. З мая 1944 па чэрвень 1945 г. – 1-ы памочнік начальніка штаба 1111-га стралковага палка 330-й стралковай дывізіі на 2-м Беларускім фронце. Вайну завяршыў у Германіі ў званні маёра [12, с. 1 адв.]. Узнагароджаны ордэнамі: Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, а таксама 4 медалямі, у тым ліку «За абарону Масквы», «За вызваленне Варшавы», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне» і «За безадказную службу II ступені» [12, с. 1 адв.].

Свой першы баявы ордэн – ордэн Чырвонага Сцяга – Павел Яфімавіч атрымаў за доблесць пры фарсіраванні ракі Проня, што пад Чавусамі. Полк імкнуўся выбіць немцаў з супрацьлеглага берага. Арганізаваўшы пераправу на падручных сродках, салдаты заляглі, не адважваліся працягваць наступленне. Павел Яфімавіч уласным прыкладам падняў байцоў і павёў у атаку.

У ходзе аперацыі «Баграціён» Павел Яфімавіч удзельнічаў у вызваленні Магілёва і Магілёўскай вобласці. За паспяховае выкананне баявых задач і арганізацыю пераправы батальёна цераз раку Днепр ён быў узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені. Пазней атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі за актыўны ўдзел у баях на рацэ Одры. У сакавіцкую ноч 1945 г. нечакана на полк напала адыходзячая нямецкая пяхота. Першым, хто выявіў пагрозу, быў намеснік начальніка штаба Павел Мурашка. Ён жа аператыўна арганізаваў паспяховы адпор ворагу, за што быў адзначаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені [13].

С у х а р а в а Л. А. нарадзілася ў 1923 г. у г. Уладзівасток. У Чырвонай арміі служыла з 1941 па 1954 г. [14, арк. 68 адв.]. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны (разведчыца, перакладчык). Ваявала на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах [14, арк. 85]. Старшы лейтэнант запасу. Узнагароджана двума медалямі: «За баявыя заслугі» і «За перамогу

---

* Размова ідзе пра легендарную 172-ю стралковую дывізію, якая ў ліпені 1941 г. пад камандаваннем генерал-маёра М. Ц. Раманава ўпарта абараняла Дняпроўскі рубеж у раёне г. Магілёва.

над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.». З 1945 па 1951 г. – слухач ваеннага інстытута замежных моў Савецкай арміі. З 1955 г. працавала старшым выкладчыкам кафедры лексікалогіі факультэта нямецкай мовы МДПІЗМ. 5.10.1973 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР».

С я р ж а н і н М. М. нарадзіўся ў 1917 г. у сялянскай сям'і ў м. Любань Мінскай вобласці [15, арк. 3; 29; 66]. Пасля заканчэння 7 класаў працягваў навучанне ў Барысаве, потым у г. Бежыца скончыў рабочы факультэт. У 1940 г. – выпускнік Маскоўскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту (спецыяльнасць «інжынер-эканаміст»). З кастрычніка 1940 па люты 1941 г. служыў радавым 8-га чыгуначнага палка на ст. Шылка, з лютага да чэрвеня 1941 г. прайшоў курс малодшых афіцэраў у Іркуцку, потым служыў у рэдакцыях газет 97-й і 83-й Гвардзейскіх стралковых дывізій, 10-й артылерыйскай дывізіі на Заходнім. Бранскім, 1-м і 3-м Беларускіх франтах. Узнагароджаны трыма ордэнамі – Айчыннай вайны ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, польскім Залатым крыжом за заслугі, а таксама 8 медалямі за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне [15, арк. 3 адв.].

Пасля вайны скончыў Ваенны інстытут. З лістапада 1962 г. працаваў у Мінскім інязе на кафедры філасофіі і палітэканоміі, дзе пасля знаходжання ў гадавой аспірантуры падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Чыгуначны транспарт Польскай Народнай рэспублікі: эканамічна-геаграфічны агляд», якую паспяхова абараніў у 1969 г. [15, арк. 40].

Ш л о п а к Р. Ц. нарадзіўся ў 1920 г. у вёсцы Караваева Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і сялян. Ваенная біяграфія пачалася ў кастрычніку 1939 г., калі ён стаў курсантам палкавой школы ў г. Фергана. У ліпені 1941 г. скончыў яе і служыў камандзірам аддзялення 13-га асобнага эскадрона сувязі 21-й горна-кавалерыйскай дывізіі. З ліпеня па жнівень 1941 г. займаўся на курсах малодшых лейтэнантаў 16-га палка сувязі Сярэдне-Азіяцкай ваеннай акругі. Са жніўня 1941 па снежань 1942 г. – намеснік камандзіра, камандзір штабной роты 87-га асобнага батальёна сувязі 87-й асобнай Туркменскай брыгады, якая дзейнічала ў Маскоўскай зоне абароны Паўночна-Заходняга фронту. З красавіка па ліпень 1943 г. Расціслаў Цімафеевіч ваяваў на Заходнім фронце, быў намеснікам камандзіра батальёна, з ліпеня па верасень знаходзіўся ў рэзерве афіцэрскага складу 21-й арміі Заходняга фронту. З верасня 1943 па ліпень 1944 г. быў начальнікам сувязі 226-га стралковага Віцебскага палка 63-й стралковай Віцебскай дывізіі 3-га Беларускага фронту [16, арк. 1 адв.]. У арміі прайшоў шлях ад радавога салдата да капітана, начальніка сувязі стралковага палка. У ліпені 1944 г. у баях пад г. Каўнас быў цяжка паранены ў галаву, згубіў правае вока. Пасля лячэння ў шпіталях быў звалены ў запас Чырвонай арміі [16, арк. 4]. У 1944 г. узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны І ступені, медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.».

У пасляваеннай біяграфіі Р. Ц. Шлопака можна вылучыць такія моманты: у 1950 г. завочна скончыў гістарычны факультэт БДУ імя Леніна. Знаходзіўся на пасадах інструктара аддзела навукі і культуры ЦК КП Беларусі (з верасня 1953 па верасень 1955 гг.), потым на працягу чатырох гадоў навучаўся ў аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС у Маскве, пасля чаго працаваў інструктарам аддзела навукі, ВНУ і школ ЦК КПБ. У 1959 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Рабочы клас БССР у перыяд другой пяцігодкі (1933–1937 гг.) ». З 1962 г. па 1967 г. працаваў на кафедрах гісторыі КПСС і філасофіі і палітэканоміі Мінскага іняза. Затым быў камандзіраваны ЦК КПБ на работу ў Мінскую партыйную школу ў якасці дацэнта кафедры гісторыі КПСС [16, арк. 3, 29, 66].

Нават кароткі аналіз дакументальнага матэрыялу пераканаўча сведчыць пра тое, што франтавікі Мінскага іняза былі ўдзельнікамі розных баявых аперацый на галоўных франтах Вялікай Айчыннай вайны – 1-м, 2-м, 3-м Беларускіх, 2-м Прыбалтыйскім, 4-м Украінскім, а таксама на Бранскім, Заходнім, Паўночна-Заходнім, Сталінградскім і Цэнтральным франтах; абаранялі Маскву, цвярдыню на Волзе – Сталінград, штурмавалі Варшаву і Берлін і г.д.

Нагадаем, што на акупаванай тэрыторыі Беларусі ўзброеная барацьба партызан прыняла масавы характар, у якой удзельнічалі самыя розныя слаі насельніцтва.

З мая 1942 г. у ліку партызан значыўся Д а ш к е в і ч В. К. [17, арк. 2] (нарадзіўся ў 1925 г. у в. Апаліны Першамайскага сельскага савета Грэскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і). Спачатку быў сувязным, потым стаў разведчыкам партызанскага атрада Суворава брыгады імя Суворава, якая дзейнічала ў раёне Вараб'ёўскіх лясоў. У чэрвені 1944 г. быў мабілізаваны ў Чырвоную армію, удзельнічаў у баявых дзеяннях у складзе 3-га Беларускага фронту. 10 кастрычніка на подступах да Усходняй Прусіі атрымаў цяжкое раненне, у выніку якога стаў інвалідам Айчыннай вайны ІІІ групы. Узнагароджаны медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны ІІ ступені», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [17, арк. 3 адв.],

У 1950 г. закончыў гістфак БДУ імя Леніна. Са жніўня 1950 па жнівень 1951 г. выкладаў гісторыю ў СШ № 10 г. Каўнас. У 1951/52 навучальным годзе працаваў дырэктарам Пукаўскай СШ Грэскага раёна. Са жніўня 1952 па 1955 г. навучаўся ў аспірантуры пры БДУ. У кастрычніку 1955 г. атрымаў ступень кандыдата гістарычных навук за абарону дысертацыі на тэму «Каланіяльная палітыка Францыі ў Тунісе пасля другой сусветнай вайны (1945–1954 гг.)» [17, арк. 2], У Мінскім інязе пачынае працу ў якасці старшага выкладчыка кафедры марксізму-ленінізму са студзеня 1956 г. [17, арк. 11].

23-гадовым юнаком сустрэў вайну Л а п ц ё н а к М. Д. (нарадзіўся ў 1918 г. у в. Васільеўка Бярэзінскага раёна Міскай вобласці ў сялянскай сям'і). У снежні 1932 г. становіцца курсантам педагагічных курсаў у г. Беразіно Мінскай вобласці, з верасня 1933 г. па верасень 1937 г. – настаўнік гісторыі ў

сямігадовай школе в. Каменка-Барская Бярэзінскага раёна. З верасня 1937 па чэрвень 1941 г. навучаецца на гістарычным факультэце МДПІ імя Горкага. Адначасова са жніўня 1939 г. да пачатку вайны з'яўляўся інструктарам ЦК ЛКСМБ, дзе загадваў сектарам друку [18, арк. 2].

З чэрвеня 1941 г. па сакавік 1942 г. выконваў даручэнні ЦК ЛКСМБ па прыцягненні моладзі варожага тылу да адкрытай партызанскай барацьбы з нямецкімі акупантамі на тэрыторыі Клічаўскага і Бярэзінскага раёнаў. У сакавіку 1942 г. уступіў у партызанскі атрад № 278, быў выбраны сакратаром Клічаўскага падпольнага РК ЛКСМБ, удзельнічаў у партызанскай і падпольнай барацьбе разам з партызанскімі атрадамі Магілёўскага падпольнага абласнога камітэта КП(б)Б. Быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і двума медалямі «Партызану Айчыннай вайны І ступені» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [18, арк. 2].

Да 20-годдзя вызвалення Беларусі аб актыўнай дзейнасці сакратара Клічаўскага падпольнага райкама ЛКСМБ на акупаванай тэрыторыі пісала газета «Знамя юности». У артыкуле ішла размова пра гераічныя справы падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая дзейнічала ў вёсках Васільеўка, Каменны Барок, Валаўніца і іншых былога Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. Тут з першых дзён акупацыі група нядаўніх школьнікаў і студэнтаў, калгаснікаў і маладых рабочых распачала актыўную барацьбу з гітлераўцамі. У роднай вёсцы Васільеўка камсамолец М. Лапцёнак па заданні ЦК камсамола Беларусі сабраў невялікую групу моладзі, разам з якой пачаў весці работу па арганізацыі камсамольскага падполля і партызанскіх атрадаў [19, с. 3].

У лютым 1944 г. адазваны з варожага тылу ў распараджэнне ЦК ЛКСМБ, у якім з чэрвеня 1944 г. працаваў інструктарам. У ліпені 1944 г. рашэннем Бюро ЦК КП(б)Б камандзіраваны на вучобу ў Вышэйшую дыпламатычную школу НКЗС, якую скончыў у 1946 г. З 1956 г. працаваў загадчыкам кабінета марсізму-ленінізму ў МДПІЗМ. У 1964 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дзейнасць КПБ па развіцці сацыялістычнай прамысловасці рэспублікі 1926–1932 гг.» [18, арк. 47].

К а з л о ў с к і  У. І. нарадзіўся ў 1928 г. у в. Мошкі Сенненскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. У жніўні 1941 г. разам з братам Пятром, які быў пакінуты Віцебскім абкамам партыі для работы ў тыле ворага, збіраў зброю, боезапасы і іншую ваенную амуніцыю [20, арк. 4]. З красавіка па лістапад 1942 г. – радавы атрада Кірылава брыгады «Баця», з лістапада 1942 г. па жнівень 1943 г. – партызан-разведчык атрада «Знішчальнік» 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава. Са жніўня 1943 г. па студзень 1944 г. – камандзір аддзялення брыгады, са студзеня па ліпень 1944 г. – камандзір разведкі атрада «Дзяніс» партызанскай брыгады імя Заслонава [20, арк. 2 адв.; 21, арк. 13а]. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны І ступені» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне».

Пасля вайны скончыў Аршанскі чыгуначны тэхнікум, Багушэўскую сярэднюю школу, з верасня 1947 па ліпень 1951 г. – студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута, атрымаў кваліфікацыю юрыста. З кастрычніка 1951 г. па сакавік 1955 г. – аспірант Акадэміі навук БССР, с верасня 1954 г. – асістэнт у Інстытуце народнай гаспадаркі, з сакавіка 1955 г. – малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі АН БССР. 9 сакавіка ім была абаронена дысертацыя на тэму «Удасканаленне сацыялістычных вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы – важнейшая ўмова няўхільнага росту вытворчасці» [20, арк. 6]. З верасня 1955 г. працаваў старшым выкладчыкам кафедры палітэканоміі МДПІЗМ, дзе з 1 верасня 1961 г. выконваў абавязкі загадчыка гэтай кафедры.

Н а в і ц к і Р. Р. нарадзіўся ў 1908 г. у сялянскай сям'і ў в. Радуша Сцэнскай воласці Бабруйскага ўезда Мінскай губерні. З верасня 1923 па верасень 1925 г. – студэнт вячэрняга рабфака ў Бабруйску, з верасня 1925 па верасень 1929 г. навучаўся ў педагагічным тэхнікуме ў г. Рагачоў, з верасня 1929 па верасень 1933 – настаўнік няпоўнай сярэдняй школы ў в. Радуша. З 1933 па сакавік 1938 г. – студэнт гістарычнага факультэта Ленінградскага педінстытута імя Герцэна. З сакавіка 1939 г. па чэрвень 1939 г. выкладаў на курсах партыйна-камсамольскіх работнікаў Калінінскай чыгункі. З чэрвеня 1939 па чэрвень 1940 г. – начальнік штаба батальёна 756-й стралковага палка 150-й стралковай дывізіі, з чэрвеня 1940 па чэрвень 1941 г. – інструктар палітаддзела аддзялення Беластоцкай чыгункі. З ліпеня 1941 па красавік 1942 г. – начальнік сектара агітацыі і прапаганды палітычнага аддзела Куйбышаўскай чыгункі. З красавіка 1942 г. па чэрвень 1942 г. – курсант спецшколы № 2 г. Масквы, з чэрвеня 1942 г. па кастрычнік 1943 выконваў спецыяльныя заданні ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей. Удзельнічаў у партызанскіх баявых аперацыях. Узнагароджаны медалямі «Партызану Айчыннай вайны І ступені», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.» [22, арк. 3, 3 адв.].

З кастрычніка 1943 па май 1944 г. – інструктар, а потым намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкама КП (б)Б [22, арк. 3 адв.]. З мая 1944 па лістапад 1944 г. – слухач курсаў дыпламатычных работнікаў пры МЗС СССР г. Масквы. З лістапада 1944 г. па люты 1948 – кансультант, а з 1946 г. намеснік загадчыка палітаддзела МЗС БССР (г. Мінск). З лютага 1948 па снежань 1949 г. – аспірант Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК УКП(б) г. Масквы. У Мінскім іназе працаваў старшым выкладчыкам з лютага 1950 г. [22, арк. 2 адв.].

Пакуль што нам удалося адлюстраваць толькі невялікую частку баявых заслуг нашых ветэранаў. Таму з кожным днём факты, датычныя перажыўшых вайну і акупацыю, але здабыўшых вялікую Перамогу над ворагам, становяцца для кожнага з нас асабліва каштоўнымі. Тых, хто быў апалены полымем вайны і ведаў яе асабіста, становіцца ўсё менш. Таму нам неабходна перадаваць з пакалення ў пакаленне іх імёны, памятаць пра

гераізм, мужнасць і самаадданасць франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў – студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў – цяперашняга Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

## ЛІТАРАТУРА


1. Сведения о составе студентов Минского государственного педагогического института иностранных языков // НАРБ. – Ф. 1154. Воп. 1. Спр. 40.
2. Асабістая справа Данейка М. В. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 4643.
3. Списки личного состава отрядов партизанской бригады «Дяди Коли» // НАРБ. – Ф. 1405. Воп. 1. Спр. 750.
4. Асабістая справа Маркоўскай І. С. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 3272.
5. Личный листок по учету партизанских кадров 1-й Минской партизанской бригады // НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 7. Спр. 1.
6. Личный листок по учету партизанских кадров бригады им. Фрунзе // НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 5. Спр. 505
7. Асабістая справа Воўшына Я. М. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 214.
8. Асабістая справа Кандзялінскага Л. Г. // Бягучы архіў МДЛУ. Воп. 5. Спр. 5929.
9. Асабістая справа Буракоўскага С. В. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 2271.
10. Асабістая справа Калеснікава А. Д. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 4957.
11. Асабістая справа Копанева П. І. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 99.
12. Асабістая справа Мурашка П. Я. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 4.
13. *Обозная, Т.* Личным примером Павел Мурашко поднял бойцов в атаку / Т. Обозная [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://guvd.gov.by/news/9327.html. – Дата доступу : 31.03.2018.
14. Асабістая справа Сухаравай Л. А. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 7.
15. Асабістая справа Сяржаніна М. М. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 3600.
16. Асабістая справа Шлопака Р. Ц. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 1460.
17. Асабістая справа Дашкевіча В. К. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 1000.
18. Асабістая справа Лапцёнка В. Д. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 3579.
19. *Авраменко, Г.* Гром над дорогами / Г. Авраменко // Знамя юности. – 1964. – 20 мая.
20. Асабістая справа Казлоўскага У. І. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 946.

21. Сотрудники Академии МВД – ветераны Великой Отечественной войны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.amia.by/memory-pages/great-patriotic-war-veterans/kozlovskij-vi. – Дата доступу: 31.03.2018.
22. Асабістая справа Навіцкага Р. Р. // Бягучы архіў МДЛУ. – Воп. 5. Спр. 2727.

**Ю. З. Кантор**

## ВОСКРЕСЕНИЕ ИЗ НЕБЫТИЯ. ВОЗВРАЩЕНИЕ РОССИЙСКИХ ХУДОЖЕСТВЕННЫХ ЦЕННОСТЕЙ ИЗ ГЕРМАНИИ В XXI в.

Поиски российских музейных экспонатов, пропавших в время Второй мировой войны, продолжаются. Появляются все новые исследования, посвященные трагической судьбе культурных ценностей в годы Второй мировой. По крупицам воссоздается летопись, увы, подобная мартирологу. Редкие исключения – возвращение экспонатов в родные музеи – и радостны, и драматичны. Радостны – поскольку дают надежду на то, что находки будут продолжаться, являясь единственной возможностью хотя бы фрагментарно воссоздать исторические коллекции. Драматичны – поскольку неопровержимо доказывают, что массовый грабеж, производимый военно-служащими вермахта и иных армий государств-сателлитов гитлеровской Германии, нанес нашей стране не меньший урон, чем вывоз художественных ценностей, организованный в чудовищных масштабах нацистским государством, и что в частных домашних коллекциях детей и внуков тех, кто воевал на Восточном фронте, до сих пор могут находиться тысячи музейных экспонатов и других российских художественных реликвий.

Вот лишь несколько примеров двух последних десятилетий. В 1997 г. в Национальном музее города Вроцлав в Польше была выявлена принадлежавшая Гатчинскому дворцу-музею акварель «Вид Монрепо близ Людвигсбурга». Полотно оказалось в Польше во время Второй мировой в период отступления вермахта, и уже после войны как экспонат «неизвестного происхождения» попало в музей, в запасниках которого и хранилось. Благодаря совместной работе польских и российских искусствоведов удалось выяснить происхождение картины и вернуть ее в Гатчинский музей-заповедник. В 2002 г. в немецком частном собрании была найдена картина К. В. Лемоха «Крестьянская девочка», находившаяся в покоях великой княгини Ксении Александровны. В Москве состоялась церемония передачи в Гатчинский дворец картины, которая была возвращена благодаря усилиям департамента по сохранению культурных ценностей Министерства культуры России. В том же году через Министерство культуры в Гатчину передали сразу несколько картин, найденных в Берлине: «Портрет Георга I Английского» Готфрида Неллера (Англия, 1717), «Портрет Петра III» работы неизвестного художника (Россия, XVIII в.) и др. В августе 2004 г. в Гатчину из Эстонии был возвращен вывезенный оккупантами ящик для дров из кабинета

Александра II работы мастерской А. И. Тура (середина XIX в.). В апреле 2006 г. список находок пополнил шкаф-бюро работы Г. Гамбса (начало XIX в.), считавшийся утраченным. Он также был обнаружен в частной коллекции в Эстонии [1, с. 142]. В 2008 г. в Гатчинский дворец вернулся каталог картинной галереи Императорского Эрмитажа, вывезенный нацистами в годы Великой Отечественной войны. Он принадлежал императору Александру III и находился в библиотеке Гатчинского дворца. В 2007 г. сотрудники Росохранкультуры обнаружили каталог на одном из интернет-аукционов. Владелец каталога, гражданин США, по просьбе американских властей вернул издание в Россию. В 2011 г. в собрание музея вернулась уникальная резная икона «Введение Богородицы во Храм». Она была подарена императору Александру III греческими монахами в 1893 году на десятилетие его коронации. Об этом говорит надпись на тыльной стороне: «Его Императорскому Величеству Государю Императору Александру Александровичу III от русского скита святого пророка Илии на Афоне 1893 года». Дар Александр III поместил в Дворцовой церкви Гатчинского дворца. Во время Великой Отечественной войны икона пропала. А в 2007 г. она была выставлена гражданином Германии на аукционе Cristie's. К счастью, образ приобрел известный московский коллекционер, который позднее обнаружил на тыльной стороне надпись и инвентарные номера гатчинской Дворцовой церкви. 1 июня 2011 г. состоялась передача иконы Росохранкультуре, а 7 июня – музею-заповеднику «Гатчина».

В июне 2014 г. из Женевы в Гатчинский музей-заповедник вернулась уникальная коллекция фотографий членов императорской семьи: их «как трофей» взял с собой солдат вермахта, когда в 1944 г. его часть отступала из-под Ленинграда. Его вдова выставила коллекцию на торги, где ее заметили специалисты. Снимки уникальны тем, что они единственные подлинные – в музее после войны не сохранилось ни одной подлинной напечатанной фотографии (когда-то их было более 100 000 единиц) [1, с. 143].

Тогда же в музей вернулась старинная икона «Благовещение», написанная Владимиро-Волынским братством села Иванычи и подаренная императрице Марии Федоровне, супруге Александра III. Сценарий тот же – военнослужащий вермахта в 1944 г. «захватил» образ с собой. В его семье, как утверждали родственники, икона хранилась как реликвия. И лишь 70 лет спустя после того, как икона была вывезена, а говоря без эвфемизмов, украдена, из дворца, наследники решили вернуть ее на законное место, что и произошло в июле 2014 г. В обоих случаях в поиске «следа» и дальнейших переговорах активное участие принимали немецкие историки и музейщики.

Подобного рода военно-детективные истории происходили и с экспонатами других музеев-заповедников. Так, в 2005 г. Австрия вернула в музей-заповедник «Павловск» похищенную во время войны бронзовую статую бога Меркурия. Она была спрятана в тайнике в парке Павловска во время отступления советских войск в начале Великой Отечественной войны. В 1944 г. сотрудники музея вскрыли тайник, но бронзовую скульптуру не

обнаружили на месте. В 1979 г. советские специалисты, случайно увидевшие фото экспозиции музея Эггенберг (филиал Штирийского земельного музея Йоаннеум) в Граце, узнали павловского Меркурия. Австрийские музейщики подтвердили: на основании бронзовой скульптуры, в частности, была обнаружена надпись: «Федор Гордеев, отлил мастер Гастеклу, доделал и чеканил мастер Василий Можалов в 1783 году» [2]. Но лишь в постсоветское время статую удалось вернуть в родной музей – в год 60-летия Победы Меркурий занял свое историческое место перед галереей Гонзаго.

Еще одно сенсационное обретение произошло в Павловском музее-заповеднике в 2013 г. В рамках четвертой сессии рабочей группы «Германо-российский библиотечный диалог» состоялся документальный акт передачи книг библиотеки Росси. Великая княгиня, а после убийства Павла I – императрица, Мария Федоровна всю жизнь активно собирала книги. Владея пятью языками, она выписывала в свою библиотеку европейские новинки, литературу по разным областям знаний. Когда в 1822 г. в северном полуциркуле Павловского дворца была построена библиотека Росси, императрица передала туда более 20 000 томов. Кроме того, в библиотеке находилось большое количество чертежей и гравюр, минералогическая коллекция, коллекция медалей и монет, гербарии, а также около двухсот антиков. Одним из самых ценных экспонатов является трехтомное издание 1823 г. мемуаров казненной французской королевы Марии Антуанетты. Мария Федоровна, путешествуя по Европе, провела несколько месяцев в Париже, где познакомилась и подружилась с Марией Антуанеттой и потом долго переписывалась с ней. Кроме того, в собрании императрицы – полное собрание сочинений Готхольда Лессинга, изданное в 1717 г. в Берлине, письма Оноре Мирабо, сборники исторических анекдотов и другие книги, причем многие из них – с пометками на полях, сделанными императрицей и членами ее семьи. В 1942 г. часть книг – 170 томов – из этой библиотеки попали к графу Фридриху-Вернеру фон дер Шуленбургу, последнему довоенному послу Германии в Москве. Шуленбург отлично понимал ценность императорского книжного собрания и, будучи высокопоставленным сотрудником нацистского МИДа, получил разрешение забрать книги из библиотеки Росси, вывезенные оккупантами из Павловска в Берлин. После казни Шуленбурга в 1944 г. (как участника покушения на Гитлера) его собрание раритетных изданий было разделено на три части по трем ветвям семьи. Потомки графа утверждают, что не знали, откуда в их библиотеках появились новые книги (при том, что на них стоят дореволюционные шифры императорской резиденции и печати советского времени на русском языке). «Узнать» им помогли немецкие специалисты. В 1997 г. немецкий профессор Вольфганг Айхведе – создатель целой школы музейных исследователей, занимающихся поиском и возвращением в Россию культурных ценностей, обнаружил в архивах бывшего министерства госбезопасности ГДР список подаренных графу Шуленбургу книг. Лишь после того, как в 2012 г. Вольфганг Айхведе рассказал об этих книгах газете Süddeutsche Zeitung, они были найдены в огромной библиотеке фамильного замка. Передача книг

императорской библиотеки, как было подчеркнуто на церемонии, состоялась не в рамках закона о реституции, а является доброй волей и актом покаяния наследников Шуленбурга.

С именем Айхведе связано и возвращение в Царское Село двух уникальных экспонатов – единственных подлинных из убранства исчезнувшей Янтарной комнаты (восстановленной в 2003 г. к 300-летию Петербурга). Это поистине бесценные артефакты – один из двух парных комодов русской работы 1760-х годов и флорентийская мозаика «Осязание и Обоняние», выполненная во Флоренции в 1753 [3]. В том же 2014 г. немецкие пенсионеры вернули Петербургу икону Казанской Божией Матери, которая принадлежала фрейлине императрицы Александры Федоровны Анастасии Гендриковой. Также возвращены 10-й том собрания сочинений Франсуа Фенелона (одна из пяти сохранившихся книг из личной библиотеки Александра I) и две вазы из покоев императрицы Александры Федоровны. Одна ваза была выпущена в начале прошлого века на Императорском фарфоровом заводе в Петербурге, а другая, предположительно, японского происхождения. На всех предметах стоят соответствующие клейма Александровского и Екатерининского дворцов. Как это было? Дети двоих офицеров гитлеровской армии (они, к слову, не были знакомы во время войны) стали обладателями наследства, состоящего из увезенных из Царского Села предметов. Франсиска и Йенс Харден из Мюнхена посетили Царское Село в качестве туристов и именно тогда приняли решение вернуть экспонаты, которые все эти годы хранились у них дома [4].

«Дзіцячая вёска» ў Скобраўцы, якая была ўрачыста адкрыта 27 мая 1944 г. прадстаўнікамі 9-й палявой арміі і мясцовага кіраўніцтва (М. Октан, рэдактар нацыянал-сацыялістычнай газеты «Рэч» «Саюза барацьбы супраць бальшавізму», Б. Меньшагін, бурмістр Бабруйска і адначасова духоўны прадстаўнік галоўнага прапаведніка З. Булгака і святар Нямцэвіч), праіснавала 5 тыдняў [26, с. 194: 28, с. 3; 29, с. 199]. Лагер знаходзіўся ў цэнтры выселенай вёскі і быў акружаны падраздзяленнем вермахта і ўзброенымі патрулямі. Адпаведна пратаколу, афармленаму паводле сведчанняў чырвонаармейцаў і жыхароў Скобраўкі 8 ліпеня 1944 г. (пасля вызвалення Чырвонай арміяй), ён быў не ачэплены калючым дротам, а абнесены драўлянай сцяной і абмежаваны насыпным зямельным валам [28, арк. 3]. Аднак іншыя відавочцы згадваюць агароджу ў выглядзе калючага дроту [26, с. 196]. Тым не менш часта дзеці усё ж уцякалі з лагера, каб папрасіць паесці ў жыхароў прылеглых вёсак. На ўваходзе знаходзілася шыльда з надпісам: «Дзіцячая вёска Скобраўка. Для мясцовых жыхароў уваход забаронены».

Ужо 3 ліпеня вёска перайшла ў распараджэнне «Саюза барацьбы супраць бальшавізму», створанага ў сакавіку 1944 г., які падпарадкоўваўся ў далейшым германскім ваенным. Там знаходзіўся нямецкі прадстаўнік, аднак кіраванне забяспечвалася мясцовымі калабарантамі. Кіраўніцтва «Рускай вызваленчай арміяй» на чале з генералам Уласавым прызначыла адказным капітана Градзюшка. Персанал лагера, што забяспечваўся калабаранцкім саюзам барацьбы, складаўся з работнікаў кухні і маладых куратараў, якія, паводле сведчанняў, насілі на ўніформе значок іх арганізацыі – малы крыж з металу – і віталі адзін аднаго клічам «Хайль Гітлер» ці «Хай жыве Беларусь» [28, арк.3; 26, с. 194; 27].

З вышэй згаданага пратакола камісіі можна зрабіць выснову, што ў 57 вясковых хатах раздзельна пражывалі каля 1 300–1 800 хлопчыкаў і дзяўчынак. У кожнай з іх размяшчаліся ад 20 да 36 дзяцей рознага ўзросту пад наглядам маладога прадстаўніка саюза барацьбы. Ва ўсякім разе, М. Кашавенка ўспамінае аб вялікай колькасці дзяцей [27]. Пра гэта згадваюць і іншыя сведкі [26, с. 301; 28, л. 3]. Звесткі, атрыманыя адразу ж пасля вызвалення лагера Чырвонай арміяй і захаваныя ў архіве, дакладна адпавядаюць таму, што было згадана праз 60 гадоў у інтэрв'ю. Удзельнікі паведамляюць у адзін голас пра сон ў нятопленых хатах на шмат'ярусных ложках, пра строгі распарадак дня, які пачынаўся а 7-й гадзіне раніцы невялікім сняданкам і сельскагаспадарчымі работамі, прыдзіркі і пастаянны голад і страх, хваробы і адсутнасць медыцынскай дапамогі і пра высокую смяротнасць сярод дзяцей. Са сведчанняў вынікала, што Скобраўка была не чыста прамежкавым лагерам, а на справе выхаваўчым працоўным лагерам, галоўная мэта якога заключалася ў зборы «расава каштоўных» дзяцей і іх нацыянал-сацыялістычнай падрыхтоўцы: «Я помню, что нас иногда собирали возле этого садка и что-то нам говорили, что о нас Германия заботится, что счастливое детство для нас там Германия готовит, что нас скоро вывезут в Германию» [27, с. 20]. Насамрэч шмат дзяцей старэйшага ўзросту пасля пачатку HEU-акцыі былі адпраўлены ў рэйх для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы. Малодшыя заставаліся ў лагеры і павінны былі працаваць у сельскай гаспадарцы. Паводле сведчанняў, у канцы чэрвеня 1944 г. перад прыходам Чырвонай арміі гэтыя дзеці трапілі ў хаос нямецкага адступлення [25; 26].

Красны Бераг, які ляжаў непасрэдна на лініі фронту блізу Жлобіна, таксама з'яўляўся месцам, у якім у чэрвені 1944 г. (паводле іншых звестак, ужо ў сакавіку–красавіку) з прылеглых раёнаў была сабрана вялікая колькасць дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў. Згодна з дакументамі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДК), туды былі сагнаны не менш за 1 990 дзяцей [30]. Аб гісторыі ўзнікнення гэтага лагера, у адрозненне ад Скобраўкі, не пакінуты аніякія дакументы, хоць існуюць асобныя супярэчлівыя звесткі. З данясенняў германскага вермахта, актаў НДК і цытаваных пратаколаў допытаў вынікае, што працэс збору дзяцей меў гвалтоўны характар, як у выпадку з лагерам у Скобраўцы, і быў праведзены пяхотнымі дывізіямі XXXV армейскага корпуса, а таксама, па ўсёй верагоднасці, быў

арганізаваны пры ўдзеле 192-й пяхотнай дывізіі LV армейскага корпуса, які знаходзіўся ў заходнім напрамку ад гэтага месца [12, Bl. 220; 20; 22]. У той час як у службовай дакументацыі момант адкрыцця лагера датаваны чэрвенем, асобныя відавочцы паведамляюць аб дэпартацыі ў Красны Бераг ужо ў пачатку года [30; 31, л. 151; 32]. Аднагалосна згадвалася, што дзеці падлягалі медыцынскаму агляду, падзяляліся па ўзросце і стане здароўя, забяспечваліся фанернымі дошкамі, якія віселі на шыі, і на некаторы час былі сагнаны разам у перапоўненыя баракі былой базы для паліва з жахлівымі ўмовамі. Пры гэтым дзяцей старэйшага ўзросту праз некаторы час адправілі ў Германію. Па некаторых звестках, Красны Бераг быў абнесены калючым дротам і ахоўнымі вышкамі, пры гэтым пільна ахоўваўся нямецкімі часавымі з кулямётамі [33]. Відавочна, што вёска Красны Бераг знаходзілася пад строгім кантролем ваенных; дзённы распарадак размешчаных у бараках дзяцей быў арганізаваны без работы і штодзённых пастраенняў; таксама за дзецьмі не назіралі мясцовыя калабаранты, і яны былі выключаны з-пад уплыву нацыянал-сацыялістычнай прапаганды. Паводле звестак Стэльмаха, дзеці ў бараках былі зачынены «дзень і ноч», панаваў крык, хаос і закон мацнейшага: «самым жахлівым было дрэннае забеспячэнне, ніхто не пытаўся, ці еў ён штосьці. Двойчы на працягу дня прыносілі ваду ў вёдрах. Прыгатаванай ежы ніколі не давалі, толькі чэрствы хлеб, які кідалі дзецям «у рады» [33; 34]. Ад голаду былі выратаваны толькі тыя дзеці, якія атрымлівалі з дому перадачы з ежай, што хутчэй за ўсё дазвалялася.

Аб неправамерным выкарыстанні дзяцей з «арыйскай знешнасцю» з канкрэтнай групай крыві ў якасці донараў у згаданай вышэй «дзіцячай вёсцы» Скобраўка ідзе размова ў шматлікіх справаздачах ахвяр. Адпаведна сведчанням, у дзяцей пасля медыцынскага агляду і селекцыі забіралі столькі крыві, што яны страчвалі прытомнасць. Такія гвалтоўныя заборы крыві былі двойчы. У далейшым такія ж выказванні сустракаюцца ў выжыўшых з лагера Канстанцінаў і Патулічы на тэрыторыі цяперашняй Польшчы, у латышскім Саласпілсе, пад Рыгай, у дзіцячым доме Сакольнікі і Ляпеціха ва Украіне [35; 36, с. 72–98; 37; 38, S. 355–372; 39]. Шматлікая тагачасныя непаўналетнія, якія сцвярджаюць аб гвалтоўных і многаразовых заборах крыві, пачалі сведчыць пра гэта ў сувязі з кампенсацыйнымі выплатамі, якія праводзіліся былым нацысцкім ахвярам у 1990-я і 2000-я гады [40]. У сучаснай Беларусі такія паведамленні абмяжоўваюцца перш за ўсё месцамі Красны Бераг, Скобраўка і Парычы, таму што гэтыя лагеры былі кваліфікаваны як канцэнтрацыйныя і як «дзіцячыя донарскія лагеры». Аднак калі напамін пра гэта ў сённяшняй беларускай гістарыяграфіі займае асобнае месца і захоўваюцца сведчанні як факты гісторыі культуры памяці, то для шырокай нямецкай грамадскасці гэта ў значнай меры застаецца невядомым.

Пакуты схопленых і адпраўленых у Германію савецкіх дзяцей сталі актуальнай тэмай толькі ў сувязі з нямецкімі кампенсацыйнымі выплатамі нацысцкім ахвярам у 1990-я і 2000-я гады. У сувязі з крытычным разглядам ваенных біяграфій тых, хто падаваў заяўку на выплату кампенсацый, у

Германіі пачалі ўпершыню супастаўляць выказванні аб прымусовым заборы крыві і невядомыя да таго часу звесткі аб дзіцячых лагерах у Скобраўцы і Красным Беразе. Толькі як рэакцыя ў адказ гэтыя лагеры былі класіфікаваны як «спецыяльныя дзіцячыя лагеры для прымусовага забору крыві і медыцынскіх эксперыментаў» беларускай прафесійнай камісіяй, у якую ўваходзілі побач з навукоўцамі прадстаўнікі дзяржаўных архіваў і беларускага фонду «Паразуменне і прымірэнне», а таксама асобныя прадстаўнікі саюза ахвяр фашызму [41]. Дзецям, якія там утрымліваліся, і пацвердзіўшым дакументальна, што імі шматразова і ў вялікай колькасці здавалася кроў, быў прысвоены афіцыйны статус «дзіцячага донара», і яны былі прызнаны беларускім фондам у якасці адзінай катэгорыі ахвяр нацыянал-сацыялізму, якая прэтэндавала на кампенсацыю. Істотную базу для вызначэння адпаведнай катэгорыі стваралі разам з выказваннямі сведак і вышэй цытаваныя пратаколы НДК, якія непасрэдна пасля вызвалення Чырвонай арміяй акупаваных абласцей і зафіксавалі гвалтоўны забор крыві ў дзяцей у пералічаных лагерах. Аб гістарычнай класіфікацыі, пабудаванай на крытычным аналізе крыніц тых падзей, відавочна, ніхто не клапаціўся; архіўныя фонды нямецкага паходжання не выкарыстоўваліся. Паводле звестак фонду, да 2008 г. 208 чалавек атрымалі кампенсацыю як ахвяры гвалтоўнага забору крыві, што ў параўнанні з іншымі групамі ахвяр уяўляе зусім невялікую колькасць [2, с. 32].

У 1990-я гады падобныя фармальныя рашэнні стваралі базавыя паняцці і стандарты ў Беларусі, якімі карысталіся ў абыходжанні самі ахвяры, у культуры памяці і гістарыяграфіі краіны, але яны не здолелі знайсці ў сувязі з недахопам спецыяльных даследаванняў адэкватных паняційных эквівалентаў з нямецкага боку. З улікам фактаў мінулага гэта на першы погляд фармальная неадэкватнасць у дачыненні да беларускіх ахвяр была вызначальнай памылкай, якая прывяла да ўзнікнення розных інтэрпрэтацый і наратываў. Пасля стварэння нямецкага фонду «Памяць, адказнасць і будучыня», якраз у час правядзення другой праграмы выплат (2001–2006), беларускі фонд здолеў як выключэнне сярод партнёрскіх арганізацый дабіцца прызнання ахвярамі ў форме асобнай групы з адпаведнымі кампенсацыямі тых, у каго гвалтоўна забіралася кроў [42, S.130ff; 43]. Аднак размова пры гэтым ішла аб пэўным кампрамісе, паколькі нямецкі закон аб фондзе прызнаваў для выплат кампенсацый толькі тых, хто быў ахвярай прымусовай працы і асобных эксперыментаў. Забор крыві на аснове самаабгрунтавання ахвяр адпаведна нямецкай класіфікацыі не быў падставай для кампенсацыі. У якасці такога ён мог разглядацца толькі па факце медыцынскага эксперымента. Зыходзячы з гэтага ахвяры з Беларусі атрымалі кампенсацыю выключна з улікам медыцынскай пробы крыві, трапляючы пры гэтым пад размытую катэгорыю «іншыя пацярпелыя». Такім чынам, разнародныя стандарты з вопыту выплат (не толькі ў асобных краінах, а таксама паміж першай і другой праграмамі) хоць і былі перакрыты, аднак не ліквідаваны. Відавочныя прагалы ў даследаваннях гэтага застаюцца і надалей. Калі ў

Германіі па цяперашні час тэма адкрытая, дык у Беларусі яна, як і належала гэтага чакаць, была хутка запоўнена, аднак не распрацоўкамі гісторыкаў, а ацэнкамі пераважна ахвяраў вайны і іх успамінамі.

Сярод шматлікіх выказванняў сведак існуе вялікая колькасць ускосных доказаў, вядомых у ваеннай медыцыне, што абгрунтавана дапускае гістарычнасць фактаў гвалтоўнага забору крыві ў дзяцей. Напрыклад, вынікае, што нямецкія донарскія службы былі дрэнна арганізаваны і напрыканцы вайны на ўсходнім фронце наўрад ці былі ў поўнай гатоўнасці [44, S. 298ff]. Аднак да гэтага часу не была знойдзена адпаведная нямецкая дакументацыя аб злоўжываннях у дачыненні да згаданых катэгорый грамадзянскага насельніцтва.

Нямецкія данясенні, цытаваныя вышэй, сведчаць аб захопе дзяцей салдатамі вермахта ў маі–чэрвені 1944 г. Збор дзяцей паўздоўж усёй лініі фронту на паўднёвым усходзе Беларусі, перш за ўсё ў радыусе каля 100 км ад горада Бабруйска, быў прадыктаваны перш за ўсё эканамічнай неабходнасцю і часткова як элемент германскай стратэгіі абязлюдзення. Відавочна, што абодва лагеры (у адносінах да Скобраўкі гэта магчыма сцвярджаць з поўнай упэўненасцю) былі створаны перад HEU-акцыяй, каб сабраць тых, хто там заставаўся, а таксама здольных да анямечвання «расава бездакорных» савецкіх дзяцей і моладзь. Большая частка гэтых дзяцей была адпраўлена ў ходзе праведзенай акцыі ў Германію для выкарыстання ў якасці працоўнай сілы ці для германізацыі або была абавязана працаваць на месцах у Беларусі. Больш блізкі і крытычны разгляд вусных крыніц, як і дакументаў савецкай НДК па расследаванні злачынстваў у Беларусі, паказвае, што аднолькавыя на першы погляд лагеры маюць прынцыповыя адрозненні. Ва ўсялякім выпадку Скобраўка не была простым прамежкавым лагерам, ён планаваўся першапачаткова і быў уведзены ў першую чаргу як выхаваўчы працоўны лагер з мэтай збору «расава бездакорных» дзяцей і выхавання іх у ідэях нацыянал-сацыялізму; у адрозненне ад Краснага Берага, у Скобраўцы кіравала мясцовая калабарацыя і існавала гэта «вёска» некалькі тыдняў. «Вёска» Чырвоны Бераг знаходзілася зусім недалёка ад фронту, была ўвесь час пад ваенным кіраўніцтвам і фігуравала насамрэч як прамежкавы лагер, які ахоўваўся ўзброенымі салдатамі і быў абнесены калючым дротам. Згодна з атрыманымі звесткамі, размова ідзе аб часовай меры, дзе дзяцей збіралі толькі на кароткі час, якраз перад адпраўкай іх у Германію таварнымі цягнікамі. Можна ўявіць, што «дзіцячыя вёскі» ў іншых месцах, напрыклад, у Лучыцах, Петрыкаве і Парычах, існавалі таксама толькі кароткі час і хутчэй як прамежкавыя лагеры, у адрозненне ад «вёскі» з належным для гэтага персаналам для кантролю, як у Скобраўцы ці Патулічах.

У той час як гэтыя месцы з’яўляюцца састаўной часткай грамадскай памяці ў сучаснай Беларусі, яны застаюцца невядомымі ў Германіі. Нямецкамоўныя даследаванні абмяркоўваюць гэтыя аспекты Другой сусветнай вайны толькі ў сувязі з тэмай прымусовай працы. Беларускі наратыў аб «дзіцячых донарскіх лагерах» і дзецях, якіх збіралі ў першую

чаргу як донараў для гвалтоўнай здачы крыві для нямецкіх салдат у згаданых «дзіцячых вёсках», не знаходзіць згадак у нямецкай гістарычнай літаратуры і разглядаецца вельмі крытычна ў сувязі з тым, што адсутнічаюць пераканаўчыя гістарычныя доказы. З захаваных дакументаў вынікае ў першую чаргу тое, што дзеці збіраліся і адпраўляліся як працоўная сіла. Наколькі яны былі донарамі крыві і сістэматычна неправамерна выкарыстоўваліся, павінны яшчэ адказаць гісторыкі разам са спецыялістамі па гісторыі медыцыны.

ЛІТАРАТУРА


1. Памятные места [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : // http:// muzey.gmn1.by/index.php/pamyatnye-mesta. – Дата доступу : 09.01.2017.
2. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларауси 1941–1944 / авт.-сост. В. И. Адамушко [и др.]; науч. ред. Р. П. Платонов, В. И. Адамушко. – Минск : НАРБ, 2001. – 158 с.
3. *Chiari, B.* Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrussland 1941–1944 / B. Chiari. – Düsseldorf: Droste, 1998. – 380 S.
4. Kriegstagebuch Nr. 10 (Berichtszeit 1.1.–10.7.44): Eintrag von Lt. Wolfgang Weller am 28.5.1944 // Bundesarchiv-Militärarchiv (далей BA-MA). – RH 20-9/176.
5. Denkschrift Himmlers über die Behandlung der Fremdvölker im Osten (Mai 1940) // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. – Jahrgang 5 (1957), Heft 2. – S. 194–198.
6. *Steinert, J.-D.* Deportation und Zwangsarbeit. Polnische und sowjetische Kinder im nationalsozialistischen Deutschland und im besetzten Osteuropa 1939–1945 / J.-D. Steinert. – Essen : Klartext, 2013. – 306 S.
7. *Жукова, М. И.* Война причиняет мне боль / М. И. Жукова; под ред. К. И. Козака. – 2-е изд. испр. и доп. – Минск : И. П. Логвинов, 2012. – 206 с.
8. Bandenkinderunterbringung, 13.7.1943 // Archiv des Instituts für Zeitgeschichte (далей A IfZ). – MA 342/1. – Bl. 8036–8040.
9. *Gerlach, Ch.* Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungs-politik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg : Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
10. Jugendarbeit in den besetzten Ostgebieten // A IfZ. – MA 245.
11. AOK 9: Einsatz der russischen Jugend, vom 23.5.1944 // BA MA. – RH 20-9/198.
12. Befehl des AOK 9 betreffend die Erfassung von Arbeitskräften zur Rückführung ins Reich (Decknahme: „Heuaktion“) vom 28.05.1944 // BA MA. – RH 20-9/198.
13. *Mausbach, H.* Feinde des Lebens. NS-Verbrechen an Kindern / H. Mausbach, B. Mausbach-Bromberger. – Frankfurt a. M.: Röderberg-Verlag, 1979. – 315 S.
14. AOK 9, Errichtung von Jugenddörfern, den 14.5.1944 // BA MA. – RH 20-9/198.
15. Kriegstagebucheintrag vom 13.5.1944 von Wolfgang Weller // BA MA. – RH 20-9/176.
16. AOK 9 an Gen.Kd. XXXV. A.K. vom 15.5.1944 // BA MA. – RH 20-9/198.

17. Vortragsnotiz des Quartiermeisters vom 16.5.1944 // BA MA. – RH 20-9/198.
18. Kriegstagebuch des Generalkommandos des LV. Armee-Korps Abt. Qu vom 16.4.44 bis 30.6.44 // BA MA. – RH 24-55/132.
19. Tätigkeitsbericht der Abt. Ic für den Monat Mai 1944 // BA MA. – RH 24-55/94.
20. Bericht des Führers des Lautsprechertrupps Unteroffizier Readlinger vom 23.6.1944 über die „Heu-Aktion vom 15-21.6.1944 // BA MA. – RH 24-55/97.
21. Дело военнопленного Янсен Г. И. // НАРБ. – Ф. 1363. Воп. 1. Спр. 2834.
22. Дело военнопленного Кох Ф. // НАРБ. – Ф. 1363. Воп. 1. Спр. 1335.
23. Дело военнопленного Якоб Л. // НАРБ. – Ф. 1363. Воп. 1. Спр. 597.
24. Война и украденные годы. Живые свидетельства остарбайтеров Беларуси / под ред. К. И. Козака. – 2-е изд., испр. – Минск : И. П. Логвинов, 2010. – 214 с.
25. Малолетние заложники войны 1941–1945 гг.: живые свидетельства Беларуси / под ред. К. И. Козака. – Минск : И. П. Логвинов, 2011. – 220 с.
26. *Паўлаў, В. П.* Дзеці ліхалецця: дак. нарысы / В. П. Паўлаў. – Мінск : И. П. Логвинов, 2005. – 224 с.
27. Интервью с Матрёной Кошевенко (транскрипт) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.zwangsarbeit-archiv.de. – Дата доступа: 09.05.2018.
28. Показание Володи Саховского // НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 3. Спр. 183.
29. *Романько, О.* Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941–1945 / О. Романько. – М.: Вече, 2008. – 448 с.
30. Акт камісіі Краснабярэжскага сельсавета Гомельскай вобласці ад 20 лістапада 1944 г. // НАРБ. – Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6.
31. Архивная справка // Государственный архив Российской Федерации (далее – ГАРФ). – Ф. 7021. Оп. 85. Д. 214.
32. Протокол опроса свидетеля // Archiv der Stiftung „Erinnerung, Verantwortung und Zukunft“ (520.10).
33. Личный архив: Интервью Екатерины Шуп с Владимиром Стельмак для фильма «Кровные братья» для «Второго немецкого канала» в 2008 г.
34. Узница детского концлагеря «Красный берег» Екатерина Клочкова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.ctv.by/novosti-gomelya-i-gomelskoy-oblasti/v-memorialnom-komplekse-detyam-zhertvam-voyny-proveli-miting. – Дата доступу : 09.05.2018.
35. „Dann kam die deutsche Macht“. Weißrussische Kinderhäftlinge in deutschen Konzentrationslagern 1941–1945. Eine Dokumentation der Projektgruppe Belarus im Jugendclub Courage Köln e.V. – Köln : Verlag Köln, 1999. – 205 S.
36. *Литвинов, В.* Коричневое «ожерелье». Документальное повествование о жертвах нацистских преследований – гражданах бывшего СССР: в 2 т. / В. Литвинов. – Киев : Абрис, 2001. – Т. 2. – 568 с.
37. Личный архив: Интервью Екатерины Шуп с Татьяной Лебедевой для фильма «Кровные братья» для «Второго немецкого канала» в 2008 г.
38. *Tytarenko, D.* Medizinische Betreuung und nationalsozialistische Krankenmorde in der Ukraine unter der deutschen Okkupation / D. Tytarenko // Diskriminiert – vernichtet – vergessen. Behinderte in der Sowjetunion, unter nationalsozialistischer Besatzung und im Ostblock 1917–1991 / Hrsg. A. Friedman und R. Hudemann. – Stuttgart: Franz Steine Verlag, 2016. – S. 355–372.

39. Charlotte Müller, USHMM [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://collections.ushmm.org/search/catalog/irn508781. – Дата доступу : 09.05.2018.
40. Aussagen mit Prüfunterlagen // Archiv der Stiftung „Erinnerung, Verantwortung und Zukunft“ (520.10).
41. Beschluss der weißrussischen Fachkommission vom 21. September 1995. Auskunft des Nationalen weißrussischen Staatsarchivs // Archiv der Stiftung „Erinnerung, Verantwortung und Zukunft“ (520.10).
42. *Penter, T.* Die belarussische Stiftung „Verständigung und Aussöhnung“. Zwangsarbeiterentschädigung im Schatten der Lukašenka-Herrschaft / T. Penter // Die Entschädigung von NS-Zwangsarbeit am Anfang des 21. Jahrhunderts. Die Stiftung „Erinnerung,Verantwortung und Zukunft“ und ihre Partnerorganisationen / Hrsg. von Constantin Goschler [Электронны рэсурс]. – Bd. 4: Helden, Opfer, Ostarbeiter. Das Auszahlungsprogramm in der ehemaligen Sowjetunion, S. 104–280. – Рэжым доступу : https://zeitgeschichte-online.de/thema/spaete-entschaedigung-fuer-die-opfer-einer-kalkulierten-vernichtungsstrategie. – Дата доступу : 09.05.2018.
43. *Jansen, M.* „Gemeinsame Verantwortung und moralische Pflicht“. Abschlussbericht zu den Auszahlungsprogrammen der Stiftung „Erinnerung, Verantwortung und Zukunft“ / M. Jansen. – Göttingen : Wallstein Verlag, 2007. – 235 S.
44. *Neumann, A.* „Arzttum ist immer Kämpfertum“. Die Heeressanitätsinspektion und das Amt „Chef des Wehrmachtsanitätswesen“ im Zweiten Weltkrieg (1939–1945) / A. Neumann. – Düsseldorf : Ferdingand Schöning, 2005. – 524 S.

**И. А. Карпенко**

## ДНЕВНИК ТАНИ САВИЧЕВОЙ. МИФЫ И РЕАЛЬНОСТЬ

В 1991 г. в Ленинграде в издательстве «Детская литература» вышла книга И. Л. Миксона «Жила, была», посвященная самой известной жительнице блокадного Ленинграда, школьнице Тане Савичевой, в которой было собрано множество сведений о девочке, как достоверных, так и ложных [1].

Ее дневник как свидетельство трагедии ленинградской блокады известен во всем мире. Однако биография Тани Савичевой и история ее дневника, то, как она стала символом трагедии, окружены множеством мифов, до сих пор тиражируемых даже в серьезной исторической литературе и на музейных экспозициях. Так, в германо-российском музее «Берлин-Карлсхорст» в 2018 г. относительно копии дневника было указано, что данный документ выступал доказательством на Нюрнбергском процессе. Эту информацию легко опровергнуть, лишь изучив материалы этого судебного процесса.

О ленинградской школьнице Тане Савичевой стало известно за пределами Ленинграда в 1959 г. К 15-летию снятия блокады на экраны страны вышел документальный фильм Е. Ю. Учителя «Подвиг Ленинграда»,

начинавшийся со слов: «Это будет рассказ о большом городе, прожившем немало десятилетий, и маленькой девочке, которой не исполнилось и десяти лет. Под крышами этих домов живут тысячи людей, имеющих прямое отношений к событиям, о которых мы хотим рассказать. Но девочку мы выбрали потому, что она вошла в историю этого города, и своей маленькой жизнью, быть может, лучше всего утверждает величие всего происшедшего».

В фильме «Подвиг Ленинграда» рассказ о блокаде начинается в залах Особняка Румянцева, филиале Музея истории Ленинграда на набережной Красного Флота, где в 1954 г. открылась выставка «Ленинград в период Великой Отечественной войны». В одном из залов, посвященном зиме 1941–1942 гг. – смертному времени, были выставлены копии фотографии Тани Савичевой и страничек из ее дневника.

В любой выставке важен контекст: ряд экспонатов, в котором показывается предмет. На основе съемки нереально реконструировать выставочный зал и понять, какие именно экспонаты в нем помещались. Но все это возможно восстановить, если основываться на технической выставочной документации – тематико-экспозиционном плане. В нем указываются как тексты, одобренные к печати и размещению на выставке, так и списки музейных предметов. Судя по этому документу, в зале размещался следующий текст и предметы: «Партия и Правительство проявляли неустанную заботу о детях. Для детей, оставшихся в Ленинграде, были открыты ясли, детей потерявших родителей, устраивали в детские дома. Для питания детей выделяли лучшие продукты. В Ленинграде в течение 1942 г. работало 39 школ. Экспонаты: 153. Кусок хлеба весом в 125 гр. 154. Диаграмма – состав хлеба.155. Вещественные экспонаты. Куски дуранды и столярный клей. Альбумин и дикстрин. Белковые дрожжи. Бутылки муляжи с соевым молоком и кефиром. Консервы в банках капусты и тернепс. Гонок из свиной кожи фабрики “Рабочий”. Пакет с хвоей для изготовления витамин. Доска, на которой резали “хлебушек” <…> во время блокады. Зажигалки и коптилки. 156. Записная книжка Тани Савичевой. 157. Два дневника Колосова» [2, л. 31]. Как видно из этого документа, дневник был лишь частью визуального ряда. Именно благодаря режиссеру удалось сделать его «экспонатом первого ряда», привлечь к нему внимание.

Из материалов киносъемки видно, какая именно фотография была использована авторами выставки. Это фрагмент снимка, сделанного около 1938 г., на котором изображена девочка в белом платье. На оригинальном фото запечатлена Таня Савичева со своей старшей сестрой Ниной. Вероятно, именно из-за этого снимка, размещенного на выставке, в фильме была допущена ошибка: «девочке не исполнилось и десяти лет». На самом деле на момент начала блокады Татьяне исполнилось 11 лет.

В 1959 г. упоминание о Тане Савичевой было сделано в первой монографической работе о блокаде «Ленинградцы в годы блокады» (А. В. Карасев). В главе «Голодная блокада» он пишет: «Множество семей вымирало полностью. После смерти школьницы Тани Савичевой, проживавшей на 2-й линии Васильевского острова, осталась небольшая

записная книжка. В ней школьница записала: “Женя умерла 28 декабря в 12 ч. 30 м. утра 1941 г. Бабушка умерла 25 января 1942 г.и Лена умерла 17 марта 1942 г. Дядя Леша – 10 мая в 4 ч. дня. 13 мая в 7 ч. 30 м. утра умерла мамочка”. Такова судьба рядовой ленинградской семьи» [3].

Московский историк, вероятно, либо посещал экспозицию Особняка Румянцева, либо был знаком с коллекцией Музея обороны Ленинграда в Соляном переулке, из собрания которого между 1949 и 1953 годами дневник поступил в коллекцию Музея истории Ленинграда вместе со множеством картин, дневников, рисунков, плакатов, военных писем. Передача коллекции в Музей истории Ленинграда была связана с тем, что в 1949 г. в связи с Ленинградским делом Музей обороны Ленинграда был закрыт.

Дневник Тани Савичевой появился в Музее обороны Ленинграда не ранее 1945 г. Именно в 1945 г. старшая сестра Тани Нина, с которой они позировали на довоенном снимке, вернулась в Ленинград. В квартирах Савичевых в доме № 13 на 2-й линии Васильевского острова уже жили другие люди. История находки дневника была восстановлена В. Л. Бианки для альманаха «Белые ночи» [4, с. 101–111]. К этому моменту был развеян миф, что «Савичевы умерли все». В. Л. Бианки удалось переговорить с жильцами дома: ровесником Татьяны Савичевой П. П. Косяковым, А. В. Ураловым, с 1944 г. живущим в квартире Савичевых, и с ее сестрой Н. Н. Савичевой.

Историю находки дневника Нина Савичева будет повторять для интервью множество раз: «вырвалась в командировку» [1], «зимой 45-го выхлопотала себе командировку в Ленинград» [4, с. 110]. В квартире родственницы она забрала шкатулку с записной книжкой, которая оказалась блокадным дневником: «Я вошла в комнату тети Дуси, и сразу, прежде всего, увидела на столе нашу шкатулку. Мамину шкатулку. Она была красивая, ее берегли. В ней мама хранила свою венчальную фату и венчальные свечи. Смотрю, в фату моя записная книжка завернута. Я ее взяла» [4, с. 111]. В записной книжке оказались записи о смерти семьи Савичевых – дневник Тани. Его Нина передала Л. Л. Ракову, первому директору Музея обороны Ленинграда. Так, вероятно в 1945 г., дневник поступил в коллекцию музея в Соляном переулке.

Точно неизвестно, был ли дневник выставлен в Соляном переулке. Информация о нем отсутствует в подробном путеводителе по выставке «Героическая оборона Ленинграда», изданном в 1945 г. Свидетельство о его существовании на экспозиции Музея обороны имеется в воспоминаниях экскурсовода Н. И. Нониной [5]. Судя по сохранившейся фотосъемке музея, он мог появиться на новой экспозиции в Соляном не ранее 1946 г. Но так ли это, сегодня установить сложно. Свои воспоминания Н. И. Нонина писала почти полвека после закрытия музея, когда дневник уже стал самым известным экспонатом из собрания Музея обороны, символом трагедии Ленинграда. Подтвердить его присутствие в экспозиции первого блокадного музея может лишь техническая документация по выставке, сведений о которой на данный момент нет.

В начале 1960-х годов, после публикации книги А. В. Карасева и выхода фильма Е. Ю. Учителя, Таня Савичева и ее дневник стали знамениты, но биография девочки, ее судьба после эвакуации оставалась неизвестна. Нина и Михаил Савичевы (брат Татьяны) долгое время ничего не знали о ее судьбе. В семье хранилась справка об эвакуации, датированная июлем 1942 г.» [4, с. 110]. Куда именно эвакуировался детдом, какой была дальнейшая судьба ребенка, долгое время было неизвестно.

В 1964 г. в журнале «Огонек» вышла статья К. Черевкова об экспозиции в Особняке Румянцева: «Экскурсовод не нужен. Экспонаты сами ведут рассказ» [6, с. 20]. … «В музее хранится крохотная алфавитная книжечка Тани Савичевой. В дни блокады она сделала в ней девять записей. Последнюю на букву "У": – "Умерли все"» [6, с. 21]. Статья не давала никаких биографических сведений о ребенке, но там были опубликованы и дневник, и фотография.

Журнал выходил огромными тиражами, и его прочитали в том числе и в Шатковском районе Горьковской области, где в 1942–1945 гг. находился в эвакуации детский дом № 48 Смольнинского района Ленинграда. Педагоги местной школы Т. П. Чередниченко и О. П. Вереина попытались собрать сведения о Татьяне Савичевой. О. П. Вереиной в начале 1970-х удалось установить дату перевода Тани Савичевой из поселка Красный Бор, где жили эвакуированные из Ленинграда дети, в больницу поселка Шатки. Выяснилось, что Татьяна Савичева умерла в этой больнице 1 июля 1944 г. Место ее захоронения указала санитарка А. М. Журкина. Подробная история поиска сведений о Тане Савичевой рассказана в музее поселка Шатки. Следует отметить, что никакой «всесоюзной поисковой работы», объявленной газетой «Пионерская правда» в 1964 г., как это указывается в ряде публикаций, не велось. Для опровержения этого мифа достаточно изучить подшивку газеты.

Намного сложнее выяснить, откуда взялись многократно повторяемые данные о дневнике как доказательстве на Нюрнбергском процессе. Вероятнее всего, эта информация была воспринята как подлинная многочисленными читателями книги «Сердце и дневник» поэта С. Смирнова, в 1973 г. опубликованной издательством «Советская Россия». В поэме есть строки: «В каждом слове – ёмкость телеграммы, Глубь подтекста, Ключ к людской судьбе, Свет души, простой и многогранной, И почти молчанье о себе … Это смертный приговор убийцам В тишине Нюрнбергского суда» [7].

Стихи стали непременной частью «уроков мужества», героиней которых становилась Таня Савичева, особенно когда эти уроки проводились в преддверии школьных экскурсий по Дороге жизни. В 1968 г. под Ленинградом в память о блокадных детях был установлен памятник «Цветок жизни», а в 1975 г. рядом с ним по проекту архитектора А. Д. Левенкова был возведен Курган Тани Савичевой с воспроизеденными страницами на восьми стеллах из ее дневника. До 1990-х годов посещение этого мемориала входило в программу экскурсий ленинградских школ.

Подлинный дневник Тани Савичевой хранится в коллекции Государственного музея истории Санкт-Петербурга. Его очень редко выставляют из-за особой ценности экспоната. Последний раз его показывали на выставке «Блокадные реликвии» в 2009 г. Копии дневника представлены на многих экспозициях в Санкт-Петербурге – в Особняке Румянцева, на Пискаревском кладбище. Количество воспроизведений дневника в монографиях и альбомах выставок невозможно подсчитать.

Между тем Музей истории Санкт-Петербурга на протяжении десятилетий пополняет свою коллекцию экспонатами, связанными с семьей Савичевых. Так, в музее хранится домовая книга дома 13 по 2-й линии Васильевского острова, в которой на страницах 648–649 есть запись о жительнице квартиры № 1 – Татьяне Савичевой, а также ее маме Савичевой Марии Игнатьевне, прописанной по этому адресу 29 ноября 1935 г. и выписанной 19 мая 1942 г. Этот источник позволяет проверить данные по датам рождения, месту работы, адресам, дате возвращения в Ленинград после эвакуации семьи Савичевых. Кроме этой книги в коллекцию музея поступила фотография Тани и ее племянницы Марии Путиловской. Снимок сделан за несколько дней до начала войны, в июне 1941 г. Фото передала в музей сама Мария Путиловская для выставки «Блокадные реликвии» в 2009 г.

Комплекс материалов, связанных с судьбой Тани Савичевой после эвакуации из Ленинграда, хранится в Музее города Шатки в Нижегородской области. Сведения об эшелоне из Ленинграда, о жизни эвакуированных детей, о болезни и смерти Тани собраны сотрудниками этого музея. Эти данные, несомненно, требуют публикации и введения их в научный оборот.

## ЛИТЕРАТУРА

1. *Миксон, И. Л.* «Жила, была» / И. Л. Миксон. – Л. : Лениздат, 1991.

2. Научный архив ГМИ СПб. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 451. ТЭП выставки «Ленинград в период Великой Отечественной войны Советского союза». Государственный музей истории Ленинграда, 1954.

3. *Карасев, А. В.* Ленинградцы в годы блокады / А. В. Карасев. – М., 1959.

4. *Бианки, В. Л.* Планета Таня / В. Л. Бианки // Белые ночи. – Л. : Лениздат, 1989. – С. 101–111.

5. *Нонина, Н. И.* Реквием музею / Н. И. Нонина. – Иерусалим, 2003 .

6. *Черевков, К.* Четверть тысячелетия и 900 дней / К. Черевков // Огонек. – 1964. – № 5. – С. 20.

7. См*ирнов, С.* Сердце и дневник / С. Смирнов. – М. : Сов. Россия, 1973.

## ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: НОВЫЯ ПОШУКІ І ЗНАХОДКІ

**У. В. Здановіч**

# ЭТАПЫ СУЧАСНАГА ПЕРЫЯДУ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ЧАСОЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: АГУЛЬНАЕ І АДМЕТНАЕ

Вядомы беларускі даследчык А. М. Літвін вылучыў два асноўныя перыяды вывучэння гісторыі Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны: *савецкі* (чэрвень 1941 – канец 1991 гг.) і *сучасны*, ці *постсавецкі* (канец 1991 г. – цяперашні час) [1, с. 9]. Нягледзячы на падтрымку дадзенай перыядызацыі пераважнай большасцю айчынных гісторыкаў, наспеў час унесці ў яе пэўныя карэктывы. У сувязі з тым, што адбылося вылучэнне, афармленне і развіццё ўласнай беларускай гістарыяграфіі, падаецца мэтазгодным назваць дадзены перыяд *беларускім* і выдзеліць у ім два этапы : *першы* – канец 1991 г. – канец 2004 г.; *другі* – канец 2004 г. і па сённяшні дзень.

Важнымі крытэрыямі перыядызацыі з’яўляюцца формы і метады арганізацыі навуковых даследаванняў. У с а в е ц к і перыяд асноўная роля ў арганізацыі навуковых даследаванняў па тэме Вялікай Айчыннай вайны належала Інстытуту гісторыі АН БССР і Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у якіх былі створаны адпаведныя сектары і аддзелы. З прыпыненнем дзейнасці КПСС і КПБ спыніў сваё існаванне Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ, які пасля шматлікіх рэарганізацый у студзені 1996 г. быў пераўтвораны ў Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы. У яго структуру ўваходзяць аддзелы дакументазнаўства, архівазнаўства, археаграфіі, аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, а таксама рэдакцыйна-выдавецкі аддзел, бібліятэка.

У пачатку 1990-х гг. адбылася рэарганізацыя шэрага аддзелаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, які працягваў заставацца значным навукова-даследчым цэнтрам гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Так, аддзел гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны быў пераўтвораны ў 1991 г. у аддзел ваеннай гісторыі Беларусі савецкага перыяду, а потым – у аддзел ваеннай гісторыі Беларусі і, нарэшце, – у аддзел ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін (кіраўнік – А. М. Літвін).

Глыбокае і ўсебаковае вывучэнне гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны залежыць ад стану крыніцазнаўчай базы. У адпаведнасці з рашэннем ЦК КПБ ад 24.09.1990 г. у выніку аб’яднання партыйнага архіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і партархіва Мінскага абкама КПБ была створана самастойная архіўная ўстанова – Цэнтральны партыйны архіў КПБ, – у якой налічвалася 935 169 архіўных спраў, у тым ліку дакументы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Са спыненнем дзейнасці КПБ Цэнтральны партыйны архіў КПБ быў перададзены ў падпарадкаванне

Галоўнаму архіўнаму ўпраўленню пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. У 1995 г. фонды Цэнтральнага партыйнага архіва разам з фондамі Беларускага дзяражаўнага архіва (былы Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва) утварылі спачатку Цэнтральны, а потым Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь [2]. Даследчыкі атрымалі магчымасць карыстацца фондамі раней закрытых дзяржаўных і ведамасных архіваў, у тым ліку Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства замежных спраў, пачалі выкарыстоўваць дакументы і матэрыялы архіваў замежных краін, у першую чаргу, Германіі і Польшчы.

На працягу 1990-х гадоў была праведзена значная работа па рассакрэчванні захаваных дакументаў. Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь» ад 6 кастрычніка 1994 г. усе сакрэтныя дакументы да 1968 г. за рэдкім выключэннем былі рассакрэчаны, што актывізавала цікавасць да іх. У прыватнасці, даследчыкам сталі даступныя фонды нямецкіх акупацыйных улад і калабарацыянісцкіх органаў і арганізацый перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Пашырэнне рэпрэзентатыўнасці крыніцазнаўчай базы садзейнічала з'яўленню побач з традыцыйнымі тэмамі новых накірункаў даследаванняў, якія ў савецкія часы па розных прычынах, у першую чаргу ідэалагічных, заставаліся па-за сферай інтарэсаў даследчыкаў (праблема калабарацыянізму, дзейнасць на тэрыторыі Беларусі Арміі Краёвай і антысавецкага падполля, рэпрэсіі супраць каманднага складу Чырвонай арміі напярэдадні вайны, пралікі ў ходзе падрыхтоўкі да вайны, страты ў Чырвонай арміі і сярод мірнага насельніцтва пры правядзенні ваенных аперацый, трагічны лёс савецкіх салдат, якія апынуліся ў акружэнні і палоне, праца эвакуіраваных у сістэме ГУЛАГа, супрацьстаянне савецкай і нямецкай прапаганды, роля каталіцкай і праваслаўнай царквы, прымусовая праца грамадзян Беларусі, палітыка нацысцкага генацыду ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і інш.). У гістарыяграфіі знайшлі адлюстраванне не толькі пафас перамог, але і трагізм паражэнняў.

Эфектыўнасць навуковай дзейнасці ў значнай ступені залежала ад наяўнасці дактароў і кандыдатаў навук. На п е р ш ы м этапе пачалося станаўленне і развіццё нацыянальнай сістэмы атэстацыі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, у аснову чаго былі пакладзены базавыя прынцыпы, на якіх грунтавалася савецкая сістэма атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Згодна з пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 563 «»Аб часовым парадку прысваення вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» і № 564 «Аб стварэнні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь», прынятымі 18 верасня 1992 г., былі створаны атэстацыйная калегія для прысваення вучоных званняў прафесара і дацэнта і БелВАК для прысуджэння вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук.

У выніку праведзенай дзяржавай працы па ўдасканаленні дадзенай сістэмы былі дасягнуты значныя поспехі ў падрыхтоўцы кадраў даследчыкаў, у першую чаргу, гісторыкаў вышэйшай кваліфікацыі – кандыдатаў і дактароў навук. Так, у 1991 – 2004 гг. было падрыхтавана 29 дысертацый (1 знята з абароны), у тым ліку 4 доктарскія і 25 кандыдацкіх. 2 доктарскія і 13 кандыдацкіх з 19 прысвечаны гісторыі акупацыйнага рэжыму, з якіх 2 доктарскія і 5 кандыдацкіх дысертацый асвятляюць праблемы калабарацыі. Прыведзеныя дадзеныя сведчаць аб тым, што прыярытэтнае значэнне набывае гісторыя акупацыйнага рэжыму, якая па ўзроўні распрацаванасці саступала партызанскаму руху. У поўнай меры гэта мае дачыненне і да праблем калабарацыі.

Характэрнай рысай этапу стала з'яўленне гістарыяграфічных і крыніцазнаўчых прац. Калі ў пачатку 1990-х гадоў дадзеная праблема была прадстаўлена ў асноўным невялікімі артыкуламі, то на працягу 1999–2003 гг. абаронены кандыдацкія дысертацыі С. У. Жумара, І. Э. Яленскай, С. А. Сіткевіча, А. Я. Паўлавай. У 1999 г. убачыла свет самая значная праца беларускіх гісторыкаў «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. Зборнік артыкулаў», у якой акцэнтуецца ўвага на найбольш значных пытаннях вывучэння гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны [1].

Да характэрных рыс новага перыяду неабходна таксама аднесці з'яўленне спецыялізаваных часопісаў: «Беларускі гістарычны часопіс», «Спадчына», «Беларуская думка», «Беларуская мінуўшчына» і іншых. Практычна ва ўсіх універсітэтах выдаюцца «Веснікі». Такія перыядычныя выданні, па-першае, даюць магчымасць даследчыкам апублікаваць свае працы, па-другое, знаёмяць шырокае кола грамадскасці з навейшымі дасягненнямі навукоўцаў у вывучэнні праблем Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Для савецкай гістарыяграфіі былі характэрны цэласць і адзінства поглядаў. Усе найбольш маштабныя ацэнкі Вялікай Айчыннай вайны падпарадкоўваліся ідэалагічным і палітычным уплывам. Ва ўгоду ім нярэдка ігнараваліся дакументы і факты. Магчымасць адкрыта выказваць сваё меркаванне садзейнічала з'яўленню крытычных публікацый. На першым этапе прадметам крытыкі, пераважна ў публіцыстыцы, газетных і часопісных артыкулах, стала праблема партызанскага руху. Неабходна адзначыць, што крытыка, якая галоўным чынам канцэнтравалася вакол такіх пытанняў, як характар партызанскага руху і роля Камуністычнай партыі ў яго станаўленні і развіцці, мела два асноўныя накірункі: негатыўна-крытычны і пазітыўна-крытычны.

Д р у г і этап мэтазгодна пачынаць з канца 2004 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 560 17.11.2004 г. было зацверджана новае «Палажэнне аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў», згодна з якім узрастаюць патрабаванні, прад'яўляемыя да кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. У першую чаргу гэта датычыцца

апублікаванасці вынікаў даследаванняў. Так, саіскальніку ступені кандыдата навук неабходна мець тры артыкулы ў навуковых выданнях, зацверджаных ВАК Беларусі для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, а саіскальніку доктарскай ступені – 15, у тым ліку адзін у аналагічных замежных выданнях, і асабіста напісаную манаграфію. Акрамя гэтага саіскальнікі вучоных ступеняў павінны мець публікацыі ў разнастайных зборніках, матэрыялах канферэнцый. Такі падыход, на наш погляд, прадоўжыў тэрмін падрыхтоўкі дысертацый, асабліва доктарскіх.

У 2005–2017 гг. было абаронена 25 дысертацый, у тым ліку 3 доктарскія і 22 кандыдацкія (2 кандыдацкія не зацверджаны ВАК, 2 доктарскія і 2 кандыдацкія пераабаронены). З 25 абароненых дысертацый 23, у тым ліку 2 доктарскія, падрыхтаваны па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя», 2, адна з якіх доктарская, – па спецыяльнасці «Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання».

Як бачна, прысутнічае, хоць і нязначнае, скарачэнне колькасці абароненых кандыдацкіх дысертацый. Адначасова ўзрастае колькасць адхіленых ВАК дысертацый. Значна больш істотныя змены назіраюцца ў тэматыцы падрыхтаваных дысертацыйных даследаванняў. Праблема калабарацыі перастае быць прыярытэтным напрамкам даследаванняў беларускіх гісторыкаў. Адзіным дысертацыйным даследаваннем, непасрэдна прысвечаным калабарацыі, з’яўляецца абароненая ў 2005 г. дысертацыя А. В. Бяляева. Аднак поўнасцю тэма не застаецца па-за ўвагай даследчыкаў. Некаторыя яе аспекты раскрываюцца ў асобных главах і параграфах падрыхтаваных дысертацый.

13 снежня 2005 г. праведзена рэарганізацыя структуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі, у якім былі створаны 3 цэнтры, падзеленыя на аддзелы. Аддзел ваеннай гісторыі, які стаў называцца аддзелам ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін, кіраўніком якога па-ранейшаму з’яўляўся А. М. Літвін, быў уключаны ў склад Цэнтра індустрыяльнага грамадства (кіраўнік М. У. Смяховіч). У выніку наступнай рэарганізацыі, праведзенай у пачатку 2016 г., аддзел ваеннай гісторыі атрымаў ранейшую назву і стаў складовай часткай Цэнтра новай і навейшай гісторыі Беларусі.

У азначаны перыяд актывізавалася работа па даследаванні праблем ваеннай гісторыі на кафедрах грамадскіх навук ВНУ рэспублікі. Значную працу ў гэтым накірунку вялі кафедры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Калі ў 1970–1980-я гг. спецкурсы і спецсемінары па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны праводзіліся ў асобных ВНУ, у прыватнасці, у МДПІ імя А. М. Горкага і ГрДУ імя Я. Купалы, то ў 2004 г. згодна з загадам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь № 708 ад 27.05.2004 г. «Аб выкладанні ва ўстановах адукацыі курса “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)”» не толькі ва ўсіх вышэйшых

навучальных установах, але і ва ўсіх сярэдніх і сярэдне-спецыяльных установах Рэспублікі Беларусь быў уведзены спецкурс ці факультатыў «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой Сусветнай вайны)». Гэты спецкурс меў добрае метадычнае забеспячэнне: у тым жа 2004 г. была распрацавана яго праграма і выдадзены адпаведны падручнік.

На працягу 2005–2017 гг. былі дасягнуты значныя поспехі ў пашырэнні крыніцазнаўчай базы. У навуковы ўжытак была ўведзена значная колькасць разнастайных дакументаў, што з'яўляецца несумненнай заслугай айчынных даследчыкаў. Складальнікамі зборнікаў была праведзена значная праца па зборы і падрыхтоўцы да друку разнастайных крыніц, выяўленых у асноўным у замежных архівах, у першую чаргу нямецкіх. Гэтыя выданні прысвечаны пераважна баявым дзеянням на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Іх умоўна можна падзяліць на дзве групы. Да першай групы адносяцца зборнікі дакументаў. У 2016 г. сумеснымі намаганнямі беларускіх гісторыкаў і дактаранта Лейпцыгскага ўніверсітэта К. Ганцара (кіраўнік аўтарскага калектыву) падрыхтаваны зборнік «Брест. Лето 1941 года. Документы. Материалы. Фотографии» [3].

У другую групу дакументальных крыніц уваходзяць дакументы і матэрыялы, уключаныя ў склад манаграфічных выданняў. Напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі ўбачыла свет манаграфія С. Я. Новікава «Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў» [2]. У другім раздзеле кнігі змешчаны 57 новых перакладзеных з нямецкай мовы дакументаў. У другім выданні манаграфіі С. Новікава колькасць уведзеных у навуковы ўжытак нямецкіх дакументаў вырасла да 81 [4].

Яскравым прыкладам супрацоўніцтва з краінамі далёкага і блізкага замежжа стала сумеснае выданне беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх навукоўцаў двухтомніка «1941 год: Страна в огне» – першае з часоў распаду Савецкага Саюза глабальнае міжнароднае даследаванне, у якім адлюстравана новая, больш глыбокая і аб'ектыўная ацэнка ўкладу трох краін у зрыў першапачатковых задум германскага «бліцкрыгу» [5].

Характэрнай асаблівасцю другога этапу стала з'яўленне калектыўных выданняў, у тым ліку і сумесна з замежнымі спецыялістамі. У 2005 г. калектывам беларускіх гісторыкаў была падрыхтавана кніга «Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945 гг.», якую можна лічыць самым значным на дадзены момант выданнем айчынных даследчыкаў [6].

У азначаны перыяд айчыннымі гісторыкамі былі падрыхтаваны грунтоўныя працы «Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память», «Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.», якія цалкам ці часткова прысвечаны гісторыі Беларусі часоў Вялікай Айчыннай вайны, «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. » [7; 8; 9].

Агульным для двух этапаў з'яўляецца пастаноўка новых праблем і пытанняў у вывучэнні Вялікай Айчыннай вайны, якія раней не ставіліся гісторыкамі, а таксама новыя метады і падыходы да вывучэння. Разам з тым даследаванне некаторых з іх паднялося на новы ўзровень. Так, на першым этапе толькі фрагментарнае вывучэнне атрымалі асобныя аспекты вострай

праблемы савецкіх ваеннапалонных. Шматлікія праблемы ўтрымання савецкіх ваеннапалонных у нацысцкіх лагерах на акупаванай тэрыторыі Беларусі сталі прадметам дысертацыйнага даследавання Е. М. Дакуновай «Советские военнопленные на оккупированной территории Беларуси: условия содержания, сопротивление (1941–1944 гг.)» [10].

Новым накірункам даследаванняў у азначаны перыяд стала фінансавая палітыка германскіх акупацыйных улад на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Асноўныя аспекты і вызначэнне асаблівасцяў гістарычных наступстваў яе правядзення раскрыты ў дысертацыйнай рабоце І. Я. Кураковай [11].

На новы ўзровень паднялося вывучэнне прымусовай працы грамадзян Беларусі. У савецкай гістарыяграфіі дадзеная праблема разглядалася ў кантэксце акупацыйнай эканамічнай палітыкі германскіх улад. Пры гэтым практычна не даследавалася гісторыя новай сацыяльнай групы – остарбайтараў. У 1990-я гг. былі выдадзены зборнік дакументаў і матэрыялаў «Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944)» і зборнік «Остарбайтеры. Принудительный труд белорусского населения в Австрии», якія даюць уяўленне пра становішча вывезеных грамадзян Беларусі, а таксама раскрываюць палітыку савецкай улады ў дачыненні да рэпатрыянтаў [12; 13]. Аднак на дысертацыйнам узроўні праблема остарбайтараў не вывучалася, як, дарэчы, і гісторыя працоўнай паўсядзённасці насельніцтва акупіраваных тэрыторый.

У наступнае дзесяцігоддзе сітуацыя кардынальна памянялася. Палітыка прымусовай працы, якая ажыццяўлялася германскімі акупацыйнымі ўладамі на тэрыторыі Беларусі, атрымала грунтоўнае асвятленне ў вышэй згаданай кандыдацкай дысертацыі Я. А. Грэбеня і калектыўнай манаграфі «Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг.» [14; 15].

На другім этапе з’явіліся першыя гістарыяграфічная манаграфіі і доктарская дысертацыя, падрыхтаваныя аўтарам дадзенага артыкула, у якіх упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ў гістарыяграфічным плане прааналізаваны разнастайныя крыніцы і паказаны ўклад айчынных гісторыкаў у вывучэнне праблемы гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Працы дазваляюць выявіць заканамернасці і асаблівасці фарміравання і развіцця навукова-даследчых прац па тэме пачынаючы з 1941 г., вызначыць канцэптуальныя падыходы, ступень вывучанасці праблемы, ахарактарызаваць асноўныя перыяды і этапы развіцця гістарыяграфіі па ваеннай гісторыі рэспублікі азначанага перыяду [16; 17; 18].

24. Сведения безвозвратных потерь офицерского состава артиллерии 1-го Прибалтийского фронта по состоянию на 1 августа 1944 г. (Донесение артиллерии 1-го Прибалтийского фронта № 029845 от 11.08.1944 г.) // ЦАМО. – Ф. 33. Оп. 11458. Д.471 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.obd-memorial.ru. – Дата доступа : 03.02.2018 г.
25. Учетная карточка воинского захоронения № 512 д. Камаи Поставского р-на от 15 октября 1991 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.obd-memorial.ru. – Дата доступа : 02.02.2018 г.

**А. А. Крыварот**

# БАЯВАЯ САДРУЖНАСЦЬ ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941–1944): ПРАБЛЕМА ДАСЛЕДАВАННЯ

Для асвятлення гісторыі ўзаемадзеяння партызан Беларусі і Літвы ўяўляецца неабходным найперш прасачыць працэс зараджэння і станаўлення савецкага руху супраціўлення германскім захопнікам і іх паслугачам на поўначы Вілейскай вобласці і блізкіх да яе раёнаў Літвы.

Партыйныя, савецкія і камсамольскія органы з прычыны хуткага прасоўвання войск вермахта на ўсход не змаглі належным чынам падрыхтавацца да арганізаванага партызанскага змагання ў тыле праціўніка. У такой сітуацыі Вілейскі абкам КП(б)Б змог распачаць фарміраванне партызанскіх груп для дзейнасці ў тыле праціўніка толькі знаходзячыся на тэрыторыі Віцебскай вобласці. У пачатку ліпеня 1941 г. у Ветрына і Ушачах было створана 10 арганізатарскіх і партызанскіх груп на чале з кіруючымі партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі работнікамі, з якіх на Вілейшчыну прабілася толькі група С. А. Пранько. Астатнія баявыя адзінкі былі рассеяны ці вярнуліся ў савецкі тыл. Акрамя груп, створаных у савецкім тыле па ініцыятыве ЦК КП(б)Б і Вілейскага абкама КП(б)Б, некалькі партызанскіх адзінак аформіліся самастойна на акупаванай тэрыторыі Куранецкага, Маладзечанскага і Браслаўскага раёнаў намаганнямі мясцовых савецкіх актывістаў і ваеннаслужачых Чырвонай Арміі [1, с. 122; 2, с. 22–23, 124–126; 3, с. 161].

У рэгіёнах Літвы арганізатарамі савецкага партызанскага руху ў першы ваенны год сталі камуністы, якія засталіся на акупаванай тэрыторыі, і закінутыя з Вялікай зямлі ў тыл германскіх захопнікаў. Так, у ліпені і на пачатку жніўня 1941 г. ЦК КП(б) Літвы стварыў з адказных партыйных і савецкіх работнікаў 6 груп па 6–7 чалавек у кожнай і накіраваў іх у Каўнас, Шаўляй, Марыямпаль, Укмерге, Рокішкіс, Алімтус. Гэтым групам удалося правесці некалькі выніковых аперацый, сярод якіх – падрыў некалькіх цягнікоў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка на чыгуначных лініях Каўнас – Вільнюс, Іонава – Шаўляй, электрастанцыі каля Шаўляя, моста паблізу Кедайняя. Для спынення баявой дзейнасці савецкіх партызан Літвы акупацыйная ўлада ажыццявіла некалькі карных акцый. У выніку нападу захопнікаў на месцы базіравання партызан былі разгромлены 7 атрадаў з 14, што дзейнічалі ў першы ваенны год на літоўскай тэрыторыі. Падраздзяленні, якія засталіся дзейнічаць на акупаванай тэрыторыі Літвы, былі вымушаны разбівацца на дробныя групы, а таксама пераходзіць да падпольных метадаў барацьбы [4, с. 293, 295; 5, с. 604, 608].

Арганізацыйныя і баявыя кантакты савецкіх патрыётаў Беларусі і Літвы пачалі наладжвацца ў першы ваенны год і праяўляліся ў формах узаемадапамогі па разгортванні падпольнай барацьбы і партызанскага руху ў

памежных раёнах дзвюх рэспублік. Першыя такія ўзаемадачыненні звязаны з дзейнасцю на памежжы дзвюх рэспублік групы ўраджэнца Швянчонскага раёна Літвы Ф. Р. Маркава, які да вайны працаваў намеснікам старшыні Вілейскага аблвыканкама. Гэта баявая адзінка была падрыхтавана ў дыверсійнай школе каля Бранска і дасягнула вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёна 16 верасня 1941 г. На працягу першых месяцаў базіравання ў тыле праціўніка групе ўдалося правесці тры дыверсіі на чыгунцы Вільнюс – Даўгаўпілс каля станцый Ігналіна і Пагулянка на тэрыторыі Літвы. Вынікам смелых дзеянняў групы Ф. Р. Маркава стала крушэнне воінскага эшалона з аўтатранспартам у складзе 30 вагонаў, эшалона з прадуктамі і фуражом для нямецкіх франтавых часцей, пуск пад адхон шасці паравозаў. Найбольш значнай аперацыяй быў падрыў 6 студзеня 1942 г. эшалона на ўчастку паміж станцыямі Падброддзе і Пагулянка, калі быў разбіты паравоз, 39 вагонаў, забіта і паранена 185 нямецкіх салдат і афіцэраў. Зімой 1941/1942 г. байцам групы Ф. Р. Маркава ўдалося пранікнуць у Вільнюс і ўстанавіць сувязь з савецкімі патрыётамі з ліку мясцовых актывістаў і ваеннаслужачых [6, с. 276; 7, л. 155, 156; 8, с. 256].

Ужо з першых месяцаў вайны рэгіёны Беларусі сталі той базай, дзе знаходзілі сабе прытулак афіцэры і салдаты Чырвонай Арміі, якія трапілі ў акружэнне ці германскі палон на тэрыторыі Літвы. Так, у 1941 г. члены антыфашысцкай падпольнай арганізацыі з Панявежскага ўезда перапраўлялі ў Вілейскую вобласць савецкіх ваеннаслужачых-уцекачоў з лагераў ваеннапалонных [9, с. 360].

У пачатку 1942 г. партызанскім і падпольным адзінкам на акупаванай тэрыторыі Літвы даводзілася дзейнічаць ва ўмовах жорсткага пераследу з боку акупацыйнага рэжыму, адсутнасці цэнтралізаванага кіравання і сувязі з Вялікай зямлёй, дэфіцыту зброі і боепрыпасаў. Да таго ж шмат байцоў партызанскіх падраздзяленняў загінула ў баях з праціўнікам у першы год акупацыі. У сувязі з такім становішчам ЦК КП(б) Літвы з мэтай актывізацыі партызанскай і падпольнай барацьбы, стварэння кіраўнічага цэнтра супраціўлення акупацыйнаму рэжыму стаў з вясны 1942 г. сістэматычна накіроўваць на акупаваную тэрыторыю рэспублікі арганізатарскія групы. У сакавіку 1942 г. у тыл праціўніка самалётамі былі закінуты дзве вялікія групы кіруючых партыйных і камсамольскіх работнікаў на чале з сакратаром ЦК КП(б) Літвы І. Мескупасам-Адомасам, якім удалося распачаць сваю дзейнасць у паўночнай і паўднёвай частках рэспублікі. Аднак у хуткім часе групы перасталі выходзіць на сувязь з Цэнтрам і амаль поўнасцю загінулі. Летам 1942 г. на тэрыторыю рэспублікі было закінута яшчэ сем груп арганізатараў партызанска руху [4, с. 297; 5, с. 609–608].

Разам з засылкай самалётамі баявых і арганізатарскіх груп у тыл ворага ЦК КП(б) Літвы імкнуўся знайсці і іншыя шляхі пранікнення літоўскіх партызанскіх адзінак на акупаваную тэрыторыю рэспублікі для разгортвання там узброенай барацьбы. У вырашэнні дадзенай праблемы кіраўніцтва

кампартыі Літвы ў сярэдзіне 1942 г. звярнулася да ЦК КП(б)Б з просьбай прыцягнуць беларускіх партызан для аказання дапамогі літоўскім групам, каб тыя маглі прабіцца да месца выканання задання. У гэтай справе сталі выкарыстоўвацца магчымасці Віцебскіх «варот», аэрадромы і пасадачныя пляцоўкі беларускіх партызан. Такім чынам стала разгортвацца шырокае ўзаемадзеянне беларускіх і літоўскіх партызан, якое аказала станоўчы ўплыў на арганізаванасць узброенай барацьбы супраць германскіх акупантаў на тэрыторыі Вілейскай вобласці і Літвы ў 1943–1944 гг. [4, с. 310; 10, с. 478; 5, с. 609–608; 11, с. 99].

Найбольшая колькасць арганізатарскіх і баявых груп прайшла праз Віцебскія «вароты». Першыя два літоўскія падраздзяленні разам з інструктарам ЦК КП(б) Літвы С. Сырусам і пры дапамозе Паўночна-Заходняй аператыўнай групы ЦК КП(б)Б пераправіліся праз разрыў у лініі фронта летам 1942 г. Аб увазе беларускага партыйнага кіраўніцтва да перамяшчэння літоўскіх партызан сведчыць той факт, што сакратар ЦК КП(б)Б Р. Б. Эйдзінаў арыентаваў Паўночна-Заходнюю аператыўную групу ЦК КП(б)Б на аказанне народным мсціўцам суседняй рэспублікі ўсебаковай дапамогі праваднікамі і па ўстанаўленні сувязі з брыгадамі Віцебскай вобласці на чале з А. Я. Марчанкам і М. І. Дзячковым, праз месца дыслакацыі якіх пралягаў маршрут літоўскіх партызан [10, с. 478; 11, с. 100–101].

Пранікненне літоўскіх партызанскіх падраздзяленняў на тэрыторыю Літвы для выканання баявых задач мела свае складанасці, што было абумоўлена існуючымі цяжкасцямі па разгортванні партызанскай барацьбы як у самой Літве, так і ў Вілейскай вобласці, выбранай у якасці асноўнага маршрута пераходу ў суседнюю рэспубліку. Для разгортвання партызанскай барацьбы ў паўночнай частцы Вілейшчыны туды з лета 1942 г. сталі накіроўвацца групы, атрады і брыгады Віцебскай вобласці. Адным з першых такіх фарміраванняў стаў атрад пад камандаваннем І. І. Пятрова (пазней – атрад «Спартак») з 2-й Беларускай партызанскай брыгады (камандзір М. І. Дзячкоў). Атрад на чале з І. І. Пятровым быў адпраўлены па загадзе ЦШПР і штаба 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту 12 жніўня 1942 г. для разгортвання партызанскай барацьбы ў Відзскім, Браслаўскім і Шаркаўшчынскім раёнах. Неўзабаве з-за лініі фронту ў Вілейскую вобласць перабралася пяць груп літоўскіх партызан. Яны былі добра ўзброены і мелі радыёстанцыю для сувязі з Цэнтрам. Пасля кароткага адпачынку ў казянскіх лясах тры літоўскія групы перабраліся ў Літву, а падраздзяленні Й. Арлаўскаса і Дубаўскаса аб'ядналіся ў адзін атрад, у якім першы стаў камандзірам, а другі камісарам. Зыходзячы з вынікаў разведкі, праведзенай сумесна беларускімі і літоўскімі групамі ў шэрагу рэгіёнаў Літвы, было ўстаноўлена, што там яшчэ не склаліся неабходныя ўмовы для базіравання буйной партызанскай адзінкі. Улічваючы такую сітуацыю, камандаванне атрада прыняло рашэнне заставацца на тэрыторыі паўночнай Вілейшчыны да

вясны 1943 г. і разам з мясцовымі партызанамі ўдзельнічаць ва ўзброенай барацьбе супраць германскіх акупантаў і іх паслугачоў [12, с. 169–170; 7, л. 144, 159, 172аб; 13, л. 289; 11, с. 100].

Партызаны атрада «Спартак», літоўскага атрада Арлаўскаса і латышскай групы І. Бараноўскага за верасень – лістапад 1942 г. 15 раз нападалі на варожыя гарнізоны і паліцэйскія ўчасткі, у тым ліку ў Вопсе, Ёдах, Казянах. Варта адзначыць, што на некаторыя паліцэйскія гарнізоны налёты ажыццяўляліся не адзін раз. Найбольш маштабнай была сумесная аперацыя супраць нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Казянах, дзе германскае камандаванне планавала аднавіць свой апорны пункт сіламі каля 130 паліцэйскіх-украінцаў. Каб не дапусціць разгортвання акупацыйнага аб’екта, адной з мэт якога быў кантроль моста праз Дзісну, беларускі і літоўскі атрады ў ноч з 3 на 4 лістапада 1942 г. нанеслі раптоўны ўдар па гарнізоне. У выніку бою партызаны знішчылі аднаго нямецкага афіцэра і дзясяткі паліцэйскіх, узялі ў палон 18 акупантаў, захапілі 56 вінтовак і дзве скрыні патронаў. Пасля гэтай аперацыі пачаўся масавы прыток мясцовай моладзі ў партызаны. Акрамя нападаў на гарнізоны партызаны наносілі ўдары па камунікацыях праціўніка. Так, байцы беларускага і літоўскага атрадаў ва ўзаемадзеянні разбурылі чыгуначнае палатно на ўчастку Полацк – Вільнюс, рух на якім гітлераўцам так і не ўдалося аднавіць [4, с. 311; 9, с. 362; 12, с. 170; 13, л. 12, 18аб, 311, 313аб; 11, с. 100].

Пасля першых нападаў партызан на варожыя аб’екты на поўначы Вілейскай вобласці акупацыйнае камандаванне стала прымаць захады для падаўлення баявой актыўнасці атрадаў. З гэтай мэтай 22 кастрычніка 1942 г. супраць савецкіх патрыётаў была накіравана экспедыцыя ў складзе 70 выпускнікоў унтэр-афіцэрскай школы, а таксама 79 літоўскіх, латышскіх і беларускіх паліцаяў. Праціўнік напаў на лагер партызан у лесе каля вёскі Возерава. Дзякуючы граматна арганізаванай абароне амаль 50 народных мсціўцаў падчас гадзіннага бою нанеслі акупацыйнай групоўцы адчувальныя страты і прымусілі яе адступіць. На левым флангзе партызанскай абароны дзейнічаў літоўскі атрад пад камандаваннем Й. Арлаўскаса. Сярод захопленых партызанамі трафеяў былі кулямёт шэсць аўтаматаў, 21 вінтоўка, 13 пісталетаў, пяць ракетніц, 40 гранат і 2 500 патронаў [13, л. 16, 18аб, 314аб, 315; 11, с. 100].

Першы этап узаемадзеяння партызан Беларусі і Літвы на поўначы Вілейшчыны завяршыўся ў канцы восені 1942 г. У буйной карнай экспедыцыі, якую акупанты разгарнулі 22–24 лістапада 1942 г. супраць партызанскіх падраздзяленняў суседніх рэспублік, удзельнічала да 5 тысяч нямецкіх ваеннаслужачых і паліцаяў з гарнізонаў Браслаў, Відзы, Глыбокае, Казяны, Шаркаўшчына. Наступленне непрыяцеля ў напрамку населеных пунктаў Жураваўшчына, Плетарава, Якшты, Возерава падтрымлівалі шэсць танкаў, дзве бронемашыны, артылерыя і мінамёты. У выніку непрацяглага бою раён базіравання падраздзяленняў быў акружаны пераўзыходзячымі сіламі праціўніка да вечара 23 лістапада 1943 г. У сувязі з крытычнай

сітуацыяй партызаны па загадзе выконваючага абавязкі камандзіра атрада А. М. Панамарова адышлі ў глыб лесу да вёскі Дуброва, а затым для змяншэння страт невялікімі групамі з баямі вырваліся з блакады ў агульным напрамку на Шаркаўшчыну. Пасля прарыву акружэння адна частка атрада «Спартак» у колькасці 114 байцоў на чале з палітруком М. К. Ігнацьевым перамясцілася ў Расонскі раён і стала базіравацца каля вёскі Якубава, другая – ў складзе да 70 чалавек пад камандаваннем А. М. Панамарова апынулася ва Ушацкім раёне. Некалькі груп партызан засталіся ў казянскіх лясах. Падраздзяленне Й. Арлаўскаса пасля выхаду з баёў перабралася на тэрыторыю Літвы. За два месяцы ўзаемадзеяння з атрадам «Спартак» літоўская баявая адзінка ўмацавалася арганізацыйна і ў баях з германскімі акупантамі набыла неабходны баявы вопыт [13, л. 12аб, 16, 20, 314аб; 11, с. 101].

Месцам актыўнага ўзаемадзеяння партызан Беларусі і Літвы на працягу другой паловы 1942 г. была Віцебская вобласць. Акрамя літоўскіх партызанскіх груп, якія прайшлі праз Віцебскія «вароты» летам 1942 г., у лістападзе гэтага ж года лінію фронта непадалёку ад Невеля пераадолелі яшчэ пяць літоўскіх падраздзяленняў, якія месцам свайго першапачатковага базіравання выбралі Расоншчыну. Адно з такіх падраздзяленняў – група «Мечыс» пад камандаваннем П. П. Пранявічуса ў складзе 40 байцоў – разам з партызанскімі фарміраваннямі Віцебскай і Калінінскай абласцей, Латвіі прынялі ўдзел у шэрагу аперацый Так, 12 студзеня 1943 г. літоўскія партызаны сумесна з партызанамі суседніх рэспублік ажыццявілі напад на валасны цэнтр і паліцэйскі апорны пункт у латвійскім мястэчку Вецслабада. Баявым выпрабаваннем для групы П. П. Пранявічуса, як і для ўсіх партызан Расонска-Асвейскай зоны, стала барацьба супраць карнай экспедыцыі «Заяц-бяляк», якую гітлераўскае камандаванне разгарнула з усходняга напрамку. Паводле плана, прынятага на нарадзе каманднага складу зоны, літоўскае падраздзяленне разам з брыгадамі Расонскай, Дрысенскай і «За Савецкую Беларусь» уваходзіла ў паўднёвую ўдарную групу на чале з камандзірам Расонскай брыгады Р. А. Ахоціным. Гэтая група партызанскіх фарміраванняў наносіла ўдар уздоўж шашы на Расоны і змагла раздзяліць групоўку ворага на дзве часткі, што ў значнай ступені паспрыяла агульнаму поспеху ў барацьбе з карнай экспедыцыяй. Праз некаторы час падраздзяленне пад камандаваннем П. П. Працявічуса па загадзе Цэнтра перамясцілася ў раён Бягомля для сустрэчы з аператыўнай групай ЦК КП(Б) Літвы на чале з М. Ю. Шамаўскасам [14, с. 147; 15, с. 223; 16, с. 51; 17, с. 125].

Яшчэ адным рэгіёнам узаемадзеяння беларускіх і літоўскіх партызан у 1942 – пачатку 1943 г. стала Мінская вобласць. На партызанскую пляцоўку, размешчаную непадалёку ад месца дыслакацыі чэкісцкага спецатрада С. А. Ваўшасава на тэрыторыі Чэрвенскага раёна, у верасні 1942 г. на самалёце прыбылі дзве разведвальныя групы літоўскіх партызан «Сябры» і «Нерыс» на чале з І. І. Вільджунісам. Літоўскія групы базіраваліся сумесна з брыгадамі «Дзядзькі Колі» (камандзір П. Р. Лапацін) і «Народныя мсціўцы»

(камандзір В. Т. Варанянскі). У пачатку 1943 г. І. І. Вільджуніс сустрэўся з камандзірам брыгады імя К. Я. Варашылава Вілейскай вобласці Ф. Р. Маркавым, які знаходзіўся на нарадзе на тэрыторыі Барысаўскага раёна. Было дамоўлена, што літоўскія групы пасля марша з тэрыторыі Мінскай вобласці на Вілейшчыну часова, да пераходу ў суседнюю рэспубліку, будуць базіравацца ў брыгадзе імя К. Я. Варашылава [12, с. 177–179].

На беларускай зямлі зімой 1942–1943 гг. у месцах дыслакацыі беларускіх партызан таксама базіраваліся літоўскія атрады і групы «Вільнюс» (камандзір С. Апівала), «Дуброўскага» (каманадзір П. Галубовас), «Мішкас» (камандзір В. Мічунас), «Грыгаса», Й. Арлаўскаса і інш. [11, с. 102–103].

Новы этап узаемадзеяння беларускіх і літоўскіх партызан разгарнуўся з вясны 1943 г., што было звязана найперш з прыбыццём 21–23 сакавіка 1943 г. на партызанскі аэрадром каля Бягомля аператыўнай групы ЦК КП(б) Літвы на чале з М. Ю. Шумаўскасам і правядзеннем арганізацыйных мерапрыемстваў у раёнах базіравання літоўскіх партызан. Па першым часе літоўскія партызаны размяшчаліся каля брыгады «Жалязняк» (камандзір І. П. Ціткоў). Рашэннем аператыўнай групы ў пачатку красавіка 1943 г. у вёсцы Лесіны Ушацкага раёна з падраздзялення «Мечыс» на чале з П. П. Пранявічусам, якое перамясцілася з Расонскага раёна, і часткі байцоў, прысланых з Вялікай зямлі, быў створаны атрад «Жальгірыс». Перамяшчэнне ў бок граніцы з Літвой гэта падраздзяленне ажыццяўляла ва ўзаемадзеянні з атрадам «Спартак» (камандзір А. М. Панамароў), які вяртаўся ў ранейшы раён базіравання – казянскія лясы [9, с. 362; 10, с. 478; 12, с. 172–173; 5, с. 609].

Пры разгортванні сваёй дзейнасці ў тыле ворага Аператыўная група ЦК КП(б) Літвы адчувала пастаянную падтрымку з боку падпольных органаў КП(б)Б, мясцовых партызанскіх атрадаў і брыгад. Дзякуючы гэтаму, у маі 1943 г. у вёсцы Зарубаўшчына Ушацкага раёна была праведзена шырокая нарада з кіраўнікамі савецкага падполля і партызанскіх фарміраванняў Вільнюса, Каўнаса, Шауляя, Алітуса, Панявежыса і іншых рэгіёнаў акупаванай Літвы. Нарада з удзелам каля 100 прадстаўнікоў рэспублікі мела надзвычай важнае значэнне для пашырэння ўзброенай барацьбы супраць германскіх акупантаў на літоўскай зямлі. Аператыўная група ЦККП(б) Літвы перамяшчалася ў бок літоўскай граніцы асобнымі падраздзяленнямі па розных маршрутах, якія падчас руху ўзамадзейнічалі з беларускімі партызанамі. Адна з груп у раёне ўрочышча Багна-Мох некалькі дзён базіравалася ў атрадзе «Кастрычнік», дзе папоўніла свае прадуктовыя запасы. Для літоўскіх партызан быў скінуты груз са зброяй і боепрыпасамі, а на пасадачнай пляцоўцы атрада «Кастрычнік» быў прыняты самалёт з новымі байцамі для аператыўнай групы. Такая дапамога Цэнтра дазволіла беларускім і літоўскім партызанам сумесным ударам разграміць непадалёку размешчаны гарнізон праціўніка. У новым месцы базіравання, спачатку ў казянскіх лясах, а потым у раёне возера Нарач, аператыўная група пры ўдзеле мясцовых партызанскіх атрадаў і брыгад разгарнула працу па колькасным

павелічэнні партызанскіх падраздзяленняў і арганізацыі новых баявых адзінак. Так, на аснове падраздзялення «Жальгірыс» былі сфарміраваны партызанскія атрады «Вільнюс», «Гром», імя К. Каліноўскага. Базай падрыхтоўкі партыйных і камсамольскіх груп, партызанскіх падраздзяленняў для засылкі на тэрыторыю Літвы стала беларуская брыгада імя К. Я. Варашылава. Першым з такіх баявых адзінак прабіўся на тэрыторыю рэспублікі і размясціўся ў паўднёвым рэгіёне атрад «Гром». У раёне Рудніцкай пушчы з ліпеня 1943 г. стала дзейнічаць партызанскае падраздзяленне на чале з намеснікам кіраўніка аператыўнай групы, сакратаром Паўднёвага абкама КП(б) Літвы Г. О. Зіманасам. Некалькі пазней у Рудніцкую пушчу прабраўся літоўскі атрад імя К. Каліноўскага, дзе правёў некалькі баявых аперацый сумесна з беларускім асобным партызанскім атрадам «Баец» (камандзір Д. К. Бацяноўскі) [10, с. 478; 17, с. 319; 2, с. 172–173; 11, с. 103–104, 106].

Практычна адначасова з аператыўнай групай ЦК КП(б) Літвы і атрадам «Жальгірыс» перамяшчаліся з Мінскай вобласці на поўнач Вілейшчыны літоўскія партызанскія групы «Сябры» і «Нерыс» на чале з І. І. Вільджунасам. Перад маршам у пачатку вясны 1943 г. пад яго кіраўніцтвам на базе брыгады «Народныя мсціўцы» была праведзена падрыхтоўка літоўскіх партызан да перадыслакацыі ў Літву. Для больш эфектыўнай дзейнасці ў тыле ворага літоўскія групы атрымалі з Цэнтра зброю, боепрыпасы, медыкаменты, а таксама радыёстанцыю. Падраздзяленні «Сябры» і «Нерыс» размясціліся ў нарачанскіх лясах непадалёку ад атрада «Знішчальнік» (камандзір А. В. Жукаў), брыгады імя К. Я. Варашылава і пасля папаўнення мясцовымі патрыётамі перайшлі на тэрыторыю Літвы. Праз некаторы час І. І. Вільджунас, які застаўся з невялікай групай у нарачанскіх лясах, пры дапамозе беларускіх партызан брыгады імя К. Я. Варашылава сфарміраваў з савецкіх патрыётаў навакольных населеных пунктаў новы партызанскі атрад [9, с. 361; 2, с. 181, 184–185; 11, с. 99].

Асноўным месцам узаемадзеяння беларускіх і літоўскіх партызан з чэрвеня 1943 г. і да ліпеня 1944 г. сталі казянскія і нарачанскія лясы. Групы, атрады і брыгады суседніх рэспублік разам наносілі ўдары па камунікацыях і гарнізонах ворага, змагаліся з карнымі экспедыцыямі праціўніка. Падчас аперацыі «рэйкавая вайна» беларускія брыгады імя М. Ф. Гастэлы, «Спартак» сумесна з літоўскімі партызанамі з брыгады «Жальгірыс», атрадаў «Вільнюс», імя К. Каліноўскага, «Маргерыс», «Бічуляй» наносілі ўдары па праціўніку на камунікацыях Вільнюс – Даўгаўпілс, Вільнюс – Мінск, Даўгаўпілс – Кёнігсберг, Вільнюс – Гродна. Агульнымі намаганнямі чыгуначная лінія Паставы – Варапаева была выведзена з эксплуатацыі да прыходу ў рэгіён Чырвонай Арміі. Для больш эфектыўнай дыверсійнай дзейнасці на чыгунцы ажыццяўляўся ўзаемаабмен разведдадзенымі, узаемадапамога ўзрыўчаткай, перадавымі метадамі падрыўной справы. Напрыклад, камандзір літоўскага атрада «Жальгірыс» Б. Урбанавічус па просьбе камандавання беларускіх брыгад «Спартак» і імя К. Я. Варашылава

на працягу двух тыдняў падрыхтаваў для гэтых партызанскіх фарміраванняў каля 80 мінёраў. Мела працяг узаемадзеянне партызан пры правядзенні дыверсій на чыгунцы і ў 1944 г., асабліва падчас летняга наступлення Чырвонай арміі [14, с. 311–312; 9, с. 363; 10, с. 478; 17, с. 321; 2, с. 174; 5, с. 616; 5, с. 105–106].

Найбольш распаўсюджаным відам узаемадзеяння беларускіх і літоўскіх партызан, якія базіраваліся на тэрыторыі Вілейшчыны з вясны 1943 г. і да ліпеня 1944 г., былі сумесныя напады на апорныя пункты акупантаў. Ужо ў красавіку 1943 г. атрад «Кастрычнік» і літоўскія партызанскія падраздзяленні на чале з П. Пранявічусам і А. Зайцасам па загадзе БШПР разграмілі базу «народнікаў» у населеным пункце Лужкі за 20 кіламетраў на паўночны захад ад райцэнтра Пліса. Першай буйной сумеснай аперацыяй супраць гарнізонаў ворага быў налёт летам 1943 г. брыгады імя К. Я. Варашылава і літоўскага атрада «Вільнюс» на акупантаў у райцэнтры Мядзел. Падчас нападу партызаны захапілі вялікую колькасць зброі, харчоў і абмундзіравання. Нягледзячы на тое, што апорныя пункты ворага былі абнесены калючым дротам, мелі ўмацаваныя абарончыя кропкі і сістэму траншэй, беларускія і літоўскія партызаны рэгулярна наносілі ўдары па гэтых базах ворага. Некалькі баявых аперацый давялося правесці беларускім і літоўскім партызанам, каб разграміць гарнізон Шэметава, які налічваў 150 акупантаў. Толькі сабраўшы значныя сілы, народныя мсціўцы змаглі поўнасцю ліквідаваць гэты апорны пункт праціўніка. Пра важнасць барацьбы з варожымі гарнізонамі ў дзейнасці партызан суседніх рэспублік сведчыць той факт, што за студзень – май 1944 г. беларускія брыгады «Спартак», імя К. Я. Варашылава, імя Ленінскага камсамола, асобны атрад «Баец» разам з літоўскімі партызанскімі фарміраваннямі «Жальгірыс», «Вільнюс», імя К. Каліноўскага, імя А. Міцкевіча, «Бічуляй» правялі больш за 30 буйных нападаў на гарнізоны акупантаў. Адзін з такіх удараў у навагоднюю ноч быў скіраваны па праціўніку ў райцэнтры Відзы. У выніку імклівых дзеянняў байцы з брыгады «Спартак», атрадаў «Жальгірыс» і імя К. Каліноўскага захапілі чатыры станковыя кулямёты, шмат аўтаматаў і вінтовак. Некалькі паспяховых аперацый правялі ва ўзаемадзеянні беларускія і літоўскія партызаны супраць нямецкіх гарнізонаў на чыгунцы Вільнюс – Даўгаўпілс [4, с. 311; 9, с. 363; 8, с. 320; 2, с. 173, 187–188; 5, с. 610; 11, с. 106–107].

Падчас аперацыі «Баграціён» партызаны прынялі ўдзел у вызваленні больш чым 50 населеных пунктаў Беларусі і тым самым аказалі значную дапамогу войскам Чырвонай арміі ў падаўленні ачагоў супраціўлення ворага. Адна з такіх аперацый была праведзена народнымі мсціўцамі Беларусі і Літвы супраць акупантаў у райцэнтры Відзы Вілейскай вобласці. У ноч з 28 на 29 чэрвеня 1944 г. байцы брыгады «Спартак» і літоўскіх атрадаў імя К. Каліноўскага і «Жальгірыс» пад агульным кіраўніцтвам сакратара Паўночнага падпольнага абкама М. Ю. Шумаўскаса акружылі населены пункт і штурмам авалодалі Відзамі. Затым да падыходу часцей 6-й

гвардзейскай арміі партызаны на працягу некалькі дзён утрымлівалі райцэнтр, адбіваючы атакі германскіх акупантаў [1, с. 122; 9, с. 363; 10, с. 478; 5, с. 616; 11, с. 107].

Слаўная старонка гісторыі баявой садружнасці беларускіх і літоўскіх партызан – сумесная барацьбы супраць карных акцый германскіх акупантаў і іх паслугачоў. Напады карных атрадаў на беларускіх і літоўскіх партызан мелі месца ўжо ў першыя дні знаходжання аператыўнай групы ЦК КП(б) Літвы і яе атрадаў на Вілейшчыне. Так, 11 мая 1943 г. брыгада імя К. Я. Варашылава і літоўскі атрад «Вільнюс» падчас перамяшчэння з казянскіх лясоў у Нарачанскую зону каля вёскі Антоны ўступілі ў сутыкненне з групіроўкай праціўніка, сфарміраванай з ваеннаслужачых навакольных гарнізонаў. У выніку 9-гадзіннага бою пад кіраўніцтвам камбрыга Ф. Р. Маркава беларускія і літоўскія атрады падбілі два бронетранспарцёры, знішчылі дзясяткі акупантаў і не дазволілі пераўзыходзячым сілам праціўніка акружыць партызан. Яшчэ адзін бой на маршы адбыўся летам 1943 г. у Докшыцкім раёне, дзе партызанскі атрад аператыўнай групы ЦК КП(б) Літвы на чале з Г. Зіманасам разам з брыгадай імя ЦК КП(б)Б (камандзір А. Д. Мядзведзеў) адбілі нападзенне буйнога карнага атрада і нанеслі яму сурьёзны ўрон [9, с. 363;11, с. 104].

З мэтай ліквідацыі партызанскага руху ў Вілейскай вобласці і спынення яго распаўсюджвання на тэрыторыі Літвы і Латвіі германскае камандаванне неаднаразова з восені 1943 г. і да лета 1944 г. накіроўвала буйныя карныя экспедыцыі ў месцы сумеснага базіравання беларускіх і літоўскіх партызанскіх фарміраванняў. Пры правядзенні найбуйнешай з іх пад кодавай назвай «Фрыц» (верасень – кастрычнік 1943 г.) акупанты для акружэння беларускіх брыгад імя М. І. Калініна (Ф. Н. Гаўрыленка), імя Г. К. Жукава (П. Я. Сырамаха), імя К. Я. Варашылава, «Спартак» і інш., а таксама партызанскіх атрадаў аператыўнай групы ЦК КП(б) Літвы ў раёне нарачанскіх і казянскіх лясоў прыцягнулі чатыры баявыя групы колькасцю да 20 тысяч карнікаў, 12 артбатарэй, 20 танкаў і 40 самалётаў. Спачатку праціўніку ўдалося блакіраваць партызан Нарачанскай зоны. Адпаведна з рашэннем экстраннай нарады каманднага складу партызанскіх брыгад і атрадаў народныя мсціўцы пазбягалі адкрытых баёў з карнікамі і прарываліся ў тую мясцовасць, дзе было больш магчымасцей для манеўрыравання. Так, літоўскія партызаны арганізавалі прарыў у паўднёва-заходнім напрамку ў бок Мядзельшчыны. У кастрычніку 1943 г. працягам карнай экспедыцыі «Фрыц» стала наступленне акупантаў на казянскія лясы з Друі, Мер, Шаркаўшчыны, Глыбокага, Відзаў, Слабодкі і іншых месцаў іх канцэнтрацыі. Маючы значную перавагу, карнікам удалося сціснуць кальцо і прасунуцца ў глыб ляснога масіву. Партызаны суседніх рэспублік сумесна арганізавалі рухомую кругавую абарону і два тыдні вялі баі ў акружэнні. У гэты цяжкі час значную дапамогу беларускім партызанам боепрыпасамі аказалі літоўскія партызаны пад камандаваннем М. Ю. Шумаўскаса. Пасля звужэння кола блакады да 5 кіламетраў партызанскія фарміраванні разбіліся на невялікія

падраздзяленні і пры адступленні мініравалі дарогі, вялі засадныя баі і ў некалькіх месцах прарвалі абарону. У нарачанскія лясы перайшлі партызаны брыгады «Спартак» і іншых беларускіх фарміраванняў, літоўскага атрада «Жальгірыс», а таксама аператыўная група ЦК КП(б) Літвы. Брыгада імя Г. К. Жукава прабілася ў паўднёвым напрамку, фарсіравала Дзісну і выйшла ва Ушацкі раён. У канцы кастрычніка – пачатку лістапада 1943 г. беларускія і літоўскія партызаны вярнуліся на ранейшыя месцы дыслакацыі ў казянскіх і нарачанскіх лясах [1, с. 608; 6, с. 421–422; 2, с. 185–187].

Нягледзячы на пастаянны жорсткі пераслед з боку германскіх захопнікаў, найперш у выглядзе карных акцый, якія не спыняліся і ў першай палове 1944 г., партызаны суседніх рэспублік працягвалі праводзіць аперацыі на камунікацыях праціўніка і рабіць напады на яго гарнізоны як на тэрыторыі Вілейшчыны, так і Літвы.

Узаемадзеянне беларускіх і літоўскі партызанскіх фарміраванняў на працягу 1942–1944 г. ажыццяўлялася па розных напрамках і было скіравана на аказанне ўсебаковай дапамогі гераічнай барацьбе Чырвонай арміі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, падрыў усёй сістэмы акупацыйнага рэжыму ў рэгіёне. Варта адзначыць, што органы ЦК КП(б)Б і партызанскія фарміраванні Беларусі аказалі значны ўплыў на арганізацыйнае ўмацаванне літоўскіх партызан, на іх падрыхтоўку да ўзброенай барацьбы супраць германскіх захопнікаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыкл. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 680 с.

2. Люди нарочанского края : воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. – Минск : Беларусь, 1975. – 592 с.

3. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : краткие сведения об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе. – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.

4. Борьба за Советскую Прибалтику в Великой Отечественной войне 1941–1945: в 3 кн. – Рига : Лиесма, 1966. – Кн. 1. – 369 с.

5. Советские партизаны: из истории партизанского движения в годы Великой Отечеств. войны : сб. ст. / ред.-сост. В. Е. Быстров. – 2-е изд. испр. и доп. – М. : Гослитиздат, 1963. – 799 с.

6. Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941–1944 гг.) : сб. воспоминаний. – Минск : Госиздат БССР, 1961. – 506 с.

7. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 68.

8. *Хацкевич, А. Ф.* Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР / А. Ф. Хацкевич, Р. Р. Крючок. – Минск : Наука и техника, 1980. – 320 с.

9. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. Т. 3. – Минск, 1985. – 531 с.
10. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / гал. рэд. калегія.: І. М. Ігнаценка [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – 1975. – 640 с.
11. *Филимонов, А. А.* В едином боевом строю: о совместных действиях русских, белорусских, украинских, литовских, латышских, молдавских партизан / А. А. Филимонов. – Минск, 2005. – 126 с.
12. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 76.
13. В дни войны: из истории Латвии периода Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. – Рига: Изд-во АН Латв. ССР, 1964. – 292 с.
14. *Захаров, И. К.* Война в краю озер / И. К. Захаров. – 2-е изд. перераб. и доп. – Минск : Беларусь, 1973. – 319 с.
15. *Мацко, А.* Боевое братство партизан / А. Мацко // Коммунист Белоруссии. – 1982. – № 9. – С. 46–53.
16. Памяць : гіст.-дак. хроніка Расонскага р-на. – Мінск : БелЭн, 1994. – 557 с.
17. *Климов, И.* Партизаны Вилейщины / И. Климов, Н. Граков. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Беларусь, 1970. – 420 с.

**С. В. Кулинок**

## НЕМЕЦКИЕ РАЗВЕДЫВАТЕЛЬНО-ДИВЕРСИОННЫЕ ШКОЛЫ НА ТЕРРИТОРИИ СССР В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ: КОЛИЧЕСТВЕННЫЕ И РЕГИОНАЛЬНЫЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ

Деятельность немецких разведывательных школ на территории Советского Союза в годы Великой Отечественной войны до сих пор не становились объектом комплексного самостоятельного исследования. Отдельные работы по данной проблеме грешат неточностями и нуждаются в серьезных коррективах [1; 2; 3]. Большинство исследований по истории немецких спецслужб легли в основу «Сборника справочных материалов об органах германской разведки, действовавших против СССР в период Великой Отечественной войны 1941–1945 годов», который состоял из двух частей: «Германская военная разведывательная и контрразведывательная служба “Абвер”» и «Главное управление имперской безопасности Германии – РСХА и подчиненные ему органы» [4]. Эта работа носила закрытый характер и предназначалась для внутреннего использования.

В статье мы рассмотрим основные количественные характеристики и особенности деятельности немецких спецшкол на территории следующих регионов Советского Союза: Беларусь, Украина, Прибалтика и Россия. Работа немецких спецслужб по созданию разведывательно-диверсионных школ на территории БССР подробно рассмотрена автором в следующих

публикациях [5; 6; 7; 8]. Кратко резюмируя, отметим следующие основные особенности. Во-первых, основным направлением деятельности немецких секретных школ и курсов был «противопартизанский вектор». Подготовку агентуры для заброски в тыл СССР и Красной армии осуществляли около 30 % школ, в то время как абсолютное большинство готовило кадры для борьбы с «лесными солдатами». В 1943 г. начальник Центрального штаба партизанского движения П. Пономаренко использовал даже понятие «противопартизанские школы» [9, с. 57].

Во-вторых, это новые оценки количественных данных по учебным центрам. Данные о 22 (25) школах, созданных в БССР в период оккупации, морально устарели и на сегодняшний день уже не актуальны. Последние исследования позволяют говорить о деятельности минимум 50 мест стационарной подготовки немецкой агентуры [10].

В-третьих, это активная деятельность по организации специальных центров подготовки не только структурами абвера, но и другими оккупационными и секретными службами (Тайной полевой полицией ГФП, полицией и службой безопасности СД, айнзатцгруппами и командами, жандармерией). В некоторых городах одновременно могли действовать сразу несколько учебных центров. Например, в Минске действовало минимум пять школ немецких спецслужб [11]. Аналогичную ситуацию можно наблюдать и в Борисове. Помимо известной абвершколы «Сатурн», в городе функционировала «школа гестапо» [12, оп. 2, д. 65, л. 3–4]. Кроме того, в период оккупации там же действовала так называемая «школа специалистов» под руководством генерала Андрея Севостьянова. Школа работала под прикрытием «Организации Тодта» и готовила диверсантов узкого профиля [15, оп. 2, д. 56, л. 88–89]. Действовали в Борисове и курсы разведчиков, организованные ГФП. Они работали около трех недель. На курсах занималось 10–12 человек [13, оп. 21, д. 75, л. 25–25]. В Волковыске кроме мужской школы «существует женская шпионская школа, в которой обучаются 15 девушек. Школа находится в женской гимназии» [13, оп. 2, д. 56, л. 120].

В-четвертых, важным представляется определить общее количество агентов, подготовленных в спецшколах. К сожалению, точных цифр по данному вопросу на сегодняшний день в белорусской историографии нет. По сведениям разведывательного отдела Белорусского штаба партизанского движения (БШПД) только партизанами БССР было взято на учет 29 252 человека. В том числе: немецких шпионов, диверсантов и террористов – 8 584. Из числа взятых на учет было арестовано и расстреляно 7 464 человек, в том числе 5 584 немецких шпионов, диверсантов и террористов [12, оп. 3, д. 115, л. 24–27]. Следует учитывать, что в это число включены агенты-единоличники, которые не прошли стационарного обучения. По нашим подсчетам за годы оккупации спецшколы на территории БССР осуществили более 150 выпусков агентуры общим количеством от 15 до 17 тысяч человек.

Если говорить об особенностях деятельности немецких разведывательно-диверсионных школ на территории Украины, то следует выделить следующие особенности. Во-первых, это открытость архивов украинских спецслужб для исследователей. В 2000-е гг. был издан ряд указов, которые снимали ограничительные доступы к документам советских спецслужб: «О подготовке реестров рассекреченных архивных фондов (1991–2000)» (от 21 марта 2001), «О пересмотре секретов бывшего СССР» (от 2 ноября 2001), а также «О рассекречивании, обнародовании и изучении архивных документов, связанных с украинским освободительным движением, политическими репрессиями и голодоморами в Украине» [13].

Во-вторых, это глубокое вплетение в историю оккупации проблемы «национально-освободительного движения» (ОУН-УПА) [14; 15; 16; 17]. Дело в том, что эти структуры также имели свои разведывательные и контрразведывательные органы и значительное количество агентуры [18].

В-третьих, на оккупированной территории УССР активно действовали разведслужбы государств-союзников Германии – Румынии и Венгрии, которые также активно использовали местную агентуру. За годы оккупации чекисты выявили на территории Украины 791 агента румынской разведки и 20 – венгерской [19, с. 83].

Если говорить об основном направлении деятельности спецшкол на территории Украины, то оно в большей степени было ориентировано на подготовку агентуры для заброски в тыл Советского Союза и Красной армии. Во-многом это связано с большой активностью на данной территории немецкого высокоэффективного разведывательного и пропагандистского органа – «Унтернемен Цеппелин» («Предприятие Цеппелин») [20, с. 327–356].

Если рассмотреть вопрос о количественных аспектах деятельности немецких спецшкол, то единого мнения в украинской историографии на сегодняшний день нет. Историк А. Иванков отмечает, что «в ходе войны только по линии абвера и РСХА на советско-германском фронте было создано 33 школы и множество курсов. В частности, на оккупированной территории Украины действовало 15 разведывательно-террористических школ и курсов» [1, с. 76]. Известный исследователь А. Чайковский, в свою очередь, указывает: «Таких заведений на землях Украины во время фашистского нашествия было по меньшей мере три десятка. Каждые два-три месяца они выпускали почти 1500 человек, а на протяжении 1942 г. всего подготовили около 10 тыс. специалистов» [21, с. 201]. В историографии приводятся данные о деятельности учебных центров в селе Андреевка, Артемовске, Белгороде (подготовка детей), поселке Буды (Харьковская область), Волновахе, Житомире, Запорожье, Конотопе, Краматорске, Макеевке, Мелитополе, Мценске (подготовка детей), Райгородке, Олевске, Полтаве (пять), Протопопово, Славянске (подготовка детей), Симеизе, Симферополе, Тавеле. Архивные документы дополняют эти данные школами в Киеве [12, оп. 2, д. 57, л. 300], Днепропетровске [12, оп. 21, д. 2, л. 34–36],

Чернигове [12, оп. 2, д. 56, л. 18–19], Могилев-Подольске [22], селе Гущенци (Винницкая обл.) [23, т. 1, л. 9], селе Воронивица (Винницкая обл.) [23, т. 2, л. 6 об.]. Эти данные еще требуют уточнения, однако можно говорить о том, что общее количество школ будет превышать 30.

Установить общее количество подготовленной агентуры на сегодняшний день представляется проблематичным. Если говорить о выявленной и разоблаченной агентуре, то можно привести следующие данные. В «партизанских объединениях и отрядах Украины было раскрыто и уничтожено 1 069 человек, в том числе 930 агентов противника и 139 изменников. Среди местного населения было выявлено и ликвидировано 8 вражеских агентов и 1 790 человек, которых квалифицировали как изменников, а всего по двум категориям – 2 927» [24, с. 278, 299]. По линии НКВД/НКГБ историки приводят следующие данные: всего за период войны контрразведчики обезвредили на территории Украины 7 849 агентов спецслужб противника, из которых 6 951 агент немецкой разведки. Из них 2 574 агентов были оставлены противником перед отступлением, 508 были заброшены в советский тыл, а 175 – завербованы еще в довоенный период [19, с. 83]. Как мы видим из приведенных данных – они весьма значительны.

Территория Прибалтики (Латвия, Литва, Эстония) также активно использовалась немецкими спецслужбами как площадка для обучения квалифицированной агентуры. К сожалению, из специальных исследований по обозначенной проблеме можно выделить лишь работу Л. Баркова [25], посвященную противостоянию абвера в Эстонии. Отмечая особенности этого региона, укажем, что позиции немецкой разведки в этих странах были достаточно крепкими и успели сформироваться еще в межвоенный период. Историк Барков, в частности, отмечает: «Ни в одной европейской стране, пожалуй, германская разведка не запустила свои щупальца так глубоко, как в… Эстонии» [25, с. 71].

Поскольку партизанское движение в Прибалтике было развито слабо, то основным направлением подготовки агентуры было ее обучение с последующей засылкой, в основном, на территорию СССР и в части Красной армии. Вместе с этим часть курсантов готовилась для заброски в партизанские соединения на сопредельных территориях – в Беларусь и северо-западные регионы России [26, оп. 33а, д. 151, л. 273–275; д. 400, л. 279–281; 27, оп. 1, д. 976, л. 30; 12, оп. 4, д. 411, л. 166–167]. На сегодняшний момент автором выявлены учебные центры в следующих городах и населенных пунктах (возможно различное написание): Балдоне, Балт-Эзерс, Валга, Вано-Нурси, Вяцати, Двинск, Каунас, Кейла-Юа, Летсе, Люцин, Миентариус, Мыза-Кумна, Предайне, Резнеке, Рига, Стренчи, Таллинн, Ульброк, Царниково, Цесне. Всего около 20 школ.

Точных данных о количестве подготовленной агентуры пока нет. В большинстве школ одновременно обучалось от 30 до 80 агентов. Вместе с этим через школу в Стренчи за годы войны прошло более 5 тысяч радистов, разведчиков и диверсантов [28, с. 56].

Деятельность немецких разведывательно-диверсионных школ на территории РСФСР также не являлось объектом самостоятельного исследования. Определенная часть материалов была опубликована в сборниках документов [29; 30; 31]. Значительный объем документов о деятельности спецшкол и курсов хранится в Национальном архиве Республики Беларуси, так как некоторые заведения готовили агентуру для заброски в леса и партизанские зоны Беларуси [12, оп. 1, д. 857, л. 37, 50, 141–142; 12, оп. 2, д. 57, л. 41–41об.; 12, оп. 2, д. 1300, л. 109; 12, оп. 21, д. 1, л. 131, 133 об. –134]. Нами выявлены учебные центры в Брянске, Великих Луках, Гатчине, Клинцах, Краснодаре (три), Красном Боре, Мценске, Опочке, Орле, Остере, Петрозаводске, Пустошке, Ржеве, Рославле, Смоленске, Спас-Деменске, Торопце. Этот список неполный и будет уточняться. Общее количество подготовленной агентуры пока установить сложно. По приблизительным оценкам цифра может колебаться от нескольких тысяч до нескольких десятков тысяч агентов.

Подводя итог, отметим, что на территории СССР немецкие спецслужбы развернули густую сеть учебных заведений по подготовке квалифицированной агентуры. Они имели различную специализацию в зависимости от региона расположения. Общее количество открытых школ в историографии определяется следующим образом: «на советско-германском фронте в годы войны действовало свыше 130 военно-разведывательных, диверсионных и контрразведывательных органов противника, а также около 60 различных школ для подготовки агентуры» [32, с. 155; 33, с. 537]. Как видно из приведенных данных, можно утверждать, что это количество было значительно большим: Беларусь – минимум 50, Украина – более 30, Прибалтика – около 20, Россия – около 20–30 школ и курсов.

Установить хотя бы приблизительное количество обученных за годы войны агентов пока не представляется возможным. Эта проблема требует отдельного исследования. По весьма общим и предварительным данным эта цифра может приближаться к 60 тысячам агентов.

## ЛИТЕРАТУРА

1. *Иванков, А. В.* Агентурные кадры немецко-фашистской разведки и использовавшиеся ею формы и методы подрывной деятельности против СССР / А. В. Иванков. – К. : Вид-во гуманiт. л-ри, 2010. – 84 с.
2. *Иоффе, Э. Г.* Абвер, полиция безопасности и СД, тайная полевая полиция, отдел «Иностранные армии – Восток» в западных областях СССР. Стратегия и тактика. 1939–1945 гг. / Э. Г. Иоффе. – Минск : Харвест, 2007. – 384 с.
3. *Чуев, С. Г.* Разведывательные и диверсионные школы абвера / С. Г. Чуев // Военно-исторический архив – 2002. – № 9. – С. 94–124; № 11. – С. 122–146.
4. Сборник справочных материалов об органах германской разведки, действовавших против СССР в период Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. – М., 1952. – 644 с.

5. *Кулинок, С. В.* Деятельность немецких разведывательно-диверсионных школ и курсов на территории Брестской области в 1942 – 1944 гг. / С. В. Кулинок // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2017. – № 2. – С. 16–21.
6. *Кулинок, С. В.* Деятельность немецких разведывательно-диверсионных и шпионских школ на оккупированной территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны: историография проблемы / С. В. Кулинок // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2014. – Вып. 15. – С. 57–68.
7. *Кулинок, С. В.* Документальные источники Национального архива Республики Беларусь о деятельности немецких разведывательно-диверсионных школ на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны / С. В. Кулинок // Вестник архивиста. – 2016. – № 4. – С. 74–86.
8. *Кулинок, С. В.* Немецкие разведывательно-диверсионные школы на территории Витебской области в годы Великой Отечественной войны / С. В. Кулинок // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова» : сб. науч. тр. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2016. – Т. 22. – С. 39–44.
9. *Пономаренко, П. К.* Партизанское движение в Великой Отечественной войне / П. К. Пономаренко. – М. : Госполитиздат, 1943. – 58 с.
10. *Кулинок, С. В.* Деятельность немецких разведывательно-диверсионных школ и курсов на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны: новые направления и перспективы исследования / С. В. Кулинок // Российские и славянские исследования: сб. науч. тр. Вып. 11. – Минск : БГУ, 2016. – С. 85–91.
11. *Кулинок С. В.* К вопросу о деятельности немецких разведывательно-диверсионных и шпионских школ в Минске в годы Великой Отечественной войны / С. В. Кулинок // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 11 крас. 2014 г. Вып 13: у 2 т. Т. 1 / рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2015. – С. 141–148.
12. НАРБ. – Ф. 1450.
13. *Ворожко, В.* Архіви радянських спецслужб як джерело історичних досліджень / В. Ворожко // Історико-культурна спадщина: збереження доступ, використання: збірка наукових праць. – Тернопіль: ФОП Шпак В. Б., 2017. – 234 с. – С. 63–67.
14. *Білбас, І. Г.* Каральні військові підрозділи НКВС-МДБ у боротьбі з ОУН-УПА / І. Г. Білбас // Державність. – 1992. – № 4. – С. 47–54.
15. *Лаврищук, В. І.* Українська повстанська армія та радянські партизани / В. І. Лаврищук // Сторінки воєнної історії України. – К., 2000. – Вип. 4. – С. 95–100.
16. *Патриляк, І.* Протистояння українського визвольного руху нацистам та їхнім союзникам (1943–1944 рр.) / І. Патриляк // Українська Друга світова: Матеріали міжнародної наукової конференції до 70-ї річниці перемоги над нацизмом у Другій світовій війні (5 травня 2015 р., м. Київ). – Київ : К.І.С., 2015. – С. 134–179.

17. *Чайковський, А. С.* ОУН-УПА і гітлерівські спецслужби: до історії співробітництва / А. С. Чайковський // Актуальні проблеми регіональних досліджень Великої Вітчизняної війни : Матеріали Міжнародної наукової конференції (Харків, 20–21 вересня 2013 р.). – Харків : Колегіум, 2013. – 300 с. – С. 5–26.
18. *Вєдєнєєв, Д. В.* Меч і тризуб. Розвідка і контррозвідка руху українських націоналістів та УПА. 1920–1945 / Д. В. Вєдєнєєв, Г. С. Биструхін. – К. : Генеза, 2006. – 408 с.
19. *Веденеев, Д. В.* Протидія радянських спецслужб німецьким розвідці й контррозвідці на території України в 1941–1944 рр. / Д. В. Веденеев, О. Е. Лисенко // Український історичний журнал. – 2015. – № 1. – С. 69–91.
20. *Ямпольский, В. П.* Организация и деятельность «Цеппелина» / В. П. Ямпольский, В. Ф. Богодист // Труды Общества изучения истории отечественных спецслужб. Т. 4. – М. : Кучково поле, 2008. – 416 с. – С. 327–356.
21. *Чайковський, А. С.* Невідома війна: (Партизанський рух в Україні 1941–1944 рр. Мовою документів, очима істориків) / А. С. Чайковський. – К. : Україна, 1994. – 255 с.
22. Галузевий державний архів СБ України. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 374.
23. Галузевий державний архів СБ України. – Ф. 13. Оп. 1. Д. 452.
24. *Кентій, А.* Війна без пощади і милосердя. Партизанський фронт у тилу вермахту в Україні(1941–1944) / А. Кентій, В. Лозицький. – К. : Генеза, 2005. – 408 с.
25. *Барков, Л. И.* В дебрях абвера / Л. И. Барков. – Таллин : Ээсти раамат, 1971 – 126 с.
26. НАРБ. – Ф. 4п.
27. НАРБ. – Ф. 1405.
28. *Терещенко, А.* Военная контрразведка. Эпизоды борьбы / А. Терещенко. – М. : Издат. дом «Аргументы недели», 2015. – 320 с.
29. Кубань в годы Великой Отечественной войны. 1941–1945: Рассекреченные документы. Хроника событий: в 3 кн. Кн. 1. – Краснодар : Диапазон-В, 2005. – 816 с.
30. Огненная дуга. Курская битва глазами Лубянки / сост. А. Т. Жадобин, В. В. Марковчин, В. С. Христофоров. – М. : АО «Московские учебники и Картолитография», 2003. – 480 с.
31. Органы государственной безопасности СССР в Великой Отечественной войне. Т. 3: Крушение «Блицкрига», кн. 1: 1 января – 30 июня 1942 г. – М. : Русь, 2003. – 691 с.; Т. 4: Секреты операции «Цитадель», кн. 1: 1 января – 30 июня 1943 г. – М. : Русь, 2008. – 813 с.; Т. 4: Великий перелом, кн. 2: 1 июля – 31 декабря 1943 г. – М. : Русь, 2008 – 814 с.; Т. 5: Вперед на запад, кн. 1: 1 января – 30 июня 1944 г. – М. : Кучково поле, 2007. – 752 с.
32. *Остряков, С. З.* Военные чекисты / С. З. Остряков. – М. : Воениздат, 1979. – 320 с.

33. *Семиряга, М. И.* Коллаборационизм. Природа, типология и проявления в годы Второй мировой войны / М. С. Семиряга. – М. : РОССПЭН, 2000. – 863 с.

**И. А. Литвиновский, Ю. И. Литвиновская**

## СОВЕТСКИЙ СОЮЗ И ГЕРМАНСКИЙ ВОПРОС В ПЕРИОД КОРЕННОГО ПЕРЕЛОМА В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ

Сталинградская битва положила начало коренному перелому в ходе Великой Отечественной войны. По мере того, как все более явственно вырисовывалась перспектива победы над Германией, союзники по антигитлеровской коалиции все глубже погружались в обсуждение послевоенных проблем. Если в Москве эти вопросы пока еще находились на втором месте, а внимание целиком поглощала ситуация на фронте, то в столицах союзников все больше задумывались о плодах победы. Точки зрения СССР, США и Великобритании на послевоенное устройство мира далеко не во всем совпадали. Советскому правительству не удалось включить в союзный договор с Англией, подписанный 26 мая 1942 г., принципиальный вопрос о признании границы СССР по состоянию на 22 июня 1941 г. США решительно поддерживали правительство У. Черчилля в этом вопросе, несмотря на то, что Советский Союз нес на своих плечах основную тяжесть борьбы с общим врагом.

В 1916 г. по инициативе немецкого оккупационного правительства на территории Ober Ost были разработаны и приняты директивы, направленные на стимулирование учеников [18, л. 52].

Согласно дерективам контроль за всеми воспитательными и образовательными мероприятиями был возложен на управление генерал-майора Э. фон Людендорфа, начальника штаба Ober Ost. Для создания, дальнейшей работы и закрытия всех образовательных учреждений, а также ведения учебных курсов и частных уроков требовалось разрешение от управления. Для каждой школы назначался инспектор, которому подчинялись все преподаватели. Школы должны были «заботиться о религиозном сознании, приучать молодежь к исполнению законов, внимательному отношению к немецкому начальству, германским вооруженным силам, а также приучать к порядку, прилежности, правдивости, честности, в том числе и перед родителями…» [Там же].

Особое внимание в документе отводилось языку преподавания. Отмечалось, что языком занятий является родной язык учащихся. При этом на всех этапах школьного обучения на изучение немецкого языка должно было отводиться как можно большее количество часов, чтобы по окончании школы выпускник мог владеть «в достаточной мере» его устной и письменной формами. Русский как язык для проведения занятий во всех школах был запрещен, но он мог выступать как факультативный предмет в средней и старшей школах. Предполагалось, что преподаватели школ будут общаться с представителями школьных управлений по-немецки. Школьные журналы и другая документация также должны были вестись на немецком языке [18, л. 52].

В 1918 г. с приходом к власти большевиков все население страны, в том числе и жители белорусских земель, независимо от национальности и вероисповедования, получили равные возможности для дальнейшего культурного развития. Отменялись все национальные ограничения и привилегии, существовавшие до этого времени [19, л. 43а–43а об.].

Для решения национального вопроса в стране был сформирован Наркомнац. На территории Беларуси эта функция принадлежала его структурному подразделению – Белнацкому, деятельность которого была направлена на содействие белорусскому народу в отстаивании его прав на национальное самоопределение. Это позволило сместить акцент в пользу белорусского языка и образования. При этом полноправными стали родные языки всех этносов белорусского региона, начала складываться система национального образования.

Таким образом, на территории Виленской, Витебской, Гродненской, Минской и Могилевской губерний на рубеже XIX–XX вв. существовали национальные школы для немцев-колонистов. С началом Первой мировой войны деятельность немецких школ, а также использование немецкого языка находились под запретом, что вполне объяснимо обстоятельствами военного времени. В 1916 г. на белорусских землях, входивших в зону германской оккупации, были созданы некоторые условия для развития национальных школ, в том числе и немецких. Однако следует понимать, что на оккупированной территории немцы, делая акцент на развитии школ и культур всех национальностей региона, своими действиями проводили активную политику дерусификации. Это было вызвано необходимостью получить поддержку от местного населения для успешного ведения войны. После установления советской власти на белорусских территориях наибольшее значение стало уделяться развитию белорусского школьного дела. При этом все проживавшие в регионе представители остальных национальностей также получили право на развитие своих школ.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. : [в 80 ч.] / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – Ч. 4, тетр. 3 : Виленская губерния. – 1904. – 179 с.

2. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. : [в 80 ч.] / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – Ч. 5, тетр. 3 : Витебская губерния. – 1903. – 281 с.
3. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. : [в 80 ч.] / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – Ч. 11 : Гродненская губерния. – 1904. – 319 с.
4. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. : [в 80 ч.] / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – Ч. 12 : Минская губерния. – 1904. – 243 с.
5. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. : [в 80 ч.] / под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1899–1905. – Ч. 13 : Могилевская губерния. – 1903. – 276 с.
6. Кто живет в Беларуси / А. В. Гурко [и др.] ; НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 798 с.
7. *Мигун, Д. А.* Политика Германии в отношении Беларуси (1914–1922 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / Д. А. Мигун. – Минск, 2001. – 120 л.
8. Das Land Ober Ost: deutsche Arbeit in den Verwaltungsgebieten Kurland, Litauen und Bialystok-Grodno / hrsg. im Auftr. des Oberbefehlshabers Ost, bearb. von der Presseabt. Ober Ost. – [Kowno] : Presseabt. Ober Ost ; Stuttgart ; Berlin : im Buchhandel bei der Dt. Verl.-Anst., 1917. – XI, 472 S.
9. Volker-Verteilung in West-Russland : (Atlas). – Kowno : Kownoer Ztg ; [Hamburg] : [Friederichsen], 1916. – 1 Bl. ; 20 K.
10. Резолюции, принятые инородческой секцией съезда по народному образованию // Вестн. еврейского просвещения. – 1914. – № 29. – С. 63.
11. О школах немцев-колонистов // Вестн. еврейского просвещения. – 1914. – № 29. – С. 75.
12. Трудовая школа и национальное воспитание // Вестн. еврейского просвещения. – 1914. – № 30. – С. 33.
13. О детях германских, австрийских и венгерских подданных // Журн. М-ва Нар. Просвещения. – 1914. – Ноябрь. – С. 114.
14. Высочайше утвержденное положение Совета Министров от 18 августа 1916 г. о воспрещении преподавания на немецком языке // Журн. М-ва Нар. Просвещения. – 1916. – Ноябрь. – С. 4–5.
15. О детях германских и австрийских подданных // Журн. М-ва Нар. Просвещения. – 1916. – Ноябрь. – С. 92–93.
16. *Людендорф, Э.* Мои воспоминания о войне, 1914–1918 гг. / Э. Людендорф. – М. : АСТ ; Минск : Харвест, 2005. – 799 с.
17. ГИАЛ. – Ф. 641. Оп. 1. Д. 883а.
18. ОРБАН Литвы. – Ф. 23. Д. 46/1.
19. ГАМн. – Ф. 322. Оп. 1. Д. 68.

**А. М. Кушнярэвіч**

# ГРОДЗЕНСКІЯ ЗАМКІ<br>Ў ТВОРЧЫМ ЛЁСЕ НЯМЕЦКІХ АРХІТЭКТАРАЎ XVIII ст.

Актыўным культурным кантактам Беларусі з іншымі краінамі блізкага і далёкага замежжа садзейнічала яе геапалітычнае становішча паміж усходняй візантыйскай і еўрапейскай цывілізацыямі, у кантактнай зоне культурна-рэлігійных арэалаў праваслаўя і каталіцтва. Гэта выпрацавала ў беларускага народа спецыфічны менталітэт ўспрымання не толькі ўсходняй, але і заходнееўрапейскай культуры, а таксама абумовіла шырокія кантакты з Захадам. У развіцці беларуска-замежных культурных сувязей XVIII ст. важную ролю адыгралі нямецкія архітэктары, унёсак якіх у гэты працэс да гэтага часу недастаткова вывучаны.

У той час эвалюцыя беларускай архітэктуры адбывалася пад знакам некалькіх стыляў і напрамкаў, якія змянілі адзін аднаго ці суіснавалі разам: барока, ракако і класіцызм. На працягу стагоддзя яны яскрава адлюстраваліся ў палацава-сядзібнай архітэктуры, культавым мураваным і драўляным дойлідстве, гарадскіх пабудовах, будынках грамадзянскага прызначэння. У сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі жыцця, звязанымі з ваеннымі дзеяннямі ў пачатку XVIII ст., найбольш актыўнае развіццё будаўніцтва адбывалася ў 1730–1740-я гг. [1, с. 12]. Пры каралеўскім двары ў Варшаве фарміруецца мастацкая дыяспара нямецкіх дойлідаў, у склад якой уваходзілі буйнейшыя саксонскія архітэктары таго часу. Іх актыўная міграцыя ў Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ) звязана з каралеўскай уладай Рэчы Паспалітай, якая належала ў 1696–1764 гг. саксонскім курфюрстам з дынастыі Ветынаў Аўгусту ІІ (1696–1733) і Аўгусту ІІІ (1734–1764). Таму каралеўскія рэзідэнцыі ў Варшаве і Гродне будаваліся ў першай палове XVIII ст. на французскі манер дрэздэнскімі прыдворнымі архітэктарамі: бацькам і сынам М. Д. і К. М. Пёпельманамі, Я. К. Науманам, І. Х. Яўхам, Я. З. Дэйбелем, Я. Ф. Кнобелем і іншымі. Некаторыя са згаданых архітэктараў праектавалі таксама палацава-паркавыя комплексы і сядзібы для мясцовай заможнай шляхты. Попыт на навамоднае будаўніцтва спрыяў прыезду ў Рэч Паспалітую дрэздэнскіх майстроў. Асабліва значны прыток саксонцаў назіраўся падчас Сямігадовай вайны (1756–1762), калі ўвесь дрэздэнскі каралеўскі двор пераехаў у Варшаву [2, с. 66]. Яны прынеслі ў Рэч Паспалітую формы французскай рэпрэзентатыўнай палацавай архітэктуры, узбагачанай у Германіі элементамі барока і ракако. Галоўны каралеўскі архітэктар Аўгуста ІІ Моцнага, буйнейшы прадстаўнік позняга барока і ракако, стваральнік дрэздэнскага Цвінгера Матэус Даніэль Пёпельман праектуе шэраг выдатнейшых палацаў Рэчы Паспалітай, сярод якіх Новы замак у Гродне. Аднак ён у хуткім часе памёр. Таму над праектам працягваў працаваць сын Пёпельмана Карл Фрыдрых і другі каралеўскі дойлід І. Х. Яўх [3, с. 111–112].

Новы замак мае выключнае значэнне ў гісторыі Рэчы Паспалітай. Так, у яго палацы ў ноч з 23 на 24 верасня 1793 г. праходзіла так званае нямое пасяджэнне сейма Рэчы Паспалітай, на якім паслы маўчаннем пагадзіліся на другі яе падзел паміж Расіяй і Прусіяй. Па іроніі лёсу ў час паўстання 1794 г. у замку адбылася нарада кіраўніка паўстанцаў Тадэвуша Касцюшкі з камандзірамі атрадаў ВКЛ. Адсюль ён з'ехаў 9 кастрычніка 1794 г. пад Мацяёвіцы, дзе быў цяжка паранены і ўзяты ў палон рускім войскам пад камандаваннем А. Суворава. У Новым замку апошні манарх Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў 25 лістапада 1795 г. акт аб адмаўленні ад кароны, які паставіў кропку ў існаванні Рэчы Паспалітай. Згодна з загадам імператрыцы Кацярыны ІІ апошні яе манарх знаходзіўся тут пад хатнім арыштам да 1797 г., пакуль не быў вывезены згодна з загадам Паўла І у Пецярбург, дзе праз год памёр. Пасля яго ад'езду каралеўскі палац быў перададзены рускаму ваеннаму ведамству. У ходзе падаўлення паўстання 1830–1831 гг. у некаторых яго памяшканнях утрымліваліся палонныя перад адпраўкай у Сібір у Першую сусветную вайну, а ў міжваенны перыяд у Новым замку размяшчаўся ваенны шпіталь [4; 5].

Працяглыя войны Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у сярэдзіне XVII ст. спрычыніліся да спустошэння гродзенскага Старога замка (замка Вітаўта). Аднак у 1673 г. пры каралі Міхале Карыбуце-Вішнявецкім было прынята важнае для горада рашэнне аб правядзенні кожнага трэцяга генеральнага сейма Рэчы Паспалітай у Гродне. Першапачаткова планавалася пасяджэнні праводзіць у Старым замку, які быў адрамантаваны. Там адбыліся тры сеймы: у 1678, 1688 і 1692 гг. У час іх пасяджэнняў высветлілася, што Стары замак занадта цесны для такога роду мерапрыемстваў. Таму было вырашана пабудаваць новы палац, які быў бы дастаткова велічным як каралеўская рэзідэнцыя і зручным для правядзення сеймаў. Аднак рэалізаваць гэтыя планы перашкодзіла Паўночная вайна, калі Стары замак быў моцна разбураны шведамі ў 1706 і 1708 гадах. Пасля яе заканчэння на сейме 1726 г. было прынята рашэнне аб будаўніцтве ў Гродне каралеўскага палаца [6, с. 49]. Таму ўжо ў гэты год пры Аўгусце ІІ Моцным з мэтай стварэння каралеўскай рэзідэнцыі і залы сенатараў для пасяджэння сейма пачалася рэканструкцыя палаца Сапегі на Гандлёвай плошчы. Пасля ўзвядзення Каралеўскага палаца зала сеймаў злучалася з ім 2-павярховымі П-падобнымі ў плане драўлянымі карпусамі [7]. Асноўная ўвага архітэктара Я. Д. Яўха была сканцэнтравана на будаўніцтве залы сенатараў і перапланіроўцы з мэтай прыстасавання палаца да патрэб караля, двара і сейма. Разам з гэтым было захавана дэкаратыўнае афармленне былога будынка, таму многія элементы фасада істотна адрозніваліся ад ужытых раней саксонскіх архітэктурных форм [8, с. 205].

У 1726 г. праца скончылася на гэтай стадыі. Магчымай прычынай яе спынення было тое, што паспяховай рэалізацыі праектаў саксонскіх архітэктараў у Рэчы Паспалітай перашкаджаў недастаткова высокі ўзровень развіцця мясцовага будаўніцтва. Так, нямецкі падарожнік Іяган Хрысціян

Тэадор Шульц, які доўга жыў у Варшаве, пісаў, што «палац, пабудаваны ў Варшаве са звычайнай цэглы, каштуе значна даражэй за падобны ў Генуі з пясчаніка ці ў Рыме з травертыну. Паколькі мясцовыя майстры не ў стане цалкам забяспечыць буйныя будоўлі матэрыяламі, іх даводзіцца прывозіць здалёку». Ён адзначыў «недахоп умелых рамеснікаў» і неабходнасць прыцягваць да будаўніцтва «малаадукаваных людзей», нават жанчын і дзяцей, што вымагае «доўгай і дарагой падрыхтоўчай працы». Далей Шульц заўважыў, што «ў Варшаве шмат высокапрафесійных кавалёў, сапожнікаў, ткачоў, цесляроў, але недастаткова ювеліраў і майстроў гадзіннікаў. Рэдка сустрэнем мастака ці скульптара, пазалотчыка ці архітэктара. Іх даводзіцца запрашаць з Германіі, Францыі і Англіі» [8, с 205].

Думаем, у параўнанні з Варшавай Гродна выглядала яшчэ больш далёкай еўрапейскай архітэктурнай правінцыяй: тут таксама не хапала высокакваліфікаваных будаўнічых кадраў.

Далейшаму ўзвядзенню каралеўскай рэзідэнцыі ў гэтым беларускім горадзе магла перашкодзіць і смерць Аўгуста II Моцнага ў 1733 г., а таксама смута, якая пачалася пасля гэтага ў Рэчы Паспалітай. Яна працягвалася да 1736 г., калі на Варшаўскім сейме каралём польскім і вялікім князем літоўскім быў абраны Аўгуст III, другі ўладар з саксонскай дынастыі Ветынаў. Падчас яго кіравання Гродна стала нефармальнай сталіцай ВКЛ, бо тут праводзіўся кожны трэці сейм Рэчы Паспалітай. Аўгуст III пабудаваў у 1734–1751 гг. найбольш значны палацавы комплекс XVIII ст. у Рэчы Паспалітай – каралеўскую рэзідэнцыю, ці Новы замак, які стаў сімвалам раўнапраўнага статусу ВКЛ з Каралеўствам Польскім у межах саксонскай манархіі.

Раней у XI–XIII стст. на месцы Новага замка знаходзіўся вакольны горад, аб забудове якога і планіроўцы амаль адсутнічаюць звесткі. Вядома толькі, што на гэтым узвышшы стаяла мураваная Васкрасенская царква XII ст., падобная да Ніжняга храма ў Старым замку і Барысаглебскай (Каложскай) царквы. Наступны этап гісторыі забудовы тэрыторыі будачага комплексу прыпадае на пачатак крыжацкай навалы на горад у 1284 г. Напэўна, у канцы XIII – пачатку XIV ст. з мэтай павышэння абароназдольнасці на месцы вакольнага горада будуецца Ніжні замак, пра ўзвядзенне якога нічога не вядома. Адсутнічаюць звесткі і пра тое, ці распаўсюджвалася перабудова Верхняга замка ў 1398 г. і на Ніжні замак. Новая эпоха ў яго будаўнічай гісторыі наступіла прыкладна ў сярэдзіне XV ст., калі вялікі князь літоўскі Казімір Ягелончык быў абраны польскім каралём. Тады на тэрыторыі Ніжняга замка быў пабудаваны каралеўскі двор [6, с. 48–49].

У XVIII ст. на яго месцы быў узведзены палацавы комплекс. Ён выкарыстоўваўся для пасяджэнняў генеральных сеймаў Рэчы Паспалітай, а таксама як летняя каралеўская рэзідэнцыя, удала размешчаная на сярэдзіне шляху з Варшавы ў Вільню. Аўтарам праекта быў К. Ф. Пёпельман, які працаваў над праектам палаца да сярэдзіны 1737 г. разам з І. Х. Яўхам, Я. Ф. Кнобелем. У яго архітэктурна-мастацкім вырашэнні знайшлі

ўвасабленне арыгінальныя прыёмы позняга барока і ракако [8, с. 205]. Праект уяўляў сабой будынак з трох карпусоў (П-падобны ў плане), якія ўтваралі парадны двор, тыповы для палацавых ансамбляў барока. У кампазіцыі інтэр'ера саксонскімі архітэктарамі ўпершыню была ўжыта ў дойлідстве ВКЛ авальная форма планавай схемы для параднага зала. Палац быў адгароджаны ад горада шматлікімі службовымі пабудовамі. У дэкоры яго інтэр'ераў, асабліва ў аздобе капліцы, шырока выкарыстоўваліся формы ракако [5]. Аднак каралю Аўгусту ІІІ, які, ў адрозненне ад бацькі, быў узорам у сямейным жыцці, не спадабалася, што ў гэтым праекце не былі прадугледжаны пакоі для каралевы. Таму К. Ф. Пёпельман быў вымушаны тэрмінова перапрацаваць праект, новы варыянт якога Аўгуст ІІІ зацвердзіў 30 кастрычніка 1738 г. Будаўніцтва працягвалася чатыры гады. Першы ж сейм Рэчы Паспалітай у новым каралеўскім палацы адбыўся ў 1744 г. У час пасяджэнняў выявіліся недахопы ў яго планіроўцы, у прыватнасці, капліца занадта шмат месца займала ў найбольш функцыянальна значнай частцы палаца. У выніку было вырашана пабудаваць новую капліцу побач з цэнтральным корпусам палаца згодна з праектам чарговага нямецкага архітэктара І. Х. Яўха. У 1752 г. новая капліца была ўзведзена [6, с. 49–50]. Аднак завяршэнне яе будаўніцтва адбывалася ўжо пад кіраўніцтвам наступнага нямецкага архітэктара – І. Ф. Кнобеля [9, с. 173]. У гэтым жа годзе ў Гродне адбыўся апошні сейм эпохі Саксаў. Кароль Аўгуст ІІІ рэдка тут спыняўся, таму на ўтрыманне палаца не хапала сродкаў і ён паступова прыходзіў у заняпад. Яго рэканструкцыю ў 1789 г. ажыццявіў італьянскі архітэктар Дж. Сака, абсталяваўшы пад рэзідэнцыю Станіслава Аўгуста Панятоўскага (Аўгуста IV) [6, с. 50; 9, с. 174].

Пазней палацавы комплекс неаднаразова перабудоўваўся, змяняліся як яго знешні выгляд, так і інтэр'еры. У XIX ст. ён значна пацярпеў ад рамонтаў, якія ў ім праводзілі расійскія вайсковыя медыкі. У 1944 г. згарэў пад час вызвалення горада Чырвонай арміяй ад нямецкіх захопнікаў. Яго рэканструкцыя пад рэзідэнцыю Гродзенскага абласнога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі канчаткова змяніла як знешні, так і ўнутраны выгляд Новага замка. Архітэктар М. Вараксін паспрабаваў надаць палацу ў стылі ракако рысы сталінскага ампіру. З гэтай мэтай да яго галоўнага ўвахода быў прыбудаваны ганак у выглядзе порціка з магутнымі калонамі, над купалам Авальнай залы быў узведзены шпіль з пяціканцовай зоркай, былі павялічаны памеры вокнаў другога паверха. Аздабленне інтэр'ераў было вырашана ў выглядзе ампірна-савецкай сімволікі (гірлянды, зоркі, барыльеф Леніна і г.д.). Іншыя моцна пашкоджаныя будынкі палацавага комплексу – маршалкоўская кухня, капліца – увогуле не аднаўляліся; былая каралеўская вайсковая канцылярыя была прыстасавана пад гараж. Першапачатковы выгляд захавалі толькі брама са скульптурнымі выявамі сфінксаў XVIII ст. У 1991 г. Новы замак быў перададзены установам культуры. У правым яго крыле была размешчана абласная навуковая бібліятэка ім. Я. Карскага, а ў цэнтральным корпусе і левым крыле – Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-

археалагічны музей. У выніку сёння Новы замак моцна адрозніваецца ад каралеўскага палаца XVIII ст., узведзенага згодна з праектам вышэй згаданых нямецкіх архітэктараў [6, с. 47]. Пасля таго, як у 1738–1742 гг. у Гродне быў пабудаваны новы каралеўскі палац, функцыі аналагічнай часткі замка кардынальна змяніліся, бо ён страціў ролю каралеўскай рэзідэнцыі, а ў афіцыйных дакументах і свядомасці насельніцтва ў хуткім часе набыў назву «Стары замак». Прадстаўнікі саксонскай дынастыі рэдка знаходзіліся ў Гродне, і ў адсутнасць караля замкі прыходзяць у заняпад. Аднак у адпаведнасці з пастановай канвакацыйнага сейма 1764 г. у ВКЛ была створана Скарбовая камісія, якая павінна была клапаціцца пра павелічэнне ўсімі магчымымі спосабамі паступленняў у казну. Месцам пасяджэнняў гэтай камісіі быў абраны Стары замак у Гродне, дзе таксама было запланавана размяшчэнне эканамічнага архіва. Таму дадзены дзяржаўны орган быў зацікаўлены ў падтрыманні Старога замка ў належным стане, што патрабавала правядзення ў ім неабходнага рамонту. Яму папярэднічала састаўленне па рашэнні Скарбовай камісіі ў 1767 г. падрабязнага інвентару замка з дакладным апісаннем памяшканняў і з адзнакамі пра тое, якога рамонту яны патрабуюць. Для працы над інвентаром быў запрошаны каралеўскі архітэктар і будаўнік, немец Іяган Георг Мёзер (Moeser) і палацавы бургграбі (адміністратар замка), імя якога не пазначана [10, с. 27–28]. На нашу думку, хутчэй за ўсё ім быў таксама немец Генрык Хасэ (Henryk Hasse), які ў 1769 г. меў аналагічную пасаду, як гэта вынікае з інвентару Старога і Новага замка гэтага года. Менавіта ён уласным подпісам пацвердзіў дакладнасць дадзеных, пазначаных у гэтым дакуменце [11]. За пільную працу па ўтрыманні парадку ў замку Скарбовая камісія прызначыла адміністратару замка плату ў памеры 1 600 злотых у год, якая павінна была выплачвацца дзвюма часткамі – у студзені і ліпені. Неабходна адзначыць, што свае абавязкі Г. Хасэ выконваў добрасумленна, і гэта было ацэнена вышэй названай камісіяй, якая сваім рашэннем ад 15 чэрвеня 1771 г. павялічыла адміністратару замка гадавую аплату да 1 800 злотых [10, с. 30]. Гэта пасада, яе назва, прозвішча выканаўцы – сведчанне плённага германскага ўплыву на замкавую культуру ВКЛ [12, с. 255–258].

Што тычыцца Мёзера, які жыў і працаваў у Гродне з 1738 г., то ў 1767 г. ён склаў таксама каштарыс на рамонт маста, муроў і стайняў у Старым замку, бо адказваў за правядзенне гэтых работ. У ім Мёзер дакладна паказаў, якія матэрыялы, у якой колькасці і па якім кошце патрэбны для рамонту [10, с. 28].

Смерць Аўгуста III у 1763 г. спрычынілася да закрыцця, створанай згодна з яго ўказам Будаўнічай калегіі ў Варшаве, куды ўваходзілі саксонскія архітэктары, якія павінны былі ажыццяўляць архітэктурна-будаўнічую дзейнасць у Рэчы Паспалітай. Пасля абрання каралём Станіслава Аўгуста адпаведна аднаму з яго загадаў будаўнічыя арганізацыі павінны былі падпарадкоўвацца новай Эканамічнай калегіі. У выніку нямецкія архітэктары, якія працавалі раней пры двары, пераключыліся на выкананне заказаў

мясцовай магнатэрыі. Пасля Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) маёмасць саксонскіх каралёў была перададзена Прусіі, а большасць немцаў – архітэктараў і іншых служачых – вярнулася ў Дрэздэн. У выніку закончылася шасцідзесяцігадовае праўленне двух саксонскіх каралёў, а з ім і актыўная творчая дзейнасць нямецкіх архітэктараў у Рэчы Паспалітай [8, с. 206].

Як бачна, больш за паўстагоддзе шматлікія нямецкія дойліды ажыццяўлялі па тым часе буйнамаштабную архітэктурна-будаўнічую дзейнасць у Гродне, у выніку якой была створана ў агульнаеўрапейскім мастацка-стылявым накірунку (часам у супрацоўніцтве з італьянскімі калегамі) значная высокамастацкая архітэктурная спадчына, якая сёння працягвае вызначаць у многім мастацкае аблічча і турыстычную прыцягальнасць гэтага беларускага горада.

ЛІТАРАТУРА


1. *Лазука, Б. А.* Гісторыя беларускага мастацтва : у 2 т. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2007. – Т. II : XVIII – пачатак XX стагоддзя. – 351 с.
2. *Калнін, В. В.* Архітэктура Яна Самуэля Бэкера / В. В. Калнін // Спадчына, 1998. – № 3–4. – С. 65–86.
3. *Кулагін, А. М.* Элітная архітэктура барока Беларусі ў агульнаеўрапейскім кантэксце / А. М. Кулагін // Барока ў беларускай культуры і мастацтве / Ін-т мастацва, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі ; навук. рэд. В. Ф. Шматаў. – Мінск, 1998. – С. 103–121.
4. *Зиневский, С.* Новый замок в Гродно строили в кризис [Электронны рэсурс] / С. Зиневский. – Рэжым доступу : http://grodnonews.by. – Дата доступа : 24.02.2018.
5. Гродненский Новый замок [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://planetabelarus.by/sights/1197-grodno-/city/522-grodnenskiy-novyy-zamok. – Дата доступу : 21.02.2018.
6. *Кітурка, Ю. В.* Крыніцы па гісторыі Гродзенскага каралеўскага палаца XVIII ст. / Ю. В. Кітурка // Краязнаўчыя запіскі : Матэрыялы міжнар. навук. канф. «Каралеўскія і вялікакняжацкія замкі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай», 22–23 вер. 2011 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей ; рэдкал. : К. В. Галота [і інш.]. – Гродна, 2012. – Вып. 8. – С. 47–51.
7. *Марозаў, В. Ф.* Гродзенская зала сеймаў / В. Ф. Марозаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал. : А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск, 1993. – С. 168.
8. *Кожар, Н. В.* Из истории немецко-белорусских связей в области архитектуры XVIII века / Н. В. Кожар // Германский и славянский миры: взаимовлияния, контакты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность) : Материалы междунар. науч. теор. конф. – Витебск, 2001. – С. 203–206.
9. *Чантурыя, У. А.* Гродзенскі каралеўскі палац / У. А. Чантурыя, А. М. Кулагін // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал. : А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск, 1993. – С. 173–174.

10. *Кітурка, І. Ф.* Гарадзенскі Стары замак у пачатку панавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага (па матэрыялах Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва) // Краязнаўчыя запіскі : Матэрыялы міжнар. навук. канф. «Каралеўскія і вялікакняжацкія замкі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай», 22–23 верасня 2011 г. / Гродз. дзярж. гіст.-археал. музей ; рэдкал. : К. В. Галота [і інш.]. – Гродна, 2012. – Вып. 8. – С. 27–35.
11. *Kowalczyk, J.* Palace I dwory późnobarokowe w miescie sejmowym Grodnie / J. Kowalczyk // Sztukaziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. / T-wo Nauk Katol. Uniw. Lubel. ; red. J. Lileyko. – Lublin, 2000. – S. 451–486.
12. *Кушнярэвіч, А.* Да праблемы ўплываў нямецкай готыкі на архітэктуру Беларусі і Літвы / А. Кушнярэвіч // Castrum, urbis et bellum : зб. навук. прац памяці Міхася Ткачова. – Баранавічы, 2002. – С. 253–263.

**Л. А. Осіпава**

## УДЗЕЛ МОЛАДЗІ Ў АДНАЎЛЕННІ МІНСКА Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД

За тры гады фашысцкай акупацыі беларуская зямля была страшна спустошана. Як і іншыя гарады, Мінск быў амаль поўнасцю разбураны. Тут былі знішчаны 5 975 жылых дамоў, або 70 працэнтаў даваеннага жыллёвага фонду. У горадзе засталося 19 прамысловых прадпрыемстваў, на якіх было занята толькі 4 працэнты даваенных рабочых. Бяздзейнічалі газаправод, каналізацыя, тэлеграфна-тэлефонная сувязь. Акупанты знішчылі і разрабавалі школы, дзіцячыя садкі, паліклінікі, культурна-асветніцкія ўстановы, будынкі Акадэміі навук, Белдзяржуніверсітэта, педагагічнага інстытута і іншых вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, бібліятэку імя Леніна і г.д. Вось такую карціну ўбачылі сапёры, якія падняліся на дах Дома ўраду пасля яго размініравання. Вакол ляжалі суцэльныя каробкі дамоў, пралёты лесвіц былі заваленыя шчэбнем. Цяжка было вызначыць нават контуры цэнтральных Савецкай і Пушкінскай вуліц. У раёне цяперашняга парку імя Янкі Купалы і плошчы Перамогі зелянелі абнесеныя дротам, іржавымі лыжкамі бульбяныя і капусныя палі. Прывакзальная плошча была пустынным полем. Горад праглядваўся з канца ў канец. Сярод развалін узвышаліся асобныя ўцалелыя будынкі, і толькі на драўляных ускраінах зелянелі сады і агароды, там жыла большасць выжыўшых мінчан. Астатнія жылі ў падвалах, прыстасаваных часовых збудаваннях, бамбасховішчах.

Такім чынам, неабходна было падняць з руін, аднавіць вуліцы і плошчы, паркі і скверы, жылыя дамы і школы, карпусы фабрык і заводаў, аднавіць выпуск прамысловай прадукцыі, так неабходнай для жыцця рэспублікі і фронту. Гэта трэба было рабіць былым партызанам і падпольшчыкам, жанчынам і старым – жыхарам вызваленага горада – усім

тым, хто па розных прычынах не быў мабілізаваны ў армію, якая працягвала пераможнае шэсце на Захад да Берліна, вызваляючы народы Усходняй Еўропы ад фашызму.

Яшчэ на вядомым партызанскім парадзе ў Мінску было аб'яўлена рашэнне ўрада: адразу пасля парада ўсім былым партызанам і воінам Чырвонай арміі, жыхарам Мінска і яго наваколля ўзяць у рукі ламы і кіркі, кельмы і рыдлёўкі і адрадзіць сталіцу рэспублікі – горад Мінск.

У звароце СНК БССР, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і ЦК КП(б) Беларусі паведамлялася: «Гэта цяжкая задача, але беларускі народ вырашыць яе ў самы кароткі тэрмін. Уся краіна, усе брацкія народы дапамагаюць і дапамогуць беларускаму народу хутчэй аднавіць разбураную немцамі гаспадарку. Аднавіць культурныя ўстановы і ліквідаваць вынікі нямецкай акупацыі».

Уся краіна дапамагала вызваленым раёнам Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі. У Мінск і іншыя гарады рэспублікі з Масквы і з Сібыры, Сярэдняй Азіі і Каўказа ішлі эшалоны з вуглём і хлебам, машынамі і таварамі першай неабходнасці. Адраджалася прамысловасць, наладжваўся гандаль, адкрываліся навуковыя і навучальныя ўстановы.

Яшчэ ішла вайна, партызаны ў часцях і злучэннях Чырвонай арміі імкнуліся да Кёнігсберга, Прагі, Берліна, а ў Мінску на пачатак 1945 года ўжо працавала звыш 20 прадпрыемстваў, прадукцыя якіх ішла і на фронт, і на задавальненне патрэб горада і рэспублікі. Прывакзальны раён Мінска да вайны з'яўляўся цэнтрам вышэйшых навучальных устаноў: тут працавалі Белдзяржуніверсітэт, медыцынскі, педагагічны інстытуты, інстытут народнай гаспадаркі. З усяго ўніверсітэцкага гарадка ўцалелі толькі два будынкі: мініяцюрная каробачка фізіка-матэматычнага факультэта БДУ (зараз зусім загубілася ў акружэнні новых вучэбных карпусоў. А, скажам, будынак педінстытута глыбіўся шэрымі грамадамі абрынутых сцен.

Нягледзячы на цяжкасці, установы вышэйшай адукацыі распачалі працу. Дзе і як? Студэнты пяці факультэтаў БДУ, напрыклад, бегалі на лекцыі з адной школы ў другую, а заняткі па фізкультуры праводзіліся на свежым паветры або ў спортзале, пад якую прыстасавалі памяшканне былой тыпаграфіі ў корпусе фізмата.

9 ліпеня ад Мінска наладзілі рух да самага заходняга пункта Беларусі. Брэст-Літоўская чыгунка ўжо магла без затрымкі прапускаць паязды на фронт. Гэта была галоўная лінія на Варшаву і далей на Берлін.

Прыгадаю некаторыя лічбы. Пры адступленні фашысты знішчылі ў рэспубліцы 4 тыс. км чыгуначных пуцей з агульнай працягласці ў 5,5 тыс. км. Гітлераўцы нават выкарысталі для гэтага пуцеразбуральнік – спецыяльнае прыстасаванне накшталт моцнага плуга. Яно гнула рэйкі, ламала шпалы і г.д. Было ўзарвана ці вывезена ў Германію 3,5 тыс. стрэлачных пераводаў. Пацярпелі ўсе без выключэння чыгуначныя слупы. Людзі заставаліся без жылля, без самага неабходнага. І калі ў 1944 г. усе прадпрыемствы Беларускай, Брэст-Літоўскай, Беластоцкай і Заходняй чыгунак своечасова падрыхтаваліся да зімы, гэта значыла, што яны выканалі першачарговыя работы па аднаўленні сваёй гаспадаркі.

Разам са злучэннямі Галоўнага ўпраўлення ваенна-аднаўленчых работ Наркамата шляхоў зносін працавалі беларускія чыгуначнікі, у тым ліку камсамольцы і моладзь, тыя, хто ў час фашысцкай акупацыі знішчаў чыгунку, разбураў чыгуначную сетку акупантаў, перашкаджаючы ваенным пастаўкам на фронт. Для шырокага разгортвання аднаўленчых работ неабходна было шмат будаўнічых матэрыялаў, якія можна здабыць з разбуранага горада, прыдатным было тое, што ўжо нельга было аднавіць.

Хутчэйшае аднаўленне Мінска можа быць паспяхова вырашана толькі пры актыўным і шырокім удзеле ў работах усяго працаздольнага насельніцтва горада, як працуючых на прадпрыемствах, ва ўстановах, так і непрацуючых.

Для ўліку асабістай працы грамадзян у аднаўленні Мінска ўводзіліся кніжкі адзінага ўзору з занясеннем у іх аб’ектаў аднаўлення, характару выконваемых работ і колькасці адпрацаваных гадзін. Кніжкі выдаваліся кожнаму грамадзяніну, які ўдзельнічаў у аднаўленні горада Мінска ў вольны ад асноўнай работы час.

У масавым нядзельніку 8 кастрычніка 1944 г. прынялі ўдзел 33 тыс. грамадзян. За адзін дзень склалі ў штабелі 1 316 тыс. цаглін, падрыхтавалі 2 050 кубаметраў шчэбню, сабралі 1 065 тон іншых будаўнічых матэрыялаў, ачысцілі 15 500 квадратных метраў плошчы, засыпалі ў варонкі 2 500 кубаметраў грунту. Яркай старонкай у гісторыі камсамола Беларусі з’явіўся заклік моладзі на будаўніцтва двух гігантаў беларускай індустрыі – трактарнага і аўтамабільнага заводаў.

Камсамольцы і моладзь прадпрыемстваў і навучальных устаноў г. Мінска звярнуліся да ўсіх камсамольскіх арганізацый і моладзі Беларусі з прапановай узяць шэфства над будоўлямі аўтамабільнага і трактарнага заводаў, якія будуць прадстаўляць гонар нашай рэспублікі і яе сталіцы – Мінска. Было вырашана зрабіць гэтыя будоўлі камсамольскімі, зрабіць справай гонару кожнага з нас, каб ужо ў 1948 г. беларускія аўтамашыны пачалі свой імклівы бег па дарогах краіны, а беларускія трактары аралі палі родных калгасаў.

На заклік камсамольцаў сталіцы першымі адгукнуліся маладыя патрыёты Маладзечаншчыны. Кліч «Мінск на новабудоўлі!» адзінадушна падхапілі юнакі і дзяўчаты Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і іншых абласцей. Да 2 ліпеня 1946 г. добраахвотнікі падалі больш за 5 500 заяў.

У пастанове, якая захоўваецца ў фондах Нацыянальнага архіва, паведамлялася: «Камсамол Беларусі, які праявіў сябе на працягу Айчыннай вайны самаадданым памочнікам КП(б) Беларусі ва ўсей яе рабоце па арганізацыі і кіраўніцтве партызанскай барацьбой беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў, павінен цяпер у вызваленых ад ворага раёнах узначаліць патрыятычны пад’ём моладзі, накіроўваючы ўсе сілы камсамольцаў і моладзі на аднаўленне савецкага жыцця ў гэтых раёнах, на ўсялякую дапамогу Чырвонай Арміі ў дасягненні канчатковай перамогі над ворагам…» [1, спр. 2, арк. 281].

Да вайны на Беларусі налічвалася больш за 13 000 школ, у якіх навучалася каля двух мільёнаў дзяцей. За тры гады акупацыі фашысцкія варвары спалілі і разбурылі большасць школьных будынкаў, разрабавалі маёмасць, знішчылі вучэбна-наглядныя дапаможнікі. Усенародная дапамога школе паспрыяла таму, што у самы кароткі тэрмін у рэспубліцы былі адноўлены звыш 11 000 школьных будынкаў, за парты якіх села 1 275 000 дзяцей.

Да канца 1947 г. у Мінску працавала 10 вышэйшых і 17 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, у якіх навучалася 13 500 юнакоў і дзяўчат. Перад імі стаялі вялікія і адказныя задачы па ўсебаковым навучанні і выхаванні савецкага студэнцтва.

Задавальняючы запатрабаванні народнай гаспадаркі краіны, у 1940 г. пачалі ствараццa навучальныя ўстановы працоўных рэзерваў для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых усіх неабходных для краіны масавых спецыяльнасцей. Пры гэтым улічваліся не толькі народна-гаспадарчыя задачы, але і перспектывы развіцця сацыялістычнай прамысловасці і інтарэсы абароны краіны. Ва Указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 кастрычніка 1940 г. былі вызначаны тры тыпы прафесіянальных навучальных устаноў: рамесныя вучылішчы, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага навучання (ФЗН). Навучэнцаў усіх навучальных устаноў дзяржаўных працоўных рэзерваў савецкі ўрад узяў на свае поўнае забеспячэнне. Напярэдадні вайны ў рэспубліцы працавала 40 школ ФЗН, 15 рамесных і 6 чыгуначных вучылішчаў, большасць іх пачала працаваць у Мінску і Мінскай вобласці.

На прамысловыя прадпрыемствы і будоўлі рэспублікі са школ і вучылішчаў сістэмы дзяржаўных працоўных рэзерваў у 1944–1945 гг. прыйшло 8 644 рабочых масавых прафесій.

Можна смела сказаць, што на аснове цэнтральнага плана, зацверджанага савецкім урадам у 1946 г., Мінск быў адноўлены як сучасны індустрыяльны цэнтр навукі, культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь. У плане будаўніцтва пасляваеннага Мінска захавана гістарычна складзеная сетка вуліц, у той жа час прадугледжаны мерапрыемствы па фарміраванні новага цэнтра горада і значнай рэканструкцыі галоўнай магістралі – Савецкай вуліцы – стварэнні на яе базе праспекта Ф. Скарыны, будаўніцтве прамысловых раёнаў сталіцы.

Новы Мінск з яго адроджанымі і нанова адбудаванымі заводамі і фабрыкамі, з яго ўтульнымі дамамі, шырокімі вуліцамі і плошчамі, упрыгожанымі зелянінай, тэатрамі і паркамі ўяўляе сабой сучасны горад сусветнага значэння.

Мінск правамерна носіць званне горада-героя. У яго аднаўленні і далейшым развіцці адыграла вялікую ролю моладзь Мінска і ўсёй Беларускай рэспублікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 63. Воп. 9.

**І. А. Саракавік**

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ВНУ БЕЛАРУСІ І ГЕРМАНІІ Ў 1970–1980-я гг.

Становішча ў еўрапейскім сацыялістычным лагеры 1950-х гадоў сведчыла, што кіраўніцтву Савецкага Саюза патрэбна было прымаць больш эфектыўныя меры, накіраваныя на ўмацававанне сацыялізму. Антысавецкія выступленні у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы (1953), у Польскай Народнай Рэспубліцы (1956) і асабліва ў Венгерскай Народнай Рэспубліцы, а пазней, у ЧССР (1968) і ў Польшчы (1970, 1978), прымушалі кіраўніцтва СССР шукаць разнастайныя шляхі супрацоўніцтва. У гады кіравання М. С. Хрушчова назіралася пэўнае зніжэнне міжнароднай напружанасці. СССР наладжваў кантакты з Югаславіяй, ФРГ, іншымі дзяржавамі. Быў ажыццёўлены першы ў гісторыі візіт кіраўніка Савецкага Саюза ў ЗША.

У сувязі з гэтым было вырашана ўключыць у працэс умацавання сацыялістычнай садружнасці не толькі дзяржаўна-палітычны ўзровень, але і народную дыпламатыю. Такім чынам, сустрэч і дагавораў на вышэйшым узроўні кіраўнікоў сацыялістычных дзяржаў было недастаткова. Патрабавалася далучыць да гэтай працы працоўныя, вучэбныя, турыстычныя, спартыўныя, маладзёжныя, навукова-творчыя і іншыя калектывы. Тады ўзніклі такія арганізацыі, як Камітэт маладзёжных арганізацый і Бюро міжнароднага моладзёжнага турызму «Спутник». Гэты працэс не абышоў і вышэйшыя навучальныя ўстановы, у тым ліку і Беларускай ССР.

Невыпадкова, што ў 1964 г. на аснове распараджэння № 1382-р Савета Міністраў БССР ад 25 верасня ў Міністэрстве вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР, утворанага пастановай № 545 Савета Міністраў БССР 22 жніўня 1959 г. [1, спр. 883, арк. 210–212], фарміруецца сектар, што каардынаваў працу з замежнымі навучэнцамі і наладжваў сувязь з замежнымі краінамі. З 1960 г. гэтымі пытаннямі займаўся толькі адзін інспектар па пытаннях навучання замежных студэнтаў і сувязях з замежнымі краінамі. Аднак павелічэнне колькасці замежных студэнтаў, якія навучаліся ў рэспубліцы, а таксама выезд савецкіх студэнтаў, выкладчыкаў і вучоных за мяжу спрычыніўся да таго, што ўжо праз год, 3 ліпеня 1965 г., Савет Міністраў БССР прымае пастанову № 352 аб пераўтварэнні ў гэтым Міністэрстве сектара па працы з замежнымі навучэнцамі і сувязях з замежнымі краінамі ў аддзел [2, спр. 765, арк. 163]. Адпаведныя новаўвядзенні адбываліся і ў вышэйшай школе, асабліва ў політэхнічным інстытуце, Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі і г.д., у структуры якіх узнікалі падраздзяленні па працы з замежнымі студэнтамі і сувязях з замежнымі ўстановамі вышэйшай адукацыі.

Менавіта з канца 50-х, а яшчэ больш актыўна з сярэдзіны 60-х гг. шырацца кантакты партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый і падначаленых ім структур з замежнымі краінамі, у першую чаргу – з сацыялістычнымі, а з прыняццем Хельсінскага пагаднення 1975 г. – і капіталістычнымі. З апошнімі былі сувязі і раней, хоць не такія значныя. Гэта яскрава бачна і на прыкладзе супрацоўніцтва БДУ імя У. І. Леніна з навучальнымі ўстановамі Германіі.

Са справаздачы БДУ за 1970 г. вядома, што ўніверсітэт накіраваў за мяжу 197 чалавек, у тым ліку 64 навуковых супрацоўніка, уключаючы выкладчыкаў, 108 студэнтаў на практыку і 25 студэнтаў будаўнічых атрадаў. З ліку прафесарска-выкладчыцкага складу і навуковых супрацоўнікаў выязджалі: у сацыялістычныя краіны – 56 чалавек, капіталістычныя – 5, краіны, якія сталі на шлях развіцця, – 3 чалавекі. 8 чалавек удзельнічалі ў міжнародных канферэнцыях, сімпозіумах і кангрэсах, 6 – праходзілі стажыроўку ў сацыялістычных і капіталістычных дзяржавах, 50 – чыталі лекцыі, заключалі дагаворы аб супрацоўніцтве, праходжанні практыкі.

На той час БДУ меў сталыя дагаворы аб супрацоўніцтве з Енскім універсітэтам імя Ф. Шылера, Сафійскім і Люблянскім універсітэтамі, пастаянна абменьваўся навуковымі супрацоўнікамі і студэнтамі з Гальскім, Варшаўскім, Будапешцкім, Карлавым (Прага) універсітэтамі і Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школай [3, спр. 1083, арк. 117, 118].

Прыгадаем канкрэтныя прыклады такіх кантактаў. У красавіку – маі 1970 г. загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў прафесар В. Д. Ткачоў чытаў лекцыі ў Енскім універсітэце, таксама ён выступаў з навуковымі дакладамі перад выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі Берліна і Дрэздэна. У прыватнасці, прачытаў 10 лекцый па спецыяльным курсе «Избранные главы физики полупроводников», зрабіў даклад на пленарным пасяджэнні канферэнцыі фізічнага таварыства ГДР у Дрэздэне, прачытаў дзве лекцыі для ўдзельнікаў летняй школы фізікаў ГДР у г. Катцхоцце. Падчас наведвання ГДР наладзіў цесныя кантакты з вядучымі фізікамі Енскага ўніверсітэта – прафесарамі Альбрэхтам і Мюлерам [3, арк. 120].

У гэтым же годзе ў навуковыя камандзіроўкі на розны тэрмін выязджалі да Енскага ўніверсітэта намеснік дэкана фізічнага факультэта А. А. Лабуда, дацэнт кафедры фізічнай хіміі В. А. Лішнеўскі; старшыя выкладчыкі нямецкай мовы кафедры замежных моў філфака Л. А. Снегірова, Л. К. Лысякова (наведалі ўніверсітэт імя М. Лютэра ў г. Гале), а таксама прафесар В. М. Сікорскі [3, арк. 121–122, 129–130].

Працэс супрацоўніцтва не быў, зразумела, аднабаковым. У 1970 г. БДУ наведалі 38 навуковых супрацоўнікаў з сацыялістычных краін, у тым ліку з ГДР. У кастрычніку – лістападзе згодна з планам аб супрацоўніцтве на фізічным факультэце знаходзіўся доктар Ніколаус Саліе з Енскага ўніверсітэта. Ён пазнаёміўся з працай кафедраў тэарэтычнай фізікі, электрафізікі і фізічнай оптыкі, прачытаў даклад «О применении пространства Косера к космогонии общей теории относительности».

Прафесар гэтага ж універсітэта Фельца цікавіўся арганізацыяй навукова-даследчай працы на кафедрах аналітычнай хіміі, будаўніцтва рэчыва, неарганічнай хіміі, фізічнай і калоіднай хіміі, а таксама ў лабараторыі шкла Беларускага політэхнічнага інстытута. Бакамі была дасягнута дамоўленасць аб тым, што кафедра фізічнай хіміі БДУ прымае спецыялістаў з Еменскага ўніверсітэта для знаёмства з метадамі колькаснай тэрмаграфіі тэрмінам на адзін-два месяцы і спецыяліста для вывучэння метадаў вырошчвання монакрышталёў з дапамогаю нізкатэмпературнай плазмы тэрмінам на 3–4 месяцы.

Доктар Дытэрэ Фрыке знаходзіўся на гістарычным факультэце. Прачытаў шэраг лекцый для студэнтаў старэйшых курсаў аб гісторыі германскага народа, дзейнасці Енскага ўніверсітэта, рэформе вышэйшай школы ў ГДР, а таксама «О стратегии и тактике германской монополистической буржуазии в борьбе между социализмом и империализмом».

З Дрэздэна ў БДУ прыязджалі дырэктар Дрэздэнскай бібліятэкі Б. Бургемейстэр і навуковы супрацоўнік Г. Герман, якія азнаёміліся з працай універсітэцкай бібліятэкі і Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна [3, арк. 118, 132–134, 136.].

У папярэднія гады супрацоўніцтва ў асноўным заключалася ў тым, каб пашырыць асабістыя кантакты, даведацца пра стан навуковай і вучэбнай працы кафедраў універсітэта БДУ і секцый універсітэтаў ГДР. З цягам часу сувязі паглыбляліся: апрача чытання лекцый ажыццяўляліся шматмесячныя стажыроўкі, сумесна праводзіліся эксперыменты, быў арганізаваны абмен навуковым абсталяваннем, вялася праца над навуковымі тэмамі.

Развіваліся кантакты і па ранейшых накірунках. Так, у 1973 г. у канферэнцыі, прысвечанай Дням савецкай навукі і тэхнікі ў ГДР, якая адбывалася ў Енскім універсітэце, прыняла ўдзел дэлегацыя БДУ на чале з дэканам гістарычнага факультэта І. О. Царук. Вучоныя з Беларусі выступілі з дакладамі [3, спр. 1326, арк. 147].

На працягу дзесяці месяцаў на стажыроўцы у Берлінскім універсітэце імя Гумбальта знаходзіўся старшы выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў БДУ Л. С. Дудзінскі. Ён вывучаў сацыяльную структуру насельніцтва ГДР, методыку і тэхніку сацыяльных даследаванняў, а таксама крытыку буржуазнай (заходнегерманскай) сацыялогіі па дадзенай праблеме [Там жа, арк. 149].

Асабліва цесныя кантакты склаліся з Енскім універсітэтам. На аснове Дагавора аб узаемным супрацоўніцтве кафедра фізікі цвёрдага цела БДУ сумесна з аддзелам іонаметрыі Енскага ўніверсітэта вяла навуковую працу згодна з тэмай «Комплексное исследование ионнолегированных слоев ионнометрическими, оптическими и электроннографическими методами». У трэцім квартале 1973 г. было пачата сумеснае даследаванне «Подкорковых слоев в образцах кремния с целью исследования релаксации эффектов ионной бомбардировки» [Там же, арк. 150].

Два тыдні знаходзіўся ў Енскім універсітэце загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела БДУ дацэнт Г. А. Гуманскі з мэтаю правядзення сумесных навуковых даследаванняў і перадачы ўзаемнай інфармацыі пра ход прац сумеснай тэматыкі, якія прадугледжаны рабочай праграмай на 1972–1973 гг. Ён жа пабываў у секцыі фізікі ўніверсітэта імя М. Лютэра ў г. Гале і сумесна з яе кіраўніком прафесарам Бруммерам выпрацаваў пагадненне аб сумесным даследаванні ў галіне іоннай імплантацыі і аналітыкі канцэнтрацый прымясі і рэальнай структуры тэхнічна важных цвёрдых целаў. Быў прадугледжаны таксама абмен вопытам у галіне вывучэння анігіляцыі пазітронаў у сувязі з электроннай структурай паўправаднікоў і металаў.

З Енскім універсітэтам падтрымлівалі цесныя сувязі і іншыя структурныя адзінкі ўніверсітэта, у тым ліку кафедры агульнай фізікі, грамадскіх і гістарычных навук. Характэрна, што на гэты час прыходзіцца і новы від супрацоўніцтва – распрацоўка сумесных манаграфій: «Ленинское гносеологическое наследие и современность», а таксама «Интернациональные традиции совместной борьбы германского рабочего класса и трудящихся СССР» [3, спр. 1326, арк. 152].

Быў наладжаны абмен дэлегацыямі. 20–27 лістапада 1975 г. юрыдычны факультэт БДУ наведала дэлегацыя навуковых супрацоўнікаў-юрыстаў Акадэміі дзяржавы і права ГДР (г. Патсдам). У яе складзе былі 11 чалавек: загадчык кафедры дзяржаўнага права ГДР прафесар Д. Хезель, загадчык кафедры дзяржаўнага права сацыялістычных краін доктар В. Лунгвіц, загадчык кафедры дзяржаўнага права буржуазных краін доктар І. Міссевіц, сакратар партыйнай арганізацыі САПГ выкладчык В. Хафельман, старшыня прафсаюзнай арганізацыі выкладчык Г. Стробах, выкладчыкі і асістэнты Г. Райнварт, В. Штернкомф, Г. Клауер, В. Ленц, Б. Бакгауз і Г. Вілль. Пад час іх знаходжання адбылося сумеснае пасяджэнне з прадстаўнікамі кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва БДУ. Былі заслуханы і абмеркаваны навуковыя даклады і паведамленні, а таксама інфармацыя аб асноўных кірунках навуковых даследаванняў бакоў. Адбываўся і абмен вопытам вучэбна-метадычнай і навуковай дзейнасці. Шэраг членаў дэлегацыі прысутнічалі на лекцыі дацэнта В. П. Серабраннікава. У сваю чаргу прафесар Д. Хезель прачытаў для студэнтаў першага курса лекцыю «Государственный строй ГДР». Была праведзена сустрэча дэлегацыі з прафесарамі і выкладчыкамі юрыдычнага факультэта. У ходзе наведвання Беларусі яны мелі сустрэчы з кіраўнікамі выканаўчых камітэтаў Мінскай вобласці, г. Мінска і Фрунзенскага раёна г. Мінска. Па выніках іх знаходжання ў Мінску была прынята праграма навуковага супрацоўніцтва кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва БДУ і кафедраў Акадэміі дзяржавы і права пры Савеце Міністраў ГДР [Там жа, спр. 1520, арк. 32–33].

З кожным годам супрацоўніцтва паглыбляецца: ад агульнага знаёмства бакі пераходзілі да дзелавых кантактаў, якія прыносілі ім карысць. У верасні – кастрычніку 1975 г. БДУ наведалі навуковыя спецыялісты з Енскага ўніверсітэта доктар Гергард Геске, Гебер Рудольф, Вернер Веша і Карл

Гесля. Доктар Г. Геске і інжынер Г. Рудольф, супрацоўнікі лабараторыі бэтатронаў нямецкага ўніверсітэта, прыбылі з мэтаю ўсталявання на кафедры фізікі цвёрдага цела малагабарытнага імпульснага бэтатрона. Яго перадалі ў падарунак БДУ для правядзення сумесных даследаванняў па методыцы, распрацаванай у беларускім універсітэце. Амаль паўмесяца нямецкія калегі праводзілі наладку і пуск прывезенага прыбора. Азнаёміліся з лабараторыямі фізічнага факультэта БДУ, наведалі аддзел радыялогіі высокіх энергій НДІ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя БССР.

Доктар Геске не толькі пазнаёміў супрацоўнікаў кафедры з шэрагам асаблівасцей установкі і прыёмаў працы з бэтатронам, але і распрацаваў, а таксама передаў кафедры праект і разлікі для далейшага ўдасканалення бэтатрона і сістэмы вывядзення электроннага пучка.

Спецыяліст Вернер Веш праходзіў у БДУ двухмесячную стажыроўку на базе лабараторыі оптыкі паўправаднікоў і групы аптычных уласцівасцей іоналегіраваных матэрыялаў НДІ прыкладных фізічных праблем і кафедры фізікі паўправаднікоў. Выканаў вымярэнні на прывезеных ім у якасці ўзораў прыладах і авалодаў шэрагам методык пад кіраўніцтвам дацэнта В. П. Дабрэго і малодшага навуковага супрацоўніка А. В. Мудрога.

Доктар Карл Гесля, намеснік загадчыка аддзела іонаметрыі з Енскага ўніверсітэта і кіраўнік групы тэорыі іоннага легіравання, знаёміўся з усім комплексам даследавання іоналегіраванных пластоў паўправадніковых матэрыялаў, якія ажыццяўляліся на кафедрах фізікі паўправаднікоў і фізікі цвёрдага цела БДУ, а таксама ў адпаведных лабараторыях НДІ ПФП. Ён сустракаўся з прафесарам В. Д. Ткачовым і дацэнтам Г. Гуманскім для выпрацоўкі пашыранай праграмы сумесных даследаванняў на 1975–1977 гг. [3, спр. 1520, арк. 43–44].

Навуковае супрацоўніцтва дапаўнялася абменамі груп, студэнты якіх праходзілі вытворчую практыку. Напрыклад, у 1975 г. у Енскім універсітэце праходзілі практыку па 10 студэнтаў філолагаў, хімікаў, фізікаў і матэматыкаў. Усяго па 40 чалавек з аднаго і другога боку. У Гальскім універсітэце імя М. Лютэра – па 10 фізікаў і біёлагаў.

У 2010 г. выйшла ў свет манаграфія У. Ляхоўскага, які, разглядаючы развіццё школьнай адукацыі ў перыяд Першай сусветнай вайны, паказаў вынікі нямецкай адукацыйнай палітыкі на беларускіх землях і становішча, у якім знаходзілася школьніцтва напярэдадні польскага наступлення. Трэба адзначыць зроблены аўтарам грунтоўны аналіз культурна-асветніцкай дзейнасці беларускіх грамадска-палітычных арганізацый і асобных дзеячаў ва ўмовах нямецкай акупацыі. На думку У. Ляхоўскага, развіццё беларускіх школ адбывалася дзякуючы ініцыятыве беларускай інтэлігенцыі. Першыя беларускія школы арганізоўваліся беларускімі дзеячамі без палітычнай і фінансавай падтрымкі нямецкай акупацыйнай улады. Пры гэтым кіруючыя колы не перашкаджалі беларускай школьнай справе, таму што гэта не супярэчыла іх геапалітычным інтарэсам у краі. Пазней акупацыйная ўлада згадзілася на стварэнне масавых беларускамоўных казённых школ у якасці «заслоны» для спынення польскага нацыяналізму на беларускія землі [9, с. 129]. У. Ляхоўскі звярнуў увагу на складанае пытанне аб колькасці беларускіх школ падчас нямецкай акупацыі. Ён зрабіў выснову аб тым, што пры фінансавай падтрымцы кайзераўскай улады з кастрычніка 1916 г. па красавік 1918 г. колькасць казённых школ на акупаванай заходнебеларускай тэрыторыі ўзрасла з 3 да 89. Пры гэтым аўтар крытычна прааналізаваў навуковыя працы, у якіх, на яго думку, падаецца завышаная колькасць беларускіх школ. У большасці з гэтых прац выкарыстоўвалася інфармацыя з мемарандумаў беларускіх нацыянальных арганізацый, якія накіроўваліся ў адрас урадаў краін Еўропы і Паўночнай Амерыкі, а таксама розных міжнародных арганізацый. У. Ляхоўскі сцвярджае, што «завышаная колькасць беларускіх школ у час кайзераўскай акупацыі выкарыстоўвалася дзеячамі беларускага руху як фактар ціску на польскія органы акупацыйнай улады, каб дабіцца ад апошніх прызнання права на існаванне беларускамоўнай асветы на заходнебеларускіх землях».

У 2003 г. выйшла грунтоўная манаграфія, прысвечаная дзейнасці ГУУЗ, у якой Я. Героўска-Калаўр паказала асаблівасці практычнага ажыццяўлення палітыкі польскай улады на занятай у час польска-савецкай вайны тэрыторыі, адлюстравала арганізацыйную структуру і асноўныя этапы дзейнасці польскай адміністрацыі. Асобны раздзел прысвечаны праблемам

школьнай адукацыі на беларускіх землях. У ім аўтар прааналізавала адукацыйную палітыку польскай улады, зрабіўшы акцэнт на адносінах да беларускай адукацыі. Навуковая пазіцыя даследчыцы грунтуецца на тым, што адукацыйная палітыка польскіх улад на занятай тэрыторыі Беларусі канцэптуальна зыходзіла з федэралісцкай канцэпцыі Ю. Пілсудскага. Галоўнай мэтай польскай адміністрацыі ў галіне адукацыі аб'яўлялася імкненне да арганізацыі школ згодна з інтарэсамі насельніцтва розных нацыянальнасцей. Я. Героўска-Калаўр падкрэслівала, што на практыцы палякі не забаранялі нацыянальныя школы, але і не настойвалі на іх адкрыцці. Беларускае насельніцтва цягнулася да рускіх і польскіх школ і не было зацікаўлена ў адукацыі на беларускай мове ў той ступені, як гэта падавала беларуская эліта. Даследчыца выказала думку аб тым, што менавіта дзейнасць беларускіх нацыянальных прадстаўнікоў па адкрыцці беларускіх школ парушала дэмакратычныя прынцыпы, вызначаныя ў Віленскай адозве кіраўніка Польскай дзяржавы. Развіццё беларускіх школ замаруджвалі не столькі мясцовыя польскія чыноўнікі, колькі беларускія дзеячы, для якіх «пытанне аб беларускіх школах фактычна было пытаннем аб грашовых сродках» [10, s. 213, 220].

Найбольш значнай сярод сучасных напрацовак з'яўляецца манаграфія польскай даследчыцы Дароты Міхалюк «Беларуская Народная Рэспубліка 1918–1920: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці». У 2015 г. праца была перакладзена на беларускую мову. Аўтар дэталёва прааналізавала прычыны расколу беларускага нацыянальнага руху, вызначыла пазіцыі розных яго плыняў. З даследавання вынікае, што польская ўлада не падтрымлівала незалежніцкія памкненні беларусаў, а іх надзеі на ўтварэнне дзяржавы выкарыстоўвалі ва ўласных мэтах. Аднак палякі не хацелі, каб беларускія палітыкі шукалі падтрымкі ў Савецкай Расіі, да таго ж не было вырашана пытанне польскай усходняй мяжы. Даследчыца лічыць, што праблема беларуска-польскіх адносін заключалася ва ўзаемным недаверы і няшчырасці дыскусій. Гэта выразна праявілася ў лаяльнасці да беларускай мовы і адукацыі на Міншчыне. Разам з тым на Віленшчыне і Гродзеншчыне са 150 беларускіх школ, якія дзейнічалі падчас нямецкай акупацыі, засталося толькі 20. Польская ўлада зачыніла гімназіі ў Будславе, Гродне, а ў Слуцку і Вільні абмежавала іх дзейнасць [11, с. 425]. Падагульняючы свае высновы, Д. Міхалюк сцвярджае, што, калі б у беларускім нацыянальным руху не адбылося расколу, ён меў бы большую сілу і магчымасць дасягнуць сваіх мэт, калі і не ў справе дзяржаўнай незалежнасці, то абавязкова ў сферы асветы.

Такім чынам, аналіз гістарыяграфіі сведчыць аб тым, што акупацыйныя ўлады выкарыстоўвалі беларускую школу ў якасці культурна-ідэалагічнага інструмента барацьбы супраць расійскага (бальшавіцкага) уплыву, а таксама каб адцягнуць увагу беларускіх лідараў ад дзяржаватворчых працэсаў. У час нямецкай акупацыі на тэрыторыі Беларусі актуалізаваліся нацыянальныя

і дзяржаватворчыя пытанні. Дзякуючы актыўнасці беларускіх нацыянальных арганізацый, з дазволу кайзераўскай улады працавала больш за 300 беларускіх школ. Пры дапамозе беларускай адукацыі акупацыйная ўлада вяла барацьбу з польскім уплывам. Вельмі падобная сітуацыя паўтарылася ў час польскай акупацыі. Пры дапамозе ўступак у сферы адукацыі польская ўлада імкнулася абыйсці пытанні аб беларускай дзяржаўнасці. Колькасць беларускіх школ павялічвалася за кошт рэарганізацыі рускіх школ. Можна сцвярджаць, што падтрымка беларускіх школ з боку польскай улады была зроблена для таго, каб пазбавіць мясцовае насельніцтва рускага (бальшавіцкага) уплыву. Галоўнае адрозненне заключалася ў адносінах акупацыйнай улады да беларускіх школ. Для польскай улады было прынцыпова важна, каб у беларускіх школах былі настаўнікі, якія б выкладалі на беларускай мове, а таксама былі бы беларускамоўныя прадметы, падручнікі і г.д. У час нямецкай акупацыі ў большасці беларускіх школ прадметы выкладаліся на рускай альбо выкарыстоўваліся беларуская і руская мовы.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Bronowski, S.* Państwo polskie a kwestja białoruska / S. Bronowski. – Warszawa : Tow. Obrony Kresów, 1919. – 19 s.
2. *Луцкевіч, А. І.* Польская акупацыя ў Беларусі / А. І. Луцкевіч. – Мінск : Полымя, 1992. – 19 с.
3. *Srokowski, K.* Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Kraków : Gebethner i Wolff, 1924. – 56 s.
4. Кароткі нарыс беларускага пытання. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2009. – 396 с.
5. *Elski, S.* Sprawa białoruska / S. Elski. – Warszawa, 1931. – 105 s.
6. *Ільюшын, І. М.* Народная асвета ў Беларускай ССР / І. Ільюшын, С. Умрэйка. – Мінск : Дзяржвучпедвыд М-ва асветы БССР, 1957. – 358 с.
7. Дабальшавіцкія пачаткі беларускага школьніцтва // Бацькаўшчына. – 1960. – 25 снеж. – С. 3.
8. Иностранная интервенция в Белоруссии, 1917–1920 / И. М. Игнатенко [и др.] ; отв. ред. И. И. Минц. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 242 с.
9. *Ляхоўскі, У.* Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі (1915–1918 г.) / У. Ляхоўскі. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2010. – 340 с.
10. *Gierowska-Kałłaur, J.* Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lut. – 9 wrześ. 1920) / J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa : Neriton, Inst. Historii PAN, 2003. – 447 s.
11. *Міхалюк, Д.* Беларуская Народная Рэспубліка 1918–1920 : ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці / Д. Міхалюк ; навук. рэд. С. Рудовіч ; пер. з пол. мовы А. Пілецкі. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 496 с.

**А. Г. Цымбал**

# НАЦЫЯНАЛЬНА-КАНФЕСІЙНАЯ СТРУКТУРА НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1919–1939) У АДЛЮСТРАВАННІ ПЕРАПІСАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА: МІЖВАЕННАЯ ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Заходнебеларускія тэрыторыі ў складзе Польшчы ўяўлялі шматнацыянальны рэгіён, дзе пражывалі беларусы, палякі, украінцы, рускія, літоўцы, яўрэі, татары і інш. Насельніцтва характарызавалася рознай ступенню развіцця нацыянальнай ідэнтычнасці, адрознівалася як на ўзроўні мовы, так і рэлігійна. Былі прадстаўлены групы з дастаткова сфарміраванай самасвядомасцю (украінцы, літоўцы), але прысутнічалі і жыхары, сярод якіх працэсы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі не былі завершаны.

Нацыянальнае пытанне было галоўным у палітыцы польскіх улад. Яно закранала як грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае, так і культурнае жыццё рэгіёна, вызначала мэты дзейнасці дзяржавы і мясцовай адміністрацыі ва ўсіх сферах: ад арганізацыі школьнай справы, да ажыццяўлення аграрнай рэформы. У сувязі з гэтым цікавым уяўляецца пытанне аб інтэрпрэтацыях у міжваеннай польскай гістарыяграфіі дадзеных перапісаў насельніцтва Польшчы адносна нацыянальна-канфесійнай структуры насельніцтва.

Агульнавядомымі з’яўляюцца польскія перапісы насельніцтва 1921 і 1931 гг., менш увагі даследчыкаў прыцягваў перапіс, праведзены акупацыйнай часовай адміністрацыяй Цэнтральнай управай усходніх зямель (ЦУУЗ) у 1919 г. на так званых Усходніх землях, акупаваных польскімі войскамі. Нацыянальна-канфесійны падзел насельніцтва выглядаў наступным чынам: з 3 846 620 чалавек, згодна з перапісам 1 345 377 (35 %) каталікі, 1 982 893 (51,5 %) – праваслаўныя, 462 078 (12 %) – іўдзеі, 56 272 (1,5 %) іншыя. Нацыянальная структура выглядала так: 1 218 769 (31,7 %) – палякі, 1 641 911 (42,9 %) – беларусы, 114 595 (3 %) – літоўцы, 392 580 (10,2 %) – яўрэі, 191 981 (5 %) – «тутэйшыя», 276 757 (7,2 %) – іншыя (рускія, русіны, татары, хто не падаў нацыянальнасць і інш.) [1, s. 26–27]. Вядомыя польскія статыстыкі Т. Штурм дэ Штрэм і В. Вакар на падставе дадзеных перапісу падрыхтавалі карту нацыянальных адносін на землях, падпарадкаваных ЦУУЗ [2]. Кіраўнік ЦУУЗ Е. Асмалоўскі – адзін з першых, хто пакінуў заўвагі пра перапіс, – пісаў, што галоўная мэта праведзенага мерапрыемства прадстаўленне мясцовага насельніцтва як несвядомай, у нацыянальным плане, масы, зрабіўшы выключэнне для палякаў. Такое бачанне беларускіх зямель было ў Ю. Пілсудскага і адлюстроўвала погляды амаль ўсяго польскага грамадства [3, s. 650]. Аналагічна характарызаваў перапіс і польскі даследчык Я. Ромер, які адзначаў вялікую карэляцыю паміж веравызнаннем і нацыянальнасцю ў насельніцтва. Ён развіваў думку пра ўплыў у рэгіёне дзвюх цывілізацый – заходняй і ўсходняй. Першая вызначалася граніцай ад Гродна да Дынабурга, а другая – усходнім Палессем і р. Беразіной. Паміж гэтымі тэрыторыямі былі землі, куды, згодна з яго меркаваннем, цывілізацыя

не дайшла ўвогуле, а таксама дзе насельніцтва не магло акрэсліць сваю нацыянальнасць. Датычылася гэта Ашмянскага і Кобрынскага паветаў, насельніцтва якіх вызначала сябе як «тутэйшыя» [1, s. 8].

Вынікі перапісу атрымалі станоўчую ацэнку ў дэмографаў таго часу. Высокую верагоднасць перапісу адзначаў кіраўнік Статыстычнага бюро ЗША Э. Дзюранд [Там жа].

Наступны перапіс насельніцтва адбыўся 30 верасня 1921 г. Ён утрымліваў два пытання, якія датычыліся нацыянальнага самавызначэння: як і ў перапісе 1919 г. было пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці, а таксама аб роднай мове, пад якой разумелася мова ранняй маладосці. Цікавіла перапісчыкаў і канфесійная прыналежнасць насельніцтва.

Дыскусіі вакол перапісу разгарнуліся яшчэ на стадыі яго падрыхтоўкі. Х. Гросман задаваўся пытаннем, што павінен ахопліваць перапіс: фактычнае насельніцтва, ці тое, якое стала пражывае. Праект перапісу прадугледжваў апісанне выключна фактычнага насельніцтва, якое ў дадзены момант знаходзілася на тэрыторыі Польшчы [5, s. 98–103].

Згодна з перапісам нацыянальная структура ўсходніх ваяводстваў выглядала наступным чынам: асноўныя нацыянальныя групы Беластоцкага ваяводства: палякі – 1 004 370 чалавек, беларусы – 119 392, яўрэі – 162 912. Канфесійна насельніцтва падзялялася на каталікоў – 894 227 чалавек, праваслаўных – 197 392, евангелістаў – 13 075, іўдзеяў – 193 963 [6, s. 5–6]. На Віленскай зямлі (Браслаўскі, Дунілавіцкі, Дзісенскі і Вілейскі паветы) налічвалася 222 065 палякаў, 225 326 беларусаў, 18 496 яўрэяў, 6 598 літоўцаў і інш. Канфесійная структура была прадстаўлена 200 666 рыма-каталікамі, 230 430 праваслаўнымі, 27 935 іўдзеямі, 16 017 стараабрадцамі і іншымі больш дробнымі па колькасці веравызнаннямі [7, s. 8–9]. Нацыянальна-канфесійная структура Навагрудскага ваяводства: палякі – 444 484, беларусы – 310 352, яўрэі – 56 174, літоўцы – 9 801 і інш. Каталікі – 324 429, праваслаўныя – 421 529, іўдзеі – 74 334 і інш. [8, s. 52]. У Палескім ваяводстве налічылі палякаў – 214 052, беларусаў – 375 220, русінаў (украінцаў) – 156 142, «тутэйшых» – 38 565, яўрэяў – 91 251 і інш. Праваслаўных было 697 373, каталікоў – 68 698, іўдзеяў – 110 639, евангелістаў – 3 804 і інш. [9, s. 10–11]. Такім чынам, колькасць беларусаў на паўночна-ўсходніх землях Польшчы склала каля 1 030 тыс., палякаў – каля 1 885 тыс., яўрэяў – 328 тыс., украінцаў – 156 тыс., «тутэйшых» – 38,5 тыс. Канфесіі былі прадстаўлены наступным чынам: праваслаўныя – 1 547 тыс., каталікі – 1 487 тыс., іўдзеі – 406 тыс. і інш.

Практычна адразу пасля завяршэння перапіс спрычыніўся да крытыкі навукоўцаў. Адзін з вядомых даследчыкаў польскіх перапісаў прафесар Варшаўскага ўніверсітэта і суарганізатар Галоўнай статыстычнай управы Польшчы Л. Кшывіцкі сцвярджаў, што нават час перапісу быў абраны няўдала, бо ішлі яўрэйскія святы, у выніку традыцыйна настроеная частка грамадства адмовілася ўдзельнічаць у перапісе, што ў выніку паспрыяла таму, што і хрысціяне адмовіліся перапісвацца. На гэты ж час прыпадалі

палявыя работы, многія жыхары адсутнічалі дома. Згодна з яго ацэнкамі, вельмі складанымі былі ўмовы ажыццяўлення перапісу, асабліва ва ўсходніх ваяводствах, дзе не хапала нават транспарту для перапісчыкаў. Перашкаджалі хваробы, эпідэмія тыфу, адсутнасць у насельніцтва дакументаў, якія былі знішчаны пад час вайны. Яшчэ толькі фарміраваліся гмінныя ўлады, якія нават не мелі поўнага пераліку населеных пунктаў. Л. Кшывіцкі адзначаў, што насельніцтва, асабліва былой Расійскай імперыі, з вялікім недаверам паставілася да перапісу, бо лічыла, што ён патрэбны для вызначэння падаткаў [10, s. 133]. Падкрэслівалася, што на ўсходзе Польшчы перапіс прайшоў спакойна: «славутая пасіўнасць беларусаў выявілася ў поўнай меры» [Там жа, s. 134]. На падставе аналізу пратаколаў перапісу Л. Кшывіцкі адзначаў, што ва ўсходніх ваяводствах знаходзілася вялікая колькасць насельніцтва, якая па розных прычынах ухілялася ад рэгістрацыі і перапісу, у асноўным гэта былі тыя, хто прыехаў з Расіі. Аналізуючы менавіта нацыянальна-канфесійную структуру, аўтар адзначаў, што канфліктаў пры вызначэнні гэтага пытання практычна не было, што пацвярджалася невялікай колькасцю паданых пратэстаў і скаргаў на дзейнасць перапісчыкаў. Нізкая самасвядомасць насельніцтва стала прычынай для атаясамлення нацыянальнасці і веравызнання. Для Л. Кшывіцкага перапіс 1921 г. і адлюстраваная ў ім нацыянальная структура адпавядалі рэчаіснасці. Абгрунтоўваў ён гэта масавай агітацыяй, распачатай усімі нацыянальнымі меншасцямі, якія імкнуліся паказаць сваю значнасць. Украінцы ўвогуле часткова байкатавалі перапіс, але ў цэлым у паўночна-ўсходніх ваяводствах Польшчы ў пратаколах не згадвалася пра моцную агітацыю нацыянальнага характару; толькі ў адной гміне агітавалі за паданне беларускай нацыянальнасці, а ў Косаўскім павеце ўся грамада пастанавіла запісацца палякамі [Там жа, s. 139–142]. Перапіс 1921 г. стаў моцным стымулам для развіцця нацыянальнай самасвядомасці нацыянальных меншасцей, асабліва ўкраінцаў і літоўцаў, агітацыя якіх насіла вельмі востры антыпольскі характар, а таксама немцаў і яўрэяў, якія прытрымліваліся легальных сродкаў дзейнасці. Менавіта гэтая акалічнасць, на думку Л. Кшывіцкага, не дазваляла сцвярджаць аб завышэнні колькасці палякаў і прымусовым запісе прадстаўнікоў меншасцей у польскую нацыянальнасць, акрамя як па іх жаданні.

Іншай думкі прытрымліваўся К. Сракоўскі, які настойваў на неабходнасці істотных паправак лічбаў на карысць беларусаў, бо вынікі перапісу 1921 г. супярэчылі папярэднім перапісам (напрыклад у Расійскай імперыі), а таксама даследаванням асобных навукоўцаў, да таго ж дадзеныя перапісу былі супярэчлівымі. Ён прапаноўваў свой варты ўвагі аналіз вынікоў перапісу, які, па яго меркаванні, увогуле не ўлічваў беларусаў-каталікоў, якіх было каля 25 %. Акрамя таго, лічба палякаў павялічылася амаль на 20 %, бо з’явіліся палякі праваслаўнага веравызнання (каля 230 тыс.), ці амаль 20 % ад усіх палякаў у трох паўночна-ўсходніх ваяводствах. Неправўдападобна, паводле К. Сракоўскага, выглядала

нацыянальна-канфесійная структура перапісу, калі беларусаў налічвалася менш, чым праваслаўных, а палякаў больш, чым каталікоў. Розніца паміж праваслаўнымі і беларусамі складала каля 410 тыс., калі ад гэтай лічбы адняць 8,7 тыс. рускіх і 156 тыс. украінцаў, якія відавочна былі праваслаўнымі, то заставалася каля 244 тыс. праваслаўных, якія не былі залічаны да беларусаў, рускіх ці ўкраінцаў. Адначасова лічба палякаў на 193 тыс. была больш лічбы каталікоў. З улікам таго, што літоўцы з'яўляюцца каталікамі, сярод каталікоў налічвалася каля 952 тыс. палякаў. З улікам таго, што перапіс падаваў колькасць польскага насельніцтва ў 1 229 тыс., то каля 277 тыс. палякаў былі некаталіцкага веравызнання. Перад К. Сракоўскім стаяла пытанне аб тым, хто маглі быць па веравызнанні гэтыя 277 тыс. палякаў. 47 тыс. іўдзеяў падалі нацыянальнасць не яўрэйскую, рэшта аднак прыпадала на праваслаўных, але перапіс не ўлічваў увогуле групу беларусаў-каталікоў, у той жа час узнікала польскае праваслаўнае насельніцтва, што давала падставу даследчыку сцвярджаць аб заніжэнні колькасці беларусаў [11, s. 5–6].

Пытанні нацыянальна-канфесійнай структуры насельніцтва Польшчы выклікалі значны міжнародны рэзананс і падштурхоўвалі ўладу да пошуку шляхоў вырашэння нацыянальнага пытання. Так, А. Крысінскі падкрэсліваў выключную палітычную і міжнародную значнасць перапісаў, абгрунтоўваючы гэта тым, што некаторыя краіны, напрыклад, Германія, спрабавалі прадставіць Польшчу як штучную краіну, кангламерат народаў і моў, якія выпадкова апынуліся ў адной дзяржаве [12, s. 3]. Пытанне нацыянальнай структуры насельніцтва пачынала гучаць у кантэксце бяспекі польскай дзяржавы. Гэта ў сваю чаргу абумоўлівала накіраванасць даследаванняў вучоных, звязаных з уладамі, і акцэнты гэтых даследаванняў у асноўным былі засяроджаны на польскім элеменце, а менавіта абгрунтаванні яго пашырэння і дамінацыі.

Улады і навукоўцы шукалі метады і арганізацыйныя сродкі для новага падыходу да вызначэння нацыянальнай структуры насельніцтва. У 1930 г. у фінансаваным уладамі Інстытуце даследаванняў нацыянальных спраў адбылося прысвечанае статыстычным метадам даследавання нацыянальных адносін у перапісах насельніцтва выступленне Генеральнага камісара па перапісу доктара Р. Булаўскага. Ён адзначыў, што ва ўмовах польскай дзяржавы нельга зыходзіць з этнічнага паходжання як надзейнага крытэрыя нацыянальнасці, а пры даследаваннях неабходна абапірацца на моўны крытэрый [13, s. 190].

У наступным 1931 г. адбыўся так званы Другі агульны перапіс насельніцтва. Як і было прапанавана, улады вырашылі абмінуць вострае пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці, у выніку яно было выкрэслена са спіса пытанняў. Нацыянальнасць прапаноўвалася высвятляць згодна з паведамленнем пра родную мову і веравызнанне. Паводле вынікаў перапісу ў Беластоцкім ваяводстве моўна-канфесійная структура выглядала наступным

чынам: 1 182 259 падалі польскую мову (з іх 1 093 327 – рыма-каталікі, 75 899 – праваслаўныя, 5,8 тыс. – лютаране і інш.), 205 590 – беларускую мову (197 977 – праваслаўныя, 6,4 тыс. – рыма-каталікі і інш.), 172 164 – ідыш (172 130 – іўдзеі), 22 771 – іўрыт (22 771 – іўдзеі), 35 148 – рускую мову (27 902 – праваслаўныя, 6,7 тыс. – іншыя хрысціянскія канфесіі), 13 085 – літоўскую (13 062 – рыма-каталікі) і інш. [14, s. 16]. Віленскае ваяводства, без г. Вільня, налічвала 633 095 падаўшых польскую мову (599 268 – рыма-каталікі, 65 780 – праваслаўныя і інш.), 287 938 – беларускую мову ( 45 695 – рыма-каталікі, 239 351 – праваслаўныя і інш.), 47 656 – ідыш (47 655 іўдзеі), 6 576 – іўрыт (6 576 іўдзеі), 65 259 – літоўскую мову (65 217 – рыма-каталікі) і інш. [15, s. 10]. Вільня налічвала 128 628 жыхароў, падаўшых польскую мову як родную: 123 571 – рыма-каталікі, 2 863 – праваслаўныя, 47 523 – ідыш (47 509 – іўдзеі), 7 073 – іўрыт (7 073 – іўдзеі), 7 372 – рускую мову (5 267 – праваслаўныя, 1 816 – іншыя хрысціянскія канфесіі), 1 737 – беларускую мову (1 076 – праваслаўныя, 599 – рыма-каталікі), 1 579 – літоўскую мову (1 557 – рыма-каталікі) і інш. [16, с. 11]. Навагрудскае ваяводства: 553 859 падалі польскую мову (397 365 – рыма-каталікі, 147 236 – праваслаўныя, 5 695 – іўдзеі і інш.), 413 466 – беларускую мову (386 801 – праваслаўныя, 23 895 – рыма-каталікі, 1 134 – грэка-каталікі і ўсходні абрад), 69 782 – ідыш (69 781 – іўдзеі), 7 243 – іўрыт (7 243 іўдзеі), 6 794 – рускую мову (6 489 – праваслаўныя і інш.), 2 499 – літоўскую мову (2 486 – рыма-каталікі) [17, s. 19]. Моўна-канфесійная структура Палескага ваяводства была прадстаўлена наступным чынам: 707 088 – «тутэйшыя» (696 397 – праваслаўныя, 1 477 – рыма-каталікі і інш.), 164 106 падалі «польскую мову» (122 784 – рыма-каталікі, 36 052 – праваслаўныя), 96 514 – ідыш (96 493 – іўдзеі), 16 452 – іўрыт (16 452 – іўдзеі), 75 338 – беларускую мову (74 023 – праваслаўныя), 54 047 – украінскую мову (52 807 – праваслаўныя), 16 196 – рускую мову (15 887 – праваслаўныя) і інш. [18, с. 20].

Польскія навукоўцы, звязаныя з Інстытутам даследаванняў нацыянальных спраў, не бачылі ў выніках перапісу ніякіх недахопаў. А. Крысінскі, аналізуючы перапіс 1931 г., пісаў аб натуральнай тэрытарыяльнай экспансіі палякаў на ўсход, што з’яўлялася галоўным накірункам развіцця польскай палітыкі [12, s. 22].

Ужо пасля ажыццяўлення перапісу Генеральны камісар па перапісу Р. Булаўскі сцвярджаў, што моўны крытэрый абраны па прычыне адсталасці насельніцтва ва ўсходніх ваяводствах, якое не мела выражанай нацыянальнай самасвядомасці. Таксама пад час перапісу нібыта імкнуліся пазбегнуць атаясамлення нацыянальнай і дзяржаўнай прыналежнасці ці грамадзянства. Як сцвярджаў Р. Булаўскі, шмат у якіх месцах беларусы і ўкраінцы ідэнтыфікавалі сябе з Польшчай, бо з радасцю ўспрынялі факт знаходжання ў межах Польшчы, якая стала для іх сінонімам свабоды і дэмакратыі [18, s. 206–207]. Але ў той жа час польскі галоўны перапісчык прызнаваў, што не ўлічвалася сітуацыя двухмоўя, пытанні ўзнікалі адносна вызначэння «рускай»

мовы, а таксама ў яўрэйскім асяроддзі адносна выбару «ідыш» і «іўрыт». Тым не менш сцвярджалася, што польскія ўлады немагчыма падазраваць у маніпуляцыях пры правядзенні перапісу [19, s. 208–224].

Адваротную пазіцыю займаў Э. Штурм дэ Штрэм, які ў 1929–1939 гг. узначальваў Галоўную статыстычную ўправу Польшчы. Ён сцвярджаў, што перапісы 1921 і 1939 гг. былі сфальсіфікаваны, асабліва, што тычыцца нацыянальных адносін на ўсходзе Польшчы. Маштаб фальсіфікацый у 1931 г. значна пераўзыходзіў 1921 г. Памеры фальсіфікацый былі настолькі вялікія, што кіраўніцтва апрацоўкі вынікаў перапісу мела намер увогуле не апрацоўваць дадзеныя для ўсходніх ваяводстваў. Апрацоўка была зроблена толькі згодна з катэгарычным загадам улад, якія забаранілі публікацыю вынікаў спісу для дробных адміністрацыйных адзінак – гмін і пасёлкаў, бо гэта адразу выдавала ступень маніпуляцый. Э. Штурм дэ Штрэм прапаноўваў свой аналіз дадзеных перапісу і лічыў, што лічбу «тутэйшых», якіх прыдумалі ўлады для змяншэння колькасці беларусаў і ўкраінцаў, неабходна падзяліць паміж гэтымі народамі. Значна завышанай называлася і лічба палякаў ва ўсходніх ваяводствах [20, s. 230].

Такім чынам, сярод асноўных пытанняў, якія знаходзіліся ў цэнтры ўвагі навукоўцаў, былі праблемы колькасці польскага насельніцтва на ўсходніх землях Польшчы, суадносін палякаў і нацыянальных меншасцей, карэляцыі нацыянальнай, канфесійнай і моўнай ідэнтычнасці, умоў і недахопаў у ажыццяўленні перапісаў, магчымых маніпуляцый і фальсіфікацый вынікаў і інш.

Перапісы насельніцтва былі адным з інструментаў не столькі вывучэння, колькі хутчэй канструявання нацыянальнай структуры заходнебеларускага рэгіёна ў патрэбным польскім уладам кірунку для дэманстрацыі дамінацыі польскага элементу. Гэта думка стала галоўнай сярод польскіх даследчыкаў незалежна ад іх пазіцыі: афіліяванасці з уладнымі структурамі і апалагетыкі вынікаў ці, наадварот, крытыкі польскіх перапісаў. Праўладныя ці прапольска настроеныя аўтары, звяртаючыся да нацыянальнай праблематыкі, не бачылі недахопаў у перапісах. Крытыкуючы арганізацыйныя ўмовы, яны, тым не менш, лічылі, што на вызначэнне нацыянальнага падзелу насельніцтва ўлады не мелі ўплыву, а колькасны рост польскага элемента на ўсходніх землях называўся цалкам натуральнай з’явай. Пытанню нацыянальнай структуры Польшчы надавалася межнародная палітычная значнасць з перспектывы забеспячэння бяспекі польскай дзяржаўнасці. У той жа час былі прадстаўлены і крытычныя погляды на праблему, якія выкрывалі і дэманстравалі ступень маніпуляцый улад з вызначэннем колькасці беларусаў-каталікоў, або з’яўленнем праваслаўных палякаў ці катэгорыі «тутэйшых». Найбольш радыкальныя крытыкі сцвярджалі аб татальнай фальсіфікацыі вынікаў перапісаў, асабліва гэта датычыцца нацыянальных адносін ва ўсходніх ваяводствах Польшчы.

ЛІТАРАТУРА

1. *Romer, E.* Spis ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (grudzień 1919) / E. Romer. – Lwów ; Warszawa : Książinca Polska T-wa Naucz. Szkół Wyższych, 1920 – 50 s.
2. *Szturm de Sztrem, T.* Stosunki narodowościowe na terenie b. Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich / T. Szturm de Sztrem, W. Wakar. – Skala 1:1.000.000. – Warszawa, 1921.
3. *Osmołowski, J.* Wspomnienia z latach 1914–1921 / J. Osmołowski. – B-ka Nar. – Sygn. akc. 6798.
4. *Buławski, R.* Projekt drugiego polskiego spisu powszechnego na tle doświadczeń spisu z 1921 r. / R. Buławski // Kwart. Statyst. – 1930. – Z. 1. – S. 60.
5. *Grossman, H.* Znaczenie i zadania pierwszego powszechnego spisu ludności w Polsce / H. Grossman // Spisy ludności Rzeczypospolitej Polskiej 1921–2002. Wybór pism demografów / pod. red. Z. Strzeleckiego, T. Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 98–113.
6. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa : GUS, 1923. – T. V : Województwo Białostockie. – 158 s.
7. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa : GUS, 1925. – T. VII, Cz. II : Ziemia Wileńska. – 128 s.
8. Pierwszy powszechny spis Rzeczypospolitej Polskiej z dnia 30 września 1921 roku. Mieszkania. Ludność. Stosunki zawodowe. Województwo Nowogródzkie. – Warszawa : GUS, 1926. – 222 s.
9. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa : GUS, 1924. – T. VIII : Województwo Poleskie. – 95 s.
10. *Krzywicki, L.* Wartość wyników spisu powszechnego // Spisy ludności Rzeczypospolitej Polskiej 1921–2002. Wybór pism demografów / pod. red. Z. Strzeleckiego, T. Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 131–144.
11. *Srokowski, K.* Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Warszawa, 1924. – 56 s.
12. *Krysiński, A.* Ludność polska a mniejszości w Polsce w świetle spisów ludności 1921 i 1931 / A. Krysiński. – Warszawa : Druk. Nowaka, 1937. – 52 s.
13. *Buławski, R.* Metody statystyczne badania stosunków narodowośiowych / R. Buławski // Spisy ludności Rzeczypospolitej Polskiej 1921–2002. Wybór pism demografów / pod. red. Z. Strzeleckiego, T. Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 185–205.
14. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII.1931 r. : Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe : Województwo Białostockie / red. E. Szturm de Sztrem. – Warszawa : Główny Urząd Statyst., 1938. – 381 s.
15. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII.1931 r. : Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe : Województwo Wileńskie bez miasta Wilno / red. E. Szturm de Sztrem. – Warszawa : Główny Urząd Statyst., 1938. – 164 s.

16. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII.1931 r. : Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe : Miasto Wilno / red. E. Szturm de Sztrem. – Warszawa : Główny Urząd Statyst., 1937. – 103 s.
17. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII.1931 r. : Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe : Województwo Nowogródzkie / red. E. Szturm de Sztrem. – Warszawa : Główny Urząd Statyst., 1938. – 237 s.
18. Drugi powszechny spis ludności z dn. 9.XII.1931 r. : Mieszkania i gospodarstwa domowe. Ludność. Stosunki zawodowe : Województwo Poleskie / red. E. Szturm de Sztrem. – Warszawa : Główny Urząd Statyst., 1938. – 280 s.
19. *Buławski, R.* Kwestia narodowościowa w programie drugiego powszechnego spisu ludności Rzeczypospolitej Polskiej / R. Buławski // Spisy ludnośći Rzeczypospolitej Polskiej 1921–2002. Wybór pism demografów / pod. red. Z. Strzeleckiego, T. Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 206–224.
20. *Szturm de Sztrem, E.* Prawdziwa statystyka / E. Szturm de Sztrem // Spisy ludnośći Rzeczypospolitej Polskiej 1921–2002. Wybór pism demografów / pod. red. Z. Strzeleckiego, T. Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 229–231.

**Н. Б. Щавлинский**

## ТРАГИЧЕСКИЕ СТРАНИЦЫ НАРОЧСКОЙ НАСТУПАТЕЛЬНОЙ ОПЕРАЦИИ РУССКИХ ВОЙСК В МАРТЕ 1916 г.

В августе 1914 г. была развязана Первая мировая война. Ее возникновение обусловливалось обострением противоречий между блоками капиталистических государств – Тройственным союзом (Германией, Австро-Венгрией, Италией) и Антантой (Англией, Францией и Россией) за колонии, рынки сбыта товаров, источники сырья и сферы влияния.

Поводом к войне послужили револьверные выстрелы сербских националистов из группы «Молодая Босния» в Сараеве, которыми 28 июня 1914 г. был убит наследник австрийского престола, племянник императора Франца Иосифа, эрцгерцог Франц Фердинанд.

После продолжительных совещаний с германским союзником, заручившись обещанием полной поддержки, австро-венгерское правительство предъявило 23 июля Сербии ультиматум. Были выдвинуты совершенно неприемлемые для независимого государства требования: прекращение всякой великосербской пропаганды; участие австрийских чиновников в расследовании на сербской территории всех нитей сараевского преступления; наказания офицеров, чиновников и учителей, виновных в антиавстрийской агитации по спискам, которые представит австро-венгерское правительство [6, с. 565].

В ответ на ультиматум сербы во главе с принцем-регентом Александром и премьер-министром Никола Пашичем обратились к русскому царю Николаю II с просьбой о помощи и защите. Русское правительство, учитывая неподготовленность России к войне, советовало сербам проявить

максимум уступчивости и одновременно обратилось к правительствам немецких держав с просьбой проявить умеренность и не настаивать на выполнении всех изложенных в меморандуме требований. Сербское правительство в ответ на австрийский ультиматум согласилось принять все требования, за исключением одного – допущения австрийских властей на сербскую территорию [6, с. 566].

Однако ответ сербов, означавший по существу капитуляцию, не удовлетворял австрийцев, и 26 июля 1914 г. Австро-Венгрия разорвала отношения с Сербией, а через два дня объявила ей войну. 31 июля Россия заявила о поддержке Сербии и начала всеобщую мобилизацию. В тот же день Германия в ультимативной форме потребовала от русского правительства прекращения военной мобилизации, но не получив удовлетворительного ответа, объявила 1 августа 1914 г. войну России, тем самым положила начало кровопролитному сражению, в котором участвовало 38 государств с полуторамиллиардным населением [7, с. 17].

В первые дни военые действия развивались более-менее успешно для России. Но уже в ноябре 1914 г. немецко-австрийские войска перешли в наступление и стремительно продвигались к границам Российской империи. К 1915 г. Россия на западе потеряла огромную территорию, оставив на полях сражений в Польше, Восточной Галиции и Западной Беларуси множество убитых, раненных, пленных и потеряв множество военного имущества. Тем не менее фронт русских продолжал существовать. На Волге и в Сибири готовились новые пополнения; в Россию поступали новые партии оружия и военного снаряжения.

На западе борьба Германии с Францией истощала силы обеих сторон, но о решительном успехе германского оружия на французском фронте говорить не приходилось. Более того, составная часть этого фронта – английская армия – не только была разбита немцами, но в полном объеме, после проведения в Англии закона о всеобщей воинской повинности, еще не была развернута.

В сложившихся условиях, учтя опыт военных компаний 1914–1915 гг., командование союзников пришло к выводу о необходимости согласования действий своих армий. В целях выработки единого плана боевых операций против противника, в декабре 1915 г. в Шантильи, в ставке французского главного командованя, была созвана конференция. В ней участвовали: от Англии – фельдмаршал Френч, генерал-лейтенант Мэррей, начальник генерального штаба Робертсон и генерал-лейтенант Вильсон; от России – генералы Жилинский и Игнатьев; начальник итальянского генерального штаба генерал Порро и полковник Альбриччи; начальник бельгийского генерального штаба генерал Вилеманс; сербский военный атташе во Франции полковник Стефанович; от Франции – генерал Жоффр, начальник генерального штаба генерал Пелле, глава французской военной миссии при британской главной квартире генерал Хюге, подполковник Бильот и капитан Дюмейру [5, с. 244].

В ходе работы конференции были приняты следующие решения.

1. Война может быть выиграна лишь в том случае, если успехи будут достигнуты на главных театрах действий (русском, англо-французском и итальянском).

2. Достижение успехов на этих главных театрах военных действий возможно только в согласованном наступлении;

3 Любое из союзных государств должно быть готово собственными силами остановить на фронте наступление противника и в случае необходимости оказать в пределах возможного помощь другой стране [4, с. 6–7].

Вместе с тем совместные действия союзных сил в виде общего наступления намечалось провести весной 1916 г., когда климатические условия позволили бы осуществлять наступление русской армии на Восточном фронте.

Как видно из решений конференции, союзники не ставили определенных задач для достижения целей и выразили только ясно решение о взаимной поддержке друг друга в общей борьбе против врага. Следовательно, решения, принятые союзниками на конференции в Шантильи, не ставили перед русским командованием задач, для выполнения которых необходимо было бы определенным образом сосредоточить войска и координировать их действия. В самой постановке вопроса «помогать друг другу и наступать после того, как климатические условия позволят это сделать в России» превалировали не наступательные, а оборонительные тенденции. В результате инициатива в соответствии с принятыми решениями на конференции передавалась в руки немецкого командования, которое не применуло ее воспользоваться.

Уже в конце 1915 г. французская разведка стала получать данные о готовящемся большом наступлении немцев в районе Вердена. В январе и начале февраля 1916 г. отмечалось большое оживление на железных дорогах вдоль Мааса, что свидетельствовало о сосредоточении больших немецких сил в этом районе.

В то же время такие же симптомы предполагаемых наступательных действий немецкой армии наблюдались и на востоке. Поэтому верховное командование французской армии в лице Жоффра и Петена склонялось к ошибочному мнению, что немцы ведут подготовку к наступлению против России.

К слову сказать, некоторые командующие из союзных армий не соглашались с подобной обстановкой вопроса, так как, по сравнению со своими верховными главнокомандующими, более объективно оценивали обстановку на фронтах. К числу таких командиров принадлежал главнокомандующий русским Западным фронтом генерал А. Эверт. Уже 26 января 1916 г он обратился к начальнику штаба верховного главнокомандующего русскими армиями генералу М. В. Алексееву с письмом, в котором указывал, что «германцы будут развивать наступление на Западном фронте» и в этой связи предлагал «не теряя времени,

подготовить наступление русских армий в зимний период времени, до начала весенней распутицы с тем, чтобы не позволить германцам разбить вначале союзников, а затем русскую армию» [4, с. 9].

Однако эти и другие сообщения главнокомандующего русским Западным фронтом не возымели действия. 21 февраля 1916 г. немецкие войска начали операцию против Вердена, а 25 февраля они уже успешно захватили форт Дуомон, тем самым создав критическое положение для французских военных сил. 3 марта 1916 г. представитель французского командования при русской ставке генерал По передал начальнику штаба верховного главнокомандующего генералу Алексееву от генерала Жоффра письмо с просьбой «чтобы русская армия безотлагательно приступила к подготовке к наступлению» [Там же, с. 8].

Наступление началось 5 (18) марта 1916 г. силами 5-й, 1-й, 2-й и 10-й русских армий в районе озера Нарочь. Основной удар наносила 2-я армия с целью прорыва фронта двумя группами: тремя корпусами на юг от железной дороги Поставы – Свентяны и тремя корпусами между озерами Нарочь и Вишневское. Части 5-й армии действовали в районе Двинска, 10-я армия вела бои в направлении Крево – Ошмяны [8].

Однако это наступление, слабо организованное и подготовленное, ведущееся в сложнейших метереологических условиях (в условиях весеннего бездорожья), с самого начала было обречено на провал.

Во-первых, за неимением времени во всех частностях отсутствовала тщательная, широко и всесторонне обдуманная подготовка среди личного состава. Старшие военноначальники и штабы в силу слабых знаний о сложившейся обстановке не способны были ставить перед войсками ответственные и эффективные задачи.

Во-вторых, выбор местности для непосредственного удара происходил не только без основательного изучения свойств неприятельской позиции, но о ней у большинства прибывших для атаки войск были самые смутные представления, так как нередко наступление велось на самые сильно укрепленные позиции противника, состоявшие из четырех полос эшелонированной обороны с расстоянием между полосами от 3 до 5 километров. Каждая полоса включала в себя не менее трех линий окопов и траншей в 150–300 шагах одна от другой. Все укрепленные полосы немецких позиций были защищены проволочным заграждением из 15–20 рядов. Тяжелые бетонные доты и блиндажи, «лисьи норы», гнезда для пулеметов связывала с тылом система многочисленных ходов сообщения. Окопы были размещены с таким расчетом, что подступы к позициям обстреливались перекрестным оружейным и пулеметным огнем восьми станковых и двенадцати ручных пулеметов каждого батальона [3, с. 28–29].

В-третьих, организация артиллерийского огня была поставлена из рук вон плохо. Нередко перед артиллеристами ставилась задача начальством штабов в отсутствие начальника артиллерийской группы, что отрицательно

сказывалось на выборе артиллерийских позиций (болотистая местность или лесистая местность и т.д.). Не были также согласованы действия пехоты и артиллерии.

Более того, русская армия постоянно испытывала нехватку боеприпасов. Еще в августе 1914 г. начальник штаба русской армии Н. Н. Янушкевич направил военному министру телеграмму № 652, в которой сообщал, что «Положение с обеспечением артиллерийским снаряжением критическое» [1, с. 215]. Подобные сведения содержались в телеграмме № 4141, направленной главнокомандующим русской армией великим князем Николаем Николаевичем императору: «Уже более двух недель ощущается нехватка артиллерийских боеприпасов… Я нахожу нужным просить Ваше Величество, чтобы отгрузка снарядов была ускорена» [Там же].

А вот как описывает тяжелое положение русских войск в Галиции в 1915 г. военный историк Н. Н. Головин: «Тяжелые испытания, перенесенные русской армией в летние месяцы 1915 г., не поддаются описанию. На ураганный огонь тяжелой вражеской артиллерии можно было ответить только винтовочным огнем или одиночными артиллерийскими выстрелами с большим интервалом. Было время, когда в отдельных полках устанавливался лимит – по 10 снарядов в день…» [6, с. 580–581].

Подобная же ситуация с тяжелой артиллерией наблюдалась во время проведения русскими войсками Нарочской операции. А. М. Зайончковский в своем труде «Первая мировая война» отмечал: «В отношении же тяжелой артиллерии громадное преимущество было на стороне германцев» [2, с. 510–511].

Эти и другие столь плачевного для русской армии характера причины заставили генерала Алексеева отдать 29 марта 1916 г. директиву о приостановлении Нарочской военной операции, итоги которой явились весьма неутешительными.

Всего за период с 18 марта по 1 апреля 1916 г. русские войска захватили около 1 200 человек пленных, десятка полтора пулеметов, несколько сот винтовок, несколько тысяч винтовочных патронов и… примерно 10 кв. км неприятельской территории.

В то же время потери русской армии были огромными: шесть корпусов (4 армейские и 2 сибирские) полностью или частично были уничтожены, общее количество погибших составило 78 тысяч, 445 человек. Из этого числа 12 000 были обмороженными или замерзшими. В момент прекращения мартовского наступления 5 000 трупов было снято с германских проволочных заграждений. Ввиду полной непригодности для боевых действий (болото, лес) без боя была отдана противнику территория размером в 60–70 кв. км [4, с. 150–151].

Однако итоги наступления русских войск проявились и в другом. Ценой собственных огромных потерь русские войска оказали помощь союзникам – французам, оттянувши на себя огромную часть войск противника: 22–28 марта наступление немцев на Верден ослабло, а затем прекратилось.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Головин, Н. Н.* Военные усилия России в мировой войне / Н. Н. Головин. – М. : Кучково Поле, 2001. – 440 с.
2. *Зайончковский, А. М.* Первая мировая война / А. М. Зайончковский. – СПб. : Полигон, 2000. – 880 с.
3. *Лигута, В.* Наша кровь у Сморгони / В. Лигута. – Минск : Хурсик, 2005. – 80 с.
4. *Подорожный, Н. Е.* Нарочская операция в марте 1916 г. на русском фронте мировой войны / Н. Е. Подорожный. – М. : Гос. воен. изд-во Наркомата обороны Союза ССР, 1938. – 180 с.
5. *Пуанкаре, Р.* На службе Франции 1915–1916 : Воспоминания. Мемуары / Р. Пуанкаре. – М. : АСТ ; Минск : Харвест, 2002. – 592 с.
6. *Пушкарев, С. Г.* Россия 1801–1917: Власть и общество / С. Г. Пушкарев. – М. : Посев, 2001. – 671 с.
7. *Смольянинов, М. М.* К вопросу изучения проблем истории Первой мировой войны / М. М. Смольянинов // Беларусь и Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7 крас. 2011 г. : у 2 т. – Мінск, 2012. – Т. 2. – С. 17–22.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – 592 с.

**Д. Киенко**

## ГРОДНЕНСКИЙ РЕГИОН БЕЛАРУСИ КАК ОБЪЕКТ ИССЛЕДОВАНИЯ «АВИААРХЕОЛОГИИ» (1941–1945): СТАТИСТИЧЕСКИЙ ОБЗОР

Территория современной Гродненской области Беларуси во все времена являлась театром военных действий между различными враждующими сторонами. Предметом публикации является исследование мест падений военных самолетов в период Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. в качестве источника информации об истории применения авиации на территории Беларуси.

Гродненский регион на сегодняшний момент является наиболее комплексно исследованной автором статьи территорией; на протяжении 15 лет он вел как полевые, так и документальные исследования в данном направлении, систематизируя полученные данные.

В основу анализа легли сведения, вытекающие из результатов исследований данных по местам падений и вынужденных посадок сбитых или поврежденных в боях самолетов, не вернувшихся из боевых вылетов. Информация собиралась методом опроса свидетелей из числа местных жителей, полевых поисков материальных доказательств, анализа публикаций в прессе и воспоминаний участников боев, архивных документов.

Особенностью «работы с авиацией» является тот факт, что в большинстве случаев поиск ведется не от «документов», а от места падения

самолета с установлением его типа, принадлежности к восстановлению имен членов экипажа. Далее следует кропотливая работа по выявлению их судьбы, обстоятельств гибели и возможного места захоронения, в случае если оно имело место быть. И только на последнем этапе, на основе имеющихся объективных данных, ведется работа с архивными документами.

В весьма редких случаях поиск ведется «от документов». Это вызвано тем, что по объективным причинам очень редко в документах бывают указаны точные места или районы падения самолетов. В большинстве случаев имеется запись «пропал без вести» или «не вернулся с боевого задания».

Иногда в документах встречаются такие сведения, как, например, в случаях гибели самолетов 36-й авиационной дивизии дальнего действия: «в ночь на 8 июля восточнее Лиды наблюдали горящий падающий самолет» [1, с. 85]. Факт падения не вызывает сомнения, однако место, исходя из документов, локализовать невозможно. В данном случае необходимо обращение к немецким заявкам на сбитые самолеты, т.к. в этом случае район атаки и возможного падения будет более конкретным.

Несмотря на то, что территория поисков ограничена административными границами современной Гродненской области, исторические события требуют рассматривать эту территорию именно как регион, т.к. административное деление помогает лишь локализовать место падения применительно к современным условиям.

Использование термина «регион» вызвано несколькими факторами. Прежде всего, оно позволяет проецировать сферу поиска на приграничные территории соседних областей и стран. Зачастую исторические события, приведшие к падению того или иного самолета, начинались в современных административных границах одной области, а затем переходили в другую. Имели место и более сложные ситуации, когда, например, самолет был атакован в воздушном пространстве Слонимского р-на Гродненской обл., упал на территории Барановичского р-на Брестской обл., а летчиков похоронили в ближайшей деревне, которая снова оказалась на территории Гродненской области.

Использование автором термина «регион» позволяет употреблять его и применительно к более мелким административным единицам: городам, поселкам, деревням и их окрестностям, т.к. в их административных границах имели место события, аналогичные вышеописанному случаю.

К настоящему времени автором собрана достоверная информация о местах падения более 150 самолетов на территории Гродненской, Брестской и Минской областей. При этом в пределах Гродненской области по периоду 1941–1944 гг. находится 41 объект, из которых 7 являются местами падения немецких и 34 – советских самолетов.

Наибольшая концентрация мест падения или вынужденной посадки логично вытекает из характера боевых действий авиации как в 1941, так и в 1944 году. Основное количество объектов сконцентрировано на западе региона в пределах Гродненского, Щучинского и Мостовского районов.

Особенностью объектов 1944 г. является то, что все они являются местами падений бомбардировщиков. В 90 % случаев это были Ил-4, сбитые противником при возвращении с заданий в районе своих аэродромов осенью 1944 года.

Необходимо отметить, что в 1944 г. бомбардировочной авиацией проводились массированные налеты на тыловые объекты войск противника, одним из которых был аэродром и ж.-д. узел г. Барановичи. Из общего количества потерь только незначительная часть сбитых самолетов в силу современного административного размежевания районов оказалась в пределах Гродненского региона. Для проведения поисковых работ безвозвратно потерянных советских самолетов Барановичский регион можно рассматривать как самостоятельный объект исследования.

Количество установленных военных самолетов из считавшихся безвозвратно потерянными на территории Гродненского региона: по состоянию на 01.01.2017 г.

| Год | ВВС РККА | | | | Люфтваффе | | |
